Павел Церашковіч

# ПОЛЬШЧА: КРАІНА І ЛЮДЗІ

## (Геаграфія Польшчы)

Мінск

2016

# УСТУП

Геаграфія – складаная, шматгранная дысцыпліна, якая аб'ядноўвае ў адзінае цэлае разнастайныя веды, спалучае прыродазнаўства, асновы дэмаграфіі, эканомікі, этналогіі, культуралогіі і рэгіёназнаўства. Геаграфія стварае цэласную карціну ўзаемадзеяння чалавека і прыроды ў гістарычнай перспектыве, дазваляе аналізаваць сучаснасць і будаваць планы на будучыню. Кожны народ жыве ў сваёй геаграфічнай прасторы на працягу доўгага часу, прыстасоўваецца да асяроддзя і прыстасоўвае яго дзеля сваіх патрэб, пераўтвараючы ў культурны ландшафт. У геаграфіі асобнай краіны і народа, як у летапісе, зафіксаваны досвед узаемадзеяння з прыродай, удалыя, і не вельмі, прыклады, якія могуць быць засвоены іншымі.

Польшча – адна з найбуйнейшых суседніх краін Беларусі. Разам з тым, спецыяльнай літаратуры па яе геаграфіі ў Беларусі няма. У вучэбных дапаможніках ёсць асобныя раздзелы, прысвечаныя Польшчы, але яны даюць толькі самую агульную характарыстыку краіны. Безумоўна, даступна вялікая колькасць выданняў на польскай мове. Аднак яны прызначаны дзеля ўнутранага карыстання. Некаторыя моманты, зразумелыя паляку і без падручніка, у іх адсутнічаюць. А замежніку, без іх ведання, цяжка не толькі стварыць цэласную карціну геаграфічнай прасторы Польшчы, але і адэкватна зразумець дэталі.

Польшча для Беларусі – не толькі ўплывовы сусед: гэта сусед, які дасягнуў значных поспехаў у сацыяльных трансфармацыях пасля распаду мінулага сацыялістычнага ладу. Пры гэтым, шмат па якіх прыродных ды іншых геаграфічных параметрах Польшча вельмі падобная да Беларусі. Таму вывучэнне яе геаграфіі мае глыбокі практычны сэнс, яно дазволіць выкарыстаць досвед Польшчы для пабудовы ўласнай стратэгіі сацыяльных трансфармацый у будучыні.

*Аўтар.*

# 1. УВОДЗІНЫ

## 1.1. Геаграфічнае становішча, велічыня тэрыторыі, межы і суседзі

*Памеры тэрыторыі. Польшча ў геаграфічным вымярэнні Еўропы і свету. Канфігурацыя тэрыторыі. Крайнія кропкі. Суседзі Польшчы. Межы. Асаблівасці мяжы на моры. Натуральныя і штучныя межы. Асаблівасці геаграфічнага становішча Польшчы.*

***Памеры тэрыторыі і яе канфігурацыя***

Рэспубліка Польшча – адна з найбуйнейшых еўрапейскіх краін. Яе тэрыторыя складае 322 575 км$^2$. Паводле плошчы сваёй тэрыторыі, Польшча займае 9-е месца ў Еўропе і 68-е ў свеце. Яна прыкладна ў паўтары разы большая за Беларусь.

Польшча мае кампактную прастору, знешне падобную на пяцівугольнік. Геаграфічна яна размешчаная ў цэнтральнай частцы Еўропы. Згодна з меркаваннямі польскіх географаў, цэнтр Еўропы знаходзіцца ў вёсцы Сухаволя каля Беластока. Аднак, у сувязі з тым, што межы Еўропы даволі ўмоўныя, не толькі Польшча, але і вялікая колькасць іншых краін, у тым ліку і наша, прэтэндуюць на тое, што цэнтр часткі свету размешчаны на яе тэрыторыі.

***Крайнія кропкі***

А вось дакладны геаграфічны цэнтр Польшчы ляжыць каля вёскі *Пёнтэк* недалёка ад Лодзі. Самая паўночная кропка Польшчы – *мыс Разеве* (54°50′ паўночнай шыраты) за 50 км ад Гдыні, самая паўднёвая – *пік Апалонек* (49°00′ паўночнай шыраты) у гарах Бяшчадах, каля мяжы з Украінай. На захадзе крайняя кропка – лукавіна ракі Одра (14°07′ усходняй даўгаты) каля вёскі *Асінуў Дольны* на мяжы з Германіяй, на ўсходзе – лукавіна ракі Буг (24°09′ усходняй даўгаты) каля вёскі *Зосін*, на мяжы з Украінай недалёка ад Замасці.




*Ускрайнія кропкі Польшчы.*

З поўначы на поўдзень тэрыторыя Польшчы працягваецца на 649 км, з захаду на ўсход – 689 км. Сонца ўзыходзіць на ўсходзе на 40 хвілін і 8 секунд раней, чым на захадзе.

***Межы. Асаблівасці мяжы на моры***

Польшча мяжуе з сямю краінамі. Усяго межы маюць працягласць 3511 км. Самая працяглая мяжа (796 км) – з Чэхіяй. Мяжа са Славакіяй – 541 км, Украінай – 535 км, Германіяй – 467 км, нашай краінай – 418 км, з Расіяй – 210 км. Самая кароткая мяжа (104 км) – з Літвой. Працягласць марскіх мяжаў складае 439 км, але даўжыня ўзбярэжжа (разам са Шчэцінскай і Віслянскай лагунамі) – каля 770 км. Марская прастора Польшчы складаецца з марскіх унутраных водаў (2005 км$^2$), да якіх адносіцца водная паверхня партоў, лагун і заток; тэрытарыяльных водаў (8682 км$^2$), адлегласць якіх ад берага вызначаецца ў колькасці 12 міляў, або 22 км; а таксама – з марской эканамічнай зоны (200 міляў, або 320 км ад берага). Пры-




*Межы Польшчы на моры.*

родныя рэсурсы марской эканамічнай зоны (прамысловыя рыбы, карысныя выкапні) з'яўляюцца ўласнасцю Польшчы, але судны і караблі замежных краін могуць свабодна праплываць праз яе.

У Польшчы межы падзяляюць на натуральныя і штучныя. Да натуральных адносяць такія, якія супадаюць з прыроднымі – берагамі мора і рэк, горнымі хрыбтамі і г. д. Натуральнымі лічаць межы з Германіяй, Беларуссю, Чэхіяй і Славакіяй, Украінай, штучнымі, вызначанымі ўмоўна – з Літвой і, часткова, з Расіяй.

***Асаблівасці геаграфічнага становішча Польшчы***

Эканоміка-геаграфічнае становішча Польшчы шмат у чым нагадвае беларускае: яна размешчаная ў цэнтры Еўропы на скрыжаванні транзітных шляхоў паміж заходняй і ўсходняй, паўночнай і паўднёвай яе часткамі. Разам з тым, геаграфічнае становішча Польшчы больш выгаднае, бо яна мае выхад да мора, што істотна спрыяе ўдзелу краіны ў міжнародным гандлі. Польшча, у параўнанні з Беларуссю, мае больш разнастайны ландшафт, большыя запасы карысных выкапняў, а таксама – рэсурсы для развіцця турызму. Але пра гэта гаворка пойдзе ў наступных раздзелах кнігі.

## Падсумаванне

- Польшча адносіцца да ліку найбуйнейшых краін Еўропы.
- Польшча мае кампактную, падобную на пяцівугольнік тэрыторыю.
- Польшча мяжуе з 7 краінамі. Працягласць мяжы – больш за 3,5 тыс. км.
- Марская прастора Польшчы складаецца з унутраных марскіх водаў, тэрытарыяльных водаў і марской эканамічнай зоны.
- Прастора Польшчы шмат у чым нагадвае Беларусь, але яна мае выхад да мора, больш разнастайнае прыроднае асяроддзе і карысныя выкапні.

## Заданні

- Назавіце краіны Еўропы, большыя сваёй плошчай за тэрыторыю Польшчы. Назавіце плошчы іх тэрыторый.
- З дапамогаю мапы падлічыце (прыблізна) адлегласць ад геаграфічнага цэнтра Польшчы да межаў найбуйнейшых еўрапейскіх краін, а таксама – ЗША, Японіі, Кітая.
- З дапамогаю інтэрнэту ці мабільнага тэлефона даведайцеся, да якога гадзіннага пояса адносіцца Польшча? Як адрозніваецца час у Польшчы і ў Беларусі?
- З дапамогаю мапы падлічыце адлегласць ад «польскага» геаграфічнага цэнтра Еўропы да «беларускага».
- Зрабіце параўнанне паняццяў «унутраныя марскія воды», «тэрытарыяльныя марскія воды» і «марская эканамічная зона». Чым яны адрозніваюцца?

## 1.2. Дзяржаўны лад і адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

*Дзяржаўныя сімвалы Польшчы: герб, сцяг, гімн. Сістэма дзяржаўнага кіравання. Функцыі прэзідэнцкай улады, Сейма і Сената, Канстытуцыйнага Трыбунала, Вярхоўнага Суда, Рады міністраў і яго старшыні. Адміністратыўны падзел: ваяводства, паветы і гміны. Функцыі мясцовага самакіравання.*

### *Дзяржаўныя сімвалы*

Польшча – суверэнная дзяржава. Сімваламі суверэннасці з’яўляюцца герб, сцяг і гімн.

Дзяржаўны польскі герб – гэта выява арла белага колеру на чырвоным полі. Арол выяўлены з залатымі дзюбай і кіпцюрамі, з залатой каронай на галаве, павернутай направа. Згодна з паданнем, легендарны прабацька палякаў Лех паляваў у ваколіцах Познані і ўвечары ўбачыў гняздо белага арла з трыма арлянятамі. Арол выпраставў крылы на фоне неба падчас захаду сонца. Леху спадабалася ўбачанае, і ён вырашыў зрабіць яго выявай герба і заснаваць



*Герб і сцяг Польшчы.*

горад у тым месцы з назвай Гнезна. Самыя старажытныя выявы герба, размешчаныя на манетах, адносяцца да часоў Баляслава I Харобрага, а ў часы кіравання Пржэмысла II (1295) ён становіцца сімвалам усёй польскай дзяржавы. За часы сваёй доўгай гісторыі польскі герб мяняўся, але заўсёды быў пазнавальны: гэта адзін з самых старажытных геральдычных сімвалаў Еўропы.

Польскі дзяржаўны сцяг складаецца з двух роўных памерамі гарызантальных палос: белай і чырвонай. Спалучэнне колераў сугучнае дзяржаўнаму гербу. У якасці нацыянальнага ён вядомы з 1831 года, а дзяржаўным сцягам стаў у 1919 годзе. Сёння існуюць два варыянты дзяржаўнага сцягу: з выявай герба на белым полі і без яе. У большасці выпадкаў Польшчу і дзяржаўныя ўстановы сімвалізуе бела-чырвоны сцяг. Афіцыйна сцяг з выявай герба можа быць выкарыстаны толькі амбасадамі і консульскімі службамі, на грамадзянскіх самалётах і марскіх судах, у аэра- і марскіх партах. Адмысловыя варыянты сцяга з гербам маюць узброеныя сілы.

Сучасны гімн Польшчы («Мазурка Дамброўскага») першапачаткова называўся «Песняй польскіх легіёнаў у Італіі». Аўтарам тэксту быў Юзаф Выбіцкі, а хто напісаў музыку – да гэтага часу невядома. Першае выкананне твора адбылося ў 1797 г. Гімн быў створаны для польскіх салдат і афіцэраў, якія ваявалі на баку Францыі і спадзяваліся адрадзіць незалежную Польшчу. Пазней ён стаў гімнам польскіх паўстанцаў 1831 і 1863 гг., а таксама – палітычнай эміграцыі. У якасці дзяржаўнага гімна «Мазурка Дамброўскага» была зацверджаная ў 1927 г.

### *Дзяржаўны лад*

Польшча – дэмакратычная краіна з развітымі палітычнымі інстытутамі. Яны складаюцца з органаў цэнтральнай улады і мясцовага самакіравання. Цэнтральная ўлада падзяляецца на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Заканадаўчая ўлада – гэта парламент, які складаецца з ніжняй (*Сейм*) і верхняй (*Сенат*) палатаў. У Сейме працуе 460, а ў Сенаце – 100 дэпутатаў. Каб стаць дэпутатам Сейма, трэба быць старэйшым за 21 гадоў, Сенату – старэйшым за 30. У парламенце распрацоўваюць і абмяркоўваюць законы. Абмеркаванне пачынаецца ў Сейме, потым закон разглядаюць у Сена-




*Структура дзяржаўнай улады.*

це, пасля чаго яго павінен зацвердзіць Прэзідэнт. *Прэзідэнта*, як і дэпутатаў, выбіраюць грамадзяне Польшчы. Партыі, якія набралі большаць месцаў на выбарах у парламент, ствараюць *Раду міністраў* (урад). Пры гэтым Прэзідэнт прызначае кіраўніка ўраду. Прэзідэнт і ўрад складаюць выканаўчую ўладу. Прэзідэнт з'яўляецца гарантам выканання канстытуцыі, прадстаўляе Польшчу ў міжнародных адносінах, стаіць на чале ўзброеных сіл.

Рада міністраў вызначае ўнутраную і знешнюю палітыку дзяржавы, складае праект бюджэту і забяспечвае яго выкананне пасля зацвярджэння Парламентам.

Вышэйшую судовую ўладу складаюць *Канстытуцыйны трыбунал* і *Вярхоўны Суд*. Іх кіраўнікоў прызначае Прэзідэнт, а суддзяў – Сейм. Мэта Канстытуцыйнага Трыбуналу – правяраць, ці адпавядаюць новыя законы Канстытуцыі краіны, ці адпаведная Канстытуцыі дзейнасць палітычных партый і г. д. Вярхоўны суд ажыццяўляе нагляд над дзейнасцю судоў у краіне, разглядае скаргі ў адносінах да выбараў, з'яўляецца найвышэйшай судовай інстанцыяй, якая выносіць канчатковае рашэнне ў складаных справах.

### *Адміністрацыйны падзел*

У 1998 г. у Польшчы была праведзена рэформа адміністрацыйнага падзелу. Была ўведзеная трохузроўневая сістэма: тэрыторыя падзяляецца на *ваяводствы*, *паветы* і *гміны*. Усяго ў Польшчы 16 ваяводстваў, 380 паветаў і 2479 гмінаў.

Ваяводствы істотна адрозніваюцца як сваёй плошчай, так і колькасцю жыхароў. Самае вялікае ваяводства – Мазавецкае: яго плошча складае больш за 10 % усёй тэрыторыі Польшчы – 35 558 км²; найменшае – Апольскае (9412 км²). Больш за ўсе жыхароў таксама мае Мазавецкае ваяводства – 5 316 тыс. чалавек, менш за ўсё – Любускае (1021 тыс. чал.).




*Адміністрацыйны падзел на ваяводствы.*

Паветы – адміністрацыйныя адзінкі, меншыя за ваяводства. Яны падзяляюцца на вясковыя (314) і гарадскія (66). У апошнім выпадку гэта гарады, якія маюць правы паветаў.

Гміны падзяляюцца на тры віды: гарадскія (306), сельска-гарадскія (602) і чыста сельскія (1571).

Кожная адміністратыўная адзінка мае органы самакіравання.

Кіраўнікоў і рады гмінаў выбіраюць прамым галасаваннем. На чале гарадской гміны стаіць *прэзідэнт*, змешанай – *бургамістр*, вясковай – *войт*. Гміны маюць уласныя бюджэты, якія складаюцца прыкладна з 40 % усіх падаходных падаткаў жыхароў і 7 % падаткаў кампаній і карпарацыяй, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі. Гміны адказваюць за развіццё мясцовых устаноў дашкольнай і сярэдняй адукацыі, аховы здароўя, камунальнай гаспадаркі (у тым ліку за ўтылізацыю камунальных адыходаў, стан мясцовых дарог), устаноў культуры.

Жыхары паветаў выбіраюць раду павету, а яе дэпутаты, у сваю чаргу, выбіраюць управу і старасту. У бюджэт павета трапляе каля 10 % падаходных падаткаў і 1,5 % падаткаў карпарацый. Гэтыя грошы выдаткоўваюць на ўтрыманне вялікіх шпіталяў, сацыяльную дапамогу, дарог, якія праходзяць па тэрыторыях некалькіх гмін.

Галоўным кіроўным органам ваяводстваў з'яўляюцца *сеймікі*, дэпутаты якіх выбіраюць выканаўчую раду і яе кіраўніка – *маршалка*. Бюджэт самакіравання ваяводства складаецца з 1,6 % падаходных падаткаў грамадзян і прыкладна 16 % падаткаў карпарацый. Бюджэты ваяводстваў могуць атрымліваць датацыі ад цэнтральных органаў улады. Ваяводскія бюджэты ідуць на ўтрыманне вышэйшых навучальных устаноў, буйных навуковых і медыцынскіх цэнтраў. Ваяводства – гэта адзіная адміністратыўная структура ў Польшчы, на ўзроўні якой ёсць прадстаўнікі цэнтральных органаў улады – ваяводы, якіх прызначае Рада міністраў. Ваявода прадстаўляе сваю адзінку ва ўрадзе, адказвае за выкананне распараджэнняў цэнтральных органаў улады. Аднак органы мясцовага самакіравання самастойныя ў сваёй дзейнасці. Звычайна органы самакіравання знаходзяцца ў галоўным паселішчы сваёй адміністратыўнай адзінкі. Выключэнне складаюць Куяўска-Паморскае і Любускае ваяводствы: цэнтральныя органы кіравання размешчаны ў Грозаве-

Велькапольскім і Быдгашчы, а сеймікі – у Зялёнай Гуры і Торуні, адпаведна.

Сістэма дзяржаўнага кіравання і самакіравання ў Польшчы адпавядае прынцыпам Еўрасаюза і забяспечвае ўдзел грамадзян у кіраванні дзяржавай.

## Падсумаванне

- Дзяржаўнымі сімваламі Польшчы з'яўляюцца герб з выявай арла белага колеру на чырвоным полі, бела-чырвоны сцяг і гімн «Мазурка Дамброўскага».
- Польшча --дэмакратычная краіна з развітымі палітычнымі інстытутамі.
- Органам заканадаўчай улады з'яўляецца Парламент, які складаецца з Сенату і Сейма.
- Органы выканаўчай улады складаюцца з Прэзідэнта і Рады міністраў.
- Судовая ўлада прадстаўленая Канстытуцыйным трыбуналам і Вярхоўным судом.
- Польшча мае трохузроўневую сістэму адміністрацыйнага падзелу. Тэрыторыя краіны складаецца з ваяводстваў, паветаў і гмінаў.
- Кожная адміністратыўная адзінка мае органы самакіравання з шырокімі паўнамоцтвамі.

## Заданні

- Чаму сімвалы польскай дзяржавы прынята адносіць да самых старажытных у Еўропе?
- У якіх выпадках выкарыстоўваецца бела-чырвоны сцяг з гербам?
- Калі «Мазурка Дамброўскага» была зацверджаная дзяржаўным гімнам Польшчы?
- Пералічыце цэнтральныя органы ўлады ў Польшчы. Якія функцыі яны выконваюць?
- Параўнайце паўнамоцтвы і магчымасці органаў мясцовага самакіравання ў Польшчы. Якія з іх, на Ваш погляд, мацнейшыя?

# 2. ПРЫРОДНЫЯ ЎМОВЫ І РЭСУРСЫ

## 2.1. Рэльеф

*Агульныя рысы рэльефу. Занальны падзел прасторы. Зона ўзбярэжжа. Паазер'е. Нізіны цэнтральнай Польшчы. Зона паўднёва-усходніх узвышшаў. Прыкарпацкія катлавіны. Зона гор: Карпаты і Судэты.*

***Агульныя рысы рэльефу***

Калі трэба даць агульную характарыстыку паверхні Польшчы, то найлепшым чынам яе передае слова «нізіна». Каля ¾ тэрыторыі размешчаная на вышынях да 200 м над узроўнем мора. Сярэдняя вышыня над узроўнем мора складае 173 м, у той час як у Еўропе –




*Геамарфалагічны падзел Польшчы.*

292 м, а ў свеце – 875 м. Разам з тым, перапад вышынь у Польшчы складае 2,5 км: самае нізкае месца – вёска Рачкі Эльблоньске, недалёка ад марскога ўзбярэжжа знаходзіцца на вышыні на 1,8 м ніжэй ад узроўню мора, самае высокае – пік Рысы ў Татрах (мае вышыню 2499 м).

Характэрнай рысай рэльефу Польшчы з'яўляецца заканамернасць паступовага павышэння над узроўнем мора з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. У сувязі з гэтым тэрыторыю Польшчы падзяляюць на 6 паясоў:

- Узбярэжжа;
- Паазер'е;
- Пояс нізін;
- Узвышша;
- Прыкарпацкія катлавіны;
- Пояс гор.

***Узбярэжжа***

Узбярэжжа працягнулася вузкім поясам уздоўж Балтыкі. Яно складаецца з некалькіх больш дробных частак: Шчэцінскага, Кашалінскага і Гданьскага ўзбярэжжаў, Старапрускай раўніны. У гэтым поясе пераважаюць раўнінныя формы рэльефу. Максімальная вышыня – 216 м над узроўнем мора (гара Замкова на ўзвышшах



*Узбярэжжа.*

Гуроўскіх). Характэрныя рысы рэльефу – самыя маладыя паводле геалагічнага ўзросту канцавыя марэны (Равакул), рухомыя выдмы на Лебскай касе, узбярэжныя азёры, якія ўтварыліся з марскіх заток (Лебска, Гарда, Ямна), дэльты Віслы і Одры, ледавіковая даліна Рэбы-Лебы, формы марской эрозіі – берагавыя скалы каля вёскі Ястржэмбя Гура.

***Паазер'е***

Пояс паазер'я мае значна большую плошчу. Вылучаюцца тры паазер'і: Паморскае, Мазурскае і Вялікапольскае. Рэльеф тут



больш узняты над узроўнем мора. Максімальная вышыня – 329 м (канцавая марэна Вяжыца). Характэрная рыса рэльефу – вялікая колькасць азёр марэннага і ледавіково-эразійнага паходжання. Апроч гэтага, распаўсюджана вялікая колькасць формаў ледавіковага рэльефу: озы, камы, донныя марэны, зандры (Тухольскі, Аўгустоўскі, Курпёўскі), ледавіковыя даліны (Торуньска-Эбервальдская).

***Пояс нізін***

Пояс сярэдняпольскіх нізін уключае ў сябе нізіны: Вялікапольскую, Шлёнскую, Мазавецкую, Падляшскую, а таксама Люблінскае Палессе. У далінах Віслы і Одры сярэднія вышыні складаюць 30–40 м над узроўнем мора. Максімальная вышыня – Кабыля Гура ў поясе Астржэшуўскіх узгор'яў (284 м). Пераважае плоскі раўнінны рэльеф з шырокімі марэннымі і ледаві-



ковымі далінамі. Былыя ўзвышшы канцавых марэн падвергліся моцнай дэнудацыі (Вал Тржэбніцкі). Спецыфічная рыса рэльефу – комплекс унутраных выдмаў (дзюнаў) у Варшаўскай катлавіне.

***Узвышшы***

Пояс узвышшаў знаходзіцца на вышыні ад 300 да 600 м над узроўнем мора. У яго склад уваходзяць Шлёнскае, Кракаўска-Чанстахоўскае, Кельцка-Сандамірскае і Люблінскае (з Расточам) узвышшы. Максімальная вышыня – гара Лысіца ў Свентакшыжскіх гарах (612 м). Рэльеф адрозніваецца разнастайнасцю. Тут сустракаюцца марэнныя даліны, лёсавыя цясніны (узвышша Расточа), карсты (Кракаўска-Чанстахоўскае ўзвышша, Свентакшыжскія горы).



***Прыкарпацкія катлавіны***

Пояс прыкарпацкіх катлавін мае сярэднія вышыні ад 140 да 300 м над узроўнем мора. Ён складаецца з Сандамірскай і Асвенцімскай катлавін, а таксама з міжгорных паніжэнняў – Мараўскай і Кракаўскай брамаў. Пояс утварыўся падчас альпійскага гораўтварэння, паверхня складаецца з горных парод, якія ўзніклі



*Падкарпацце.*

ў выніку разбурэння Карпат воднай і ветравой эрозіяй. Для рэльефу характэрныя нізіны, шырокія марэнныя даліны, плато, унутраныя выдмы.

***Горы***

Пояс гор складаецца з двух горных сістэм: старых гор Судэтаў і маладых – Татраў. Самыя высокія кропкі Судэтаў – горы Снежка (1602 м) і Снежнік (1425 м). Абедзве гары знаходзяцца ў горным ланцугу Кракаошы. Звычайна вылучаюць асобна ўласна



*Татры.*

Судэты і Судэцкія перадгор'і. У Татрах вылучаюць Высокія Татры (у сапраўднасці гэта самая ўзвышаная частка з пікам Рысы), Пяніны, з максімальнымі вышынямі 1050 м (гара Высока), Бяскіды (Баб'я Гура – 1732 м) і Бяшчады (гара Тарніца – 1324 м).

## Падсумаванне

- Для Польшчы характэрны раўнінны характар рэльефу.
- Перапад вышынь на тэрыторыі Польшчы складае больш за 2,5 км.
- Тэрыторыя Польшчы падзяляецца на 6 геаграфічных паясоў.

## Заданні

- З дапамагаю мапы вызначце, у якім поясе знаходзіцца:
  Варшава;
  Гданьск;

Ольштын;
Беласток;
Уроцлаў;
Валбжых;
Закапанэ;
Лодзь;
Познань;
Замасць.

- Параўнайце рэльеф Польшчы і Беларусі. Вызначце агульныя рысы і адрозненні.

## 2.2. Старажытная геалагічная гісторыя Польшчы

*Паверхня Польшчы ў дакембрыйскую эпоху. Геалагічныя працэсы ў палеазоі. Трансгрэсія і гораўтварэнне ў мезазоі.*

### ***Базавыя паняцці геалагічнай гісторыі***

Каб зразумець геалагічную гісторыю Польшчы, трэба вярнуцца да базавых ведаў па геалогіі нашай планеты. Яе геалагічная гісторыя падзяляецца на эры. Найлепш вывучаныя з іх – *палеазойская*, *мезазойская і кайназойская*. Кожная эра падзяляецца на перыяды. Бадай што самы вядомы з іх, дзякуючы таленту Стывена Спілберга, – юрскі. Самы старажытны перыяд – *кембрый*, у палеазойскай эры. Тое, што адбывалася раней за яго, падзяляюць на пратэразойскую, архейскую і катархейскую эры, якія часта разам пазначаюць агульнай назвай – *дакембрый*. Важную ролю ў геалагічнай гісторыі адыгрываюць эпохі *гораўтварэнняў* (*арагенезу)*. Самая старажытная з іх – архейская, самая маладая – альпійская. Апроч гэтага, моцны ўплыў рабіла тое, што, у залежнасці ад таго апускалася ці ўздымалася паверхня зямлі, на яе наступала (*марская трансгрэсія*), ці адступала (*марская рэгрэсія*) мора. Веданне геалагічнай гісторыі пэўнай мясцовасці ці краіны дазваляе меркаваць пра знаходжанне карысных выкапняў у глыбіні зямлі.

### ***Дакембрыйская эпоха***

У дакембрыйскую эпоху пачалося ўтварэнне *Усходнееўрапейскай платформы*, на якой сёння знаходзіцца тэрыторыя паўночна-




*Геалагічная будова Польшчы.*

ўсходняй Польшчы. Гэта вельмі старажытная геалагічная структура, якая ўтварылася 2,5–1,6 млрд. гадоў таму. Яе крышталічны фундамент накрыты моцным асадкавым чахлом, глыбіня якога вагаецца ад 0,5 км на Мазурска-Сувалкійскім выступе да 8–9 км у Люблінска-Львоўскай упадзіне. Паверхня Польшчы ў дакембрыйскую эпоху была залітая морам. Навукоўцы лічаць, што ў тыя часы зарадзіліся першыя формы арганічнага жыцця.

***Палеазой***

У палеазойскую эру (550–250 млн. гадоў таму) адбыліся істотныя змены. У гэты час стварылася другая старажытная платформа – *Заходнеўрапейская*, да якой адносіцца паўднёва-заходняя частка Польшчы. Апроч гэтага, узніклі самыя старажытныя ў краіне склад-

кавыя вобласці – Судэты і Свентакшыжскія горы. Іх фармаванне пачалося ў часы *каледонскага гораўтварэння* (500–400 млн. гадоў таму), а завяршылася – у часы *герцынскага* (400–230 млн. гадоў). Раўнінную прастору шмат разоў залівала мора, што садзейнічала з'яўленню моцных асадкавых пластоў.

У перыяд, які мае назву *карбон,* або *каменнавугальны* (359–299 млн. гадоў таму), клімат быў цёплы і вільготны, што садзейнічала развіццю моцнага расліннага покрыва, якое складалася са старажытнай дрэвападобнай папараці і першых хваёвых. У балотах і на плыткаводных узбярэжжах мора ў вялікай колькасці назапашваліся раслінныя парэшткі, якія не мелі доступу да кіслароду і з цягам часу пераўтварыліся ў каменны вугаль (адсюль і назва геалагічнага перыяду). Вялікія запасы каменнага вугалю, што паходзяць з тых часоў, знаходзяцца ў Верхняшлёнскім і Люблінскім басейнах, а таксама – у Судэтах.

Падчас апошняга перыяду палеазойскай эры – *пермскага* (299–250 млн. гадоў таму) – цэнтральная і паўночная частка Польшчы была залітая морам. Яно было не вельмі глыбокае, а клімат быў спякотны і сухі, што садзейнічала моцнаму выпарванню марской вады. Вынікам гэтага стала ўзнікненне вялікіх радовішчаў каменнай і калійнай соляў (басейны Куяўскі, Кладаўскі і Пуцкі). У гэты перыяд таксама склалася адно з найбольш багатых у свеце Любіньска-Глогуўскае радовішча медзі ў перадгор'ях Судэтаў.

### *Мезазой і кайназой*

У *мезазойскую эру* (252–66 млн. гадоў таму) амаль усю тэрыторыя Польшчы, за выключэннем гор, накрывала марская паверхня. Гэта спрыяла ўтварэнню радовішчаў металічных рудаў: жалезных – на Кракаўска-Чанстахоўскім узвышшы і каля Ленчыцы, а таксама свінцова-цынкавых – на Сілезскім (Шлёнскім) узвышшы. Канец мезазою супадае з *альпійскім арагенезам* (65 млн. гадоў таму), вынікам якога стаў пачатак фармавання карпацкай складкавай вобласці.

Працэс паўстання Карпат працягнуўся і ў *кайназойскую эру*. Ён паўплываў і на старыя горы – адбылося «амаладжэнне» Судэтаў і Свентакшыжскіх гор, узровень якіх павысіўся. У другой пало-

ве кайназою сфарміравалася паверхня сушы сучаснай Польшчы. Мора адступіла з большай яе часткі, а тое, якое было на паўднёвым усходзе, на месцы сучаснай Перадкарпацкай катлавіны, – паступова высахла. У выніку гэтага ўтварыліся вялікія радовішчы каменнай солі (у тым ліку і ў Вялічцы) ды гіпсу. А ў цэнтральнай частцы ўзніклі адны з найбуйнейшых у свеце радовішчаў бурага вугалю (басейны Конінскі, Бэлхатаўскі, Вялікапольскі і Заходні), эксплуатацыя якіх сёння складае падмурак энергетыкі краіны. Паходжанне бурага вугалю падобнае на паходжанне каменнага, але з той прычыны, што ўзрост яго меншы, меншай з'яўляецца і яго энергетычная каштоўнасць.

Асаблівую ролю ва ўтварэнні сучаснага рэльефу Польшчы адыгралі геалагічныя падзеі найноўшага перыяду кайназою – чацвярцічнага. Гаворка аб гэтым пойдзе ў наступным раздзеле.

## Падсумаванне

- Утварэнне Усходнееўрапейскай платформы пачалося ў Дакембрыі.
- У Палеазойскую эпоху на тэрыторыі Польшчы ўтварыліся старажытныя складкавыя вобласці (Судэты, Свентакшыжскія горы), а таксама радовішчы каменнага вугалю, калійнай і каменнай соляў.
- У Мезазоі адбылося ўтварэнне Карпат, радовішчаў бурага вугалю, жалезных і свінцова-цынкавых руд і каменнай солі.

## *Заданні*

- Пералічыце эпохі арагенезу ў Польшчы. Якімі былі іх вынікі?
- Якая геалагічная структура з'яўляецца самай старажытнай у Польшчы? Пазначце на мапе яе лакалізацыю.
- Якія чыннікі прывялі да ўтварэння радовішчаў каменнай солі?
- Чым падобныя і чым адрозніваюцца каменны і буры вугаль? Калі ўзніклі іх радовішчы ў Польшчы?

## 2.3. Эпоха зледзянення ў Польшчы і яе вынікі.

*Плейстацэн і галацэн. Зледзяненні. Ледавіковыя формы рэльефу: марэны, ледавіковыя азёры, озы, камы, зандры, лёсы, унутраныя выдмы, каравыя азёры, трогі.*

***Плейстацэн і галацэн***

Геалагічны перыяд у які мы з вамі жывём сёння завецца *чацвярцічны*. Назва чацвярцічны – умоўная. Яна азначае, што гаворка ідзе пра найноўшыя горныя пароды, якія не адносяцца да палеазою, мезазою і кайназою (адпаведна, першасныя, другасныя, троесныя). Гэты перыяд пачаўся больш за 2,5 млн. гадоў таму. Падчас яго ўтварылася большасць сучасных формаў рэльефу. А яшчэ – гэта перыяд фарміравання чалавека, таму ён таксама мае назву *антрапаген*. Чацвярцічны перыяд падзяляюць на дзве эпохі: сучасную (*галацэн*), якая пачалася прыкладна 12 тыс. гадоў таму, і *плейстацэн*, або эпоху зледзяненняў.

***Зледзяненні***

Падчас плейстацэну тэрыторыю Польшчы, таксама як і Беларусі, неаднаразова накрываў ледавік. Зледзяненняў было шмат (да 9-ці), але найбольшае значэнне мелі тры з іх:

- паўднёвапольскае (Санскае)
- сярэдняпольскае (Одрскае)
- паўночнапольскае (Віслянскае).

*Паўднёвапольскае* (*Санскае*) зледзяненне цягнулася ад 730 тыс. гадоў да 430 тыс. гадоў таму. Гэта было самае моцнае зледзяненне, калі ледавік накрыў амаль што ўсю прастору Польшчы ніжэй за 500 м



*Паўднёвапольскае (Санскае) зледзяненне.*

над узроўнем мора. Толькі вузкі пас Судэтаў і Карпат быў вольны ад ільду.

*Сярэдняпольскае* (*Одрскае*) зледзяненне (300 тыс. – 170 тыс. гадоў таму) таксама дайшло да Судэтаў, але не закранула ўзвышшаў на паўднёвым усходзе.



*Сярэдняпольскае (Одрскае) зледзяненне.*

*Паўночнапольскае* (*Віслянскае*) зледзяненне (115 тыс. – 11,7 тыс. гадоў таму) было найменш моцным – ледавік накрыў толькі тэрыторыю сучаснага польскага паазер’я.



*Паўночнапольскае (Віслянскае) зледзяненне.*

### *Ледавіковыя формы рэльефу*

Рух ледавіка з поўначы на поўдзень і наадварот аказаў надзвычай моцны ўплыў на паверхню. Гіганцкія масы льду выворвалі гліну, пясок, кавалкі скал, валуны і г. д. і цягнулі іх за сабою. Усё гэта перамешвалася і стварала геалагічныя адклады, якія называюць *марэннымі.*

Тое, што назапашвалася пад ледавіком і ўнутры яго пасля расставання льду, утварала асноўную, ці *донную,* марэну – вялізны і параўнальна роўны пласт марэнных адкладаў.

Там, дзе ледавік спыняўся, утваралася *канцавая марэна* – працяглае дугападобнае ўзвышша, складзенае са жвіру, пяску, вялізных камянёў. Найбольш вядомыя ўзвышша такога паходжання ў Польшчы – Вяжыца (329 м над узроўнем мора), Дылеўска Гура (312 м),

Шэске Взгужа (309 м). Калі ўзвышшаў было некалькі, паміж імі часта ўтвараліся азёры, якія завуць *марэннымі*. Да такога тыпу адносяцца самыя вялікія азёры ў Польшчы – Сьнярдвы (113 км$^2$) і Мамры (104 км$^2$). Марэнныя азёры маглі ўзнікаць і ва ўпадзінах доннай марэны. Там, дзе падчас раставання ледавіка цяклі моцныя плыні вады, з цягам часу з'явіліся *лагчынныя азёры* ледавікова-эразійнага паходжання. Яны звычайна маюць выцягнутую форму: працяглыя, глыбокія, са стромкімі берагамі. Прыклад такога возера – Медве (35 км$^2$) на паўночным захадзе Польшчы, якое мае даўжыню каля 39 км, шырыню – да 3,2 км, глыбіню – 43 м.

Ледавік абумовіў утварэнне і шэрагу іншых формаў рэльефу. Калі ў тоўшчы льду ўзнікалі тунэлі, адклады прымалі форму доўгіх валоў, шырынёй да некалькі соцень метраў і даўжынёй – да дзясяткаў кіламетраў. Яны завуцца *озы*. Самы вядомы оз у Польшчы – Букоўска-Масіньскі ў Вялікапольскім нацыянальным парку. Працягласць яго складае 37 км, вышыня – да 40 м, шырыня – ад 80 да 300 м.

Калі ледавік адступаў, ён пакідаў глыбы так званага «мёртвага льду», накрытыя моцным пластом марэнных адкладаў. Такі лёд раставаў доўга, і на яго месцы ўзнікалі пагоркі акруглай ці конусападобнай формы – *камы*. Звычайна яны маюць каля 10–15 м вышыні і да некалькіх соцень метраў у дыяметры.

На ўскрайку ледавікоў утвараліся *зандры* – шырокія, хвалепадобныя раўніны, створаныя адкладамі талых водаў. Зандры ў Польшчы захаваліся ў розных мясцінах, часта яны пакрыты хваёвымі барамі. Адзін з прыкладаў – Тухольская раўніна ў паўднёва-паморскім паазер'і, дзе зандр мае плошчу каля 2 тыс. км$^2$.

Калі ледавік раставаў інтэнсіўна, з яго выцякалі буйныя рачныя патокі, якія ўтваралі шырокія *ледавіковыя даліны* з плоскім дном. Шмат якія сучасныя рэкі ў Польшчы, у тым ліку Одра і Вісла, ствараліся такім шляхам. Найбольш вядомая ледавіковая даліна цягнецца ад ваколіц Варшавы да Берліна і мае шырыню да 20 км.

Спецыфічныя формы ледавіковага рэльефу ўтварыліся на польскіх гарах і ўзвышшах. У часы панавання ледавіка клімат быў сухі і халодны, што спрыяла ўтварэнню ветравой эрозіі. Вялікія ваганні тэмпературы сталі прычынай разбурэння скал

у Свентакшыжскіх гарах і Татрах і ўзнікнення схілаў, поўных валуноў (па-польску – gołoborza). Дробны пыл пераносіўся ветрам на поўдзень, што прывяло да ўтварэння *лёсаў* – аднастайных вапнавых адкладаў на вышынях ад 170 да 450 м над узроўнем мора. Лёсавыя плато сталі падмуркам фармавання надзвычай урадлівых чарназёмаў на ўзвышшах Расточа і Люблінскім. Падобным чынам, у выніку ветравой эрозіі ўзніклі і *ўнутраныя выдмы* (адрозныя ад узбярэжных). Часцей за ўсё іх можна ўбачыць у Сандамірскай і Варшаўскай катлавінах.

У часы плейстацэну снегавое покрыва ў гарах, прынамсі ў Татрах, пачыналася з узроўню 1300–1350 м. Тут узніклі такія спецыфічныя формы рэльефу, як *цыркавыя*, або *каравыя*, *азёры*. Кар – гэта сподападобная катлавіна, утвораная фірнам – шматгадовым пластом снегу, змешанага з камянямі і жвірам. Каравыя азёры маюць стромкія берагі і вялікую глыбіню – некалькі дзясяткаў метраў. Бадай што самае вядомае возера такога тыпу ў Польшчы – Марское Вока, недалёка ад Закапанэ. Уплыў ледавіка і эрозіі выявіўся яшчэ і ў тым, што для Татраў характэрныя востраканечныя пікі, высокія стромкія скалы, падобныя на будову даламітавых Альпаў. Схілы гор прарэзалі даліны. Звычайна яны маюць форму падобную на лацінскую літару «V», са стромкімі бакавінамі, вузкім дном і параўнальна невялічкай плынню вады. Калі ж даліна ў мінулым была жолабам ледавіка – дно яе плоскае і сваёй формай яна нагадвае лацінскую літару «U». Такія даліны яшчэ называюць *трогі* (ад нямецкага Trog – начоўкі).

## Падсумаванне

- Эпоха зледзяненняў зрабіла найбольшы ўплыў на фармаванне сучаснага рэльефу Польшчы.
- Непасрэдна пад уздзеяннем ледавіку ўтварыліся марэнныя ўзвышшы, азёры, ледавіковыя раўніны.
- Вынікам ветравой эрозіі стала з'яўленне лёсаў і ўнутраных выдмаў.
- У гарах пад уплывам ледавіку ўтварыліся цыркавыя азёры, V-падобныя і трогавыя даліны.

**Заданні**

- Зрабіце табліцу з назвамі і вызначэннямі ледавіковых формаў рэльефу.
- Якія формы рэльефу ёсць вынікам ветравой эрозіі ў часы плейстацэну? Чаму яны ўзніклі?
- Якім чынам зледзяненне паўплывала на ўтварэнне рэльефу Татраў?
- Пазначце на мапе прыклады розных тыпаў ледавіковых азёр у Польшчы.

## 2.4. Горныя пароды і карысныя выкапні

*Горныя пароды ў Польшчы: магматычныя, асадкавыя, метамарфічныя. Гаручыя карысныя выкапні. Каменны і буры вугаль, нафта і газ. Металічныя карысныя выкапні. Радовішчы руд жалеза, медзі, нікелю і цынку. Хімічныя карысныя выкапні. Радовішчы серы, каменнай і калійнай солі. Радовішчы сыравіны будаўнічых матэрыялаў: граніт, мармур, базальт, гліна, пясок, вапнякі, гіпс.*

***Горныя пароды***

Зямная кара складаецца з горных парод. Яшчэ іх завуць *мінеральнымі агрэгатамі*, бо яны складаюцца з розных мінералаў. У залежнасці ад віду спалучэння мінералаў, структура горнай пароды можа быць цвёрдай або рыхлай.

Звычайна горныя пароды падзяляюць на магматычныя, асадкавыя, метамарфічныя.

***Магматычныя горныя пароды***

Магматычныя горныя пароды ўтвараюцца ў працэсе застывання магмы пад зямлёю або на паверхні (*лава*). Гэты працэс прыводзіць да крышталізацыі рэчыва. Пераважную большасць магматычных парод складаюць сілікаты (да 75 % зямной кары). Магматычныя пароды адрозніваюцца надзвычайнай цвёрдасцю. Найбольш вядомыя прыклады магматычных парод, якія склаліся пад зямлёй – *граніты* і *габра*, з лавы – *базальты* і *пемза*.

***Асадкавыя пароды***

Асадкавыя пароды ёсць вынікам асаджэння рэчываў у вадзяным асяроддзі, паветры або пад уздзеяннем ледавіка.

Асаджэнне можа адбывацца механічным шляхам: пад уздзеяннем сілы цяжару, выветрывання і вымывання. Такім чынам ствараюцца абломкавыя адклады – *гліны* і *пяскі*. Яны складаюць большую частку асадкавых парод.

Другі шлях – хімічны, калі рэчывы ўзнікаюць з водных раствораў, якія выпарваліся з марской і азёрнай вады. У гэтым выпадку ўтвараюцца адклады каменнай і калійнай солі, гіпсу, серы.

Трэці – арганічны ці біягенны: калі горныя пароды складаюцца з парэшткаў расліннага і жывёльнага паходжання. Арганічныя асадкавыя пароды расліннага паходжання ўзнікаюць у выніку захавання раслінных парэшткаў у вадаёмах без доступу кіслароду. Такім чынам узнікае *торф*. Пад уздзеяннем перасоўвання пластоў зямлі і ціску зверху ён можа пераўтварыцца ў буры і, з цягам часу, у каменны *вугаль*. Больш складаны шлях мае ўтварэнне *нафты* і *газу*, адносна якога ёсць розныя думкі. Але большасць навукоўцаў лічыць, што гэтыя рэчывы маюць таксама арганічнае, біягеннае паходжанне. З парэшткаў марскіх арганізмаў складзены карбанатныя асадкавыя пароды – *мел* і *вапнякі*.

***Метамарфічныя горныя пароды***

Метамарфічныя горныя пароды могуць паходзіць як ад магматычных, так і ад асадкавых. Яны ўтвараюцца ў зямной кары пад уздзеяннем вялікага ціску, тэмпературы, газаў і водных раствораў. У выніку – адбываюцца істотныя змены іх структуры, фізічных і хімічных уласцівасцяў. Граніты, напрыклад, пераўтвараюцца ў *гнейсы*, вядомыя ў форме *кварцу* і *палявога шпату*; вапнякі – у *мармур*, *пясчанікі-кварцыты*.

На тэрыторыі Польшчы сустракаюцца горныя пароды ўсіх трох формаў. Татры збольшага складаюцца з гранітаў, у Судэтах, апроч гранітаў, ёсць базальты і габра. На астатняй прасторы прадстаўлены асадкавыя пароды: пяскі, жвіры, вапнякі. Метамарфічныя пароды – мармуры, гнейсы, кварцыты – у вялікай колькасці сустракаюцца ў Судэтах.




*Карысныя выкапні ў Польшчы.*

Горныя пароды, якія маюць істотнае значэнне для развіцця эканомікі, называюць мінеральнымі рэсурсамі ці карыснымі выкапнямі. Ян падзяляюцца на тры групы: *паліўныя*, *рудныя* і *нярудныя*.

### *Паліўныя карысныя выкапні*

*Паліўныя* карысныя выкапні прадстаўлены каменным і бурым вугалем, нафтай і газам. Каменны вугаль сканцэнтраваны ў трох басейнах: верхняшлёнскім, ніжняшлёнскім і люблінскім. У ніжняшлёнскім басейне магутнасць пластоў вугалю дасягае 1,5 км. Запасы каменнага вугалю складаюць каля 60 млрд. т.

Буры вугаль сустракаецца на ўсёй тэрыторыі Польшчы. Самая буйныя басейны ў цэнтральнай і заходняй частках краіны: Адамаў, Конін, Бэлхатаў, Тураў, Легніца. Запасы бурага вугалю складаюць каля 20 млрд. т. Радовішчы нафты размешчаныя ў Карпатах, на шэльфе Балтыйскага мора і ў Польскай нізіне. Найбуйнешае з іх – Любятуў. Штогод здабываецца менш за 1 млн. т нафты. Радовішчы газу сканцэнтраваныя каля Карпатаў. Запасы яго таксама не вельмі вялікія.

***Рудныя карысныя выкапні***

Рудныя карысныя выкапні прадстаўлены рудамі *жалеза* і *каляровых металаў*. Жалезныя руды сустракаюцца ў Польшчы ў раёне Чанстаховы і на Свентакшыжскіх гарах, але іх недастаткова: руда таксама імпартуецца з Украіны і Швецыі.

Польшча мае самае вялікае ў Еўропе радовішча *меднай руды* – у басейне Любіньска-Глагоўскім. Яна ўваходзіць у 10 краін свету, буйнейшых вытворцаў меднай руды. Паводле ацэнак спецыялістаў, запасы медных руд дазваляюць здабыць звыш 35 млн. т чыстай медзі. Аналагічныя пазіцыі Польшча займае паводле запасаў свінцовых і цынкавых руд. Яны знаходзяцца на Шлёнскім узвышшы ў раёне Олькуша. Значнымі з'яўляюцца і запасы срэбра, якія ацэньваюцца ў 100 тыс. т. Штогод у Польшчы здабываецца 1200 т срэбра. Гэта на сёння – сёмае месца ў свеце.

***Нярудныя карысныя выкапні***

*Нярудныя* карысныя выкапні прадстаўлены ў Польшчы разнастайнай сыравінай для будоўлі, шкляной і керамічнай вытворчасці. Гліны сустракаюцца на ўсёй тэрыторыі. У Падкарпацкім ваяводстве на радовішчы каля Рапчыц здабываюць высакаякасныя гліны для вытворчасці вогнеўпораў. Вапнякі, неабходныя для вырабу цэменту, знаходзяцца ў ваяводствах Свентакшыжскім (да 40 % здабычы), Малапольскім, Апольскім і Куяўска-Паморскім. Радовішча гіпсу таксама знаходзіцца ў Свентакшыжскім ваяводстве (Піньчуў). Шкляны пясок сустракаецца ў ваяводствах Падкарпацкім, Шлёнскім і Ніжне-Шлёнскім і Лодзінскім. Найлепшыя радовішчы кааліну – высакаякаснай гліны, неабходнай для вырабу парцаля-

ны – размешчаны ў Чмелюве, Валбжыху, Прушкаве. У перадгор'ях Судэтаў знаходзяцца радовішчы граніту, базальту і мармуру.

***Хімічныя карысныя выкапні***

Асобную групу нярудных карысных выкапняў складаюць *хімічныя* мінеральныя рэсурсы. Польшча мае вялікія запасы каменнай і калійнай солі ў цэнтры краіны (Магільна, Гура, Кладава, Вейхерова). Гістарычна эксплуатацыя радовішчаў каменнай солі пачалося на поўдні краіны (Вялічка, Бохня), але сённяшні дзень яны ўжо вычарпаныя. Шахта солі «Вялічка» пераўтвораная ў турыстычны аб'ект. Да ліку найбуйнейшых у свеце належаць радовішчы серы каля Тарнабжэга ў перадкарпацкім прагіне. Запасы яе складаюць каля 2,5 млн. т, а штогадовая здабыча – 0,5 млн. т.

## Падсумаванне

- Горныя пароды падзяляюцца на магматычныя, асадкавыя і метамарфічныя.
- Польшча мае вялікія запасы карысных выкапняў.
- Сярод паліўных карысных выкапняў найбольшае значэнне маюць каменны і буры вугалі.
- Сярод рудных карысных выкапняў асабліва вылучаюцца радовішчы медзі, свінца, цынку і срэбра.
- Хімічныя карысныя выкапні прадстаўленыя радовішчамі каменнай і калійнай соляў ды серы.
- Польшча мае вялікія запасы сыравіны для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

## Заданні

- Дайце ацэнку мінеральных рэсурсаў Польшчы. На што багатая гэта краіна і чаго ў ёй не хапае?
- Знайдзіце на мапе радовішчы паліўных карысных рэсурсаў. Дзе яны сканцэнтраваныя?
- Пазначце на мапе месцы пашырэння магматычных і метамарфічных, а з другога боку – асадкавых горных парод.
- Пазначце на мапе радовішчы рудных карысных выкапняў. Апішыце месца Польшчы ў свеце паводле іх запасаў.

## 2.5. Клімат

*Агульная характарыстыка клімату. Атмасферная цыркуляцыя. Тыпы паветраных мас: атлантычнае паветра ўмераных шырот, умераныя кантынентальныя паветраныя масы, трапічныя паветраныя масы, арктычныя паветраныя масы. Цеплавы рэжым. Гадавая амплітуда тэмператур. Ападкі. Узровень вільготнасці, гадавы ход ападкаў, рэгіянальныя адрозненні рэжыму ападкаў. Ружа вятроў. Заходні перанос. Лакальныя вятры на ўзбярэжжы і горнай мясцовасці. Феналагічныя пары году. Вегетацыйны перыяд.*

***Агульная характарыстыка клімату***

Кліматычныя ўмовы з'яўляюцца важным чыннікам існавання людзей і развіцця гаспадаркі. Пад кліматам разумеюць сукупнасць устойлівых характарыстык надвор'я: тэмпературы паветра, вільготнасці, колькасці ападкаў, атмасфернага ціску, напрамку вятроў і г. д.

Клімат Польшчы звычайна характарызуюць як пераходны, цёплы, умерана-кантынентальны. Тыповай з'яўляецца няўстойлівасць надвор'я, чаргаванне сонечных і пахмурных, з ападкамі, дзён.

Найбольшы ўплыў на характар надвор'я мае наступнае:

- размяшчэнне краіны ў непасрэднай блізкасці да Балтыйскага мора і Атлантычнага акіяна;
- агульны нізінны характар рэльефу, які спрыяе глыбокаму пранікненню паветраных мас з захаду, усходу і поўначы;
- размяшчэнне Польшчы ў сярэдняй частцы Еўропы, якая з'яўляецца кліматычным памежжам вільготных заходніх і сухіх усходніх паветраных мас.

***Атмасферная цыркуляцыя***

Найбольшы ўплыў на фарміраванне клімату Польшчы мае марская ўмераная паветраная маса (палярная), якая надыходзіць з паўночнай Атлантыкі дзякуючы з'яве заходняга пераносу (перавагі вятроў заходняга кірунку). Гэтая паветраная маса прыносіць летам халаднаватае надвор'е з інтэнсіўнымі ападкамі, зімой – адлігу і таксама ападкі. Умерана-кантынентальныя паветраныя масы




*Цыркуляцыя паветраных мас.*

з Усходняй Еўропы і Азіі прыносяць сухое надвор'е: летам – з моцнай спёкай, зімой – сонечнае і марознае. У пачатку восені зрэдку на тэрыторыю Польшчы трапляюць кантынентальныя трапічныя масы з Афрыкі і Заходняй Азіі, якія прыносяць цёплае сухое сонечнае надвор'е, якое ў Польшчы завуць «залатая восень». Летам і зімою, таксама зрэдку, наплываюць марскія трапічныя масы з Міжземнамор'я і Азорскіх выспаў. Яны нясуць з сабою цяпло і вільгаць, выклікаюць узмацненне ападкаў, навальніцы, адлігі і туманы зімой. Самы рэдкі госць у польскім надвор'і – арктычныя паветраныя масы. Зімой яны выклікаюць сонечнае, з моцнымі маразамі надвор'е, вясной – замаразкі.

***Цеплавы рэжым***

Сярэднегадавая тэмпература ў Польшчы складае +7,5°C. Сярэднія тэмпературы вельмі моцна адрозніваюцца ў розных рэгіёнах. Самымі цёплымі з'яўляюцца Шлёнская нізіна (+8,5°C) і Сандамірская катлавіна (+8°C). Самыя нізкія сярэднія тэмпературы зафіксаваныя ў Татрах – на гары Каспровы Верх (+0,8°C), а таксама – на паўночным усходзе Польшчы, Сувалках (+6,5°C), якія часта называюць «польскім палярным колам» ці «польскай Сібір'ю».




*Тэмпературны рэжым.*

Існуе і адрозненне ў сярэднегадавой амплітудзе тэмператур: найменшай (19°C) яна будзе на захадзе, дзе марскія паветраныя масы згладжваюць тэмпературныя адхіленні, а найбольшай – на ўсходзе (22°C), дзе мацней адчуваецца ўплыў кантынентальнага клімату. Абсалютны тэмпературны максімум (+40,2°C) зафіксаваны каля Аполе, мінімум (-41°C) – каля Седльцаў.

### *Ападкі*

Сярэдняя колькасць ападкаў у Польшчы складае каля 600 мм на год. Найбольш ападкаў выпадае ў гарах, дзе іх колькасць складае 800 мм у Судэтах і 1800 – у Татрах. Найменшая колькасць ападкаў выпадае на прасторах нізін сярэдняй Польшчы – да 500 мм на год. Гэта звязана з эфектам *дажджавога ценю*. Хмары, якія рухаюцца з паўночнага захаду аддаюць значную колькасць вільгаці ўзвышшам Паазер’я. Пераважная большасць ападкаў выпадае ў летні перыяд, а найменш зімой. У сярэднім колькасць дзён са снегападамі складае 30, у гарах – 100. Снежнае покрыва захоўваецца ад 40 да 60 дзён у годзе, у гарах – да 200. Для Польшчы характэрна пераважна сонечнае надвор’е: колькасць пахмурных дзён вагаецца ад 120 (на сярэднепольскіх нізінах) да 160 (у гарах).

Найбольшая колькасць пахмурных дзён – у Судэтах (190), таму найвышэйшую кропку – гару Снежку – цяжка ўбачыць пры добрым надвор'і.



*Ападкі ў Польшчы.*

***Ружа вятроў***

У ружы вятроў Польшчы пераважаюць вятры заходніх напрамкаў – заходнія, паўночна-заходнія і паўднёва-заходнія. Яны дзьмуць на працягу 60 % часу. Сярэдняя хуткасць ветру складае каля 5 м/с. Моц заходніх вятроў зніжаецца з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. На ўзбярэжжы моц вятроў значна большая. Тут нярэдка бываюць моцныя буры. Апроч гэтага, на ўзбярэжжы існуе лакальны вецер – *брыз*. Ён можа быць дзённым і начным. У сувязі з ваганнем ціску на працягу сутак над узбярэжжам, днём вецер дзьме з мора на сушу, а ноччу – наадварот, з сушы на мора. Лакальныя, так званыя *хальныя вятры*, існуюць у горнай мясцовасці. Яны ўтвараюцца, калі з супрацьлеглага боку гор наплывае вільготная паветраная маса. Вільгаць губляецца на падветраных схілах, а цёплыя сухія і моцныя вятры дзьмуць з горных вяршынь у даліны.

***Феналагічныя поры года***

У адрозненне ад Беларусі, у Польшчы вылучаецца шэсць тэмпературных пораў года:

- Ранняя вясна з тэмпературай ад 0°C да +5°C;
- Вясна – ад +5°C да +15°C;
- Лета – вышэй за +15°C;
- Восень – ад +15°C +5°C;
- Ранняя зіма – ад +5°C да 0°C;
- Зіма – ніжэй за 0°C.

***Вегетатыўны перыяд***

Спалучэнне кліматычных умоў стварае параўнальна добрыя ўмовы для развіцця сельскай гаспадаркі. Іх вызначае працягласць вегетацыйнага перыяду – часу, калі тэмпература не зніжаецца менш за +5°C, спрыяльнага для росту раслін. Яго працягласць вагаецца ад 180 да 220 дзён. Найбольшы вегетацыйны перыяд – на нізіне Шлёнскай і ў Сандамірскай катлавіне, самы кароткі – у гарах і на паўночным усходзе. Пачатак яго ў першым выпадку прыпадае прыкладна на 25 сакавіка, у другім – на 15 красавіка.

## Падсумаванне

- Для Польшчы характэрны цёплы, умерана-кантынентальны клімат.
- Найбольшы ўплыў на надвор'е робіць марская ўмераная (палярная) паветраная маса
- Сярэднегадавая тэмпература ў Польшчы складае +7,5°C.
- Сярэднегадавая сума ападкаў складае ў Польшчы 600 мм.
- У Польшчы пераважаюць заходнія вятры.
- У Польшчы вылучаюць 6 феналагічных пораў года.
- Вегетатыўны перыяд у Польшчы складае ад 180 да 220 дзён.

## Заданні

- Чаму на сярэдняпольскіх нізінах выпадае найменшая колькасць ападкаў? Як завецца з'ява, якая гэта выклікае?
- Чаму раён Сувалак завецца «польскім палярным кругам»?
- Параўнайце галоўныя характарыстыкі клімату ў Польшчы і ў Беларусі. Чым яны падобныя і ў чым іх адрозненні?
- Чаму гару Снежку цяжка ўбачыць пры добрым надвор'і?
- Якая паветраная маса ў найбольшай ступені вызначае характар надвор'я ў Польшчы?

## 2.6. Паверхневыя і падземныя воды

*Агульная характарыстыка водаў Польшчы. Рачная сетка. Басейны сцёку польскіх рэк. Жыўленне рэк. Найбуйнейшыя рэкі: Вісла і Одра. Азёры. Тыпы азёр. Балоты. Падземныя воды. Мінеральныя і тэрмальныя воды.*

### *Агульная характарыстыка*

Наяўнасць крыніц вады з'яўляецца надзвычай істотным чыннікам існавання чалавека. Яны ўключаюць у сябе паверхневыя воды (рэкі, каналы, азёры, вадасховішча і г. д.) і падземныя крыніцы. Польшча мае разгалінаваную рачную сетку, вялікую колькасць азёр, але яна не найлепш забяспечана воднымі рэсурсамі. Калі ў сярэднім у Еўропе на аднаго чалавека прыпадае каля 4800 $м^3$ вады, то ў Польшчы толькі 1800 $м^3$. Гэта звязана з параўнальна нізкім узроўнем ападкаў і вялікім узроўнем выпарвання.

### *Рачная сетка*

Рачная сетка Польшчы вызначаецца дамінаваннем дзвюх вялікіх рэк – Віслы і Одры. Яны і іх прытокі складаюць 89,6 % усёй рачной сеткі. 99,7 % рэк адносяцца да басейна Балтыйскага мора. З Чорным морам звязаныя толькі некаторыя рэчкі ў Карпатах: Чарна Арава (басейн Дуная) і Стрвёнж (басейн Днястра), з Паўночным: Ізэра, Дзіка Арліца і Чармніца (басейн Лабы).

Характэрная асаблівасць польскіх рэк – асіметрыя прытокаў. Правых прытокаў значна больш, чым левых; яны больш працяглыя і паўнаводныя. У Віслы і Одры правыя і левыя прытокі суадносяцца ў прапорцыі 3 да 7. Гэта звязана з асаблівасцю рэльефу Польшчы, які мае нахіл з паўднёвага ўсходу на паўночны захад, а таксама – з нядаўнім геалагічным мінулым: рэчышчы шмат якіх рэк утварыліся падчас чацвярцічнага перыяду. Ледавік адступаў з паўднёвага ўсходу да мора – у тым самым напрамку скіраваныя шмат якія рачныя даліны.

Жыўленне польскіх рэк мае дзве асноўныя крыніцы: раставанне снегу вясной і дажджы летам. Там існуе два пікі ўздыму вады: у лютым-красавіку і ў чэрвені-ліпені. Яны нярэдка прыводзяць да паводак. У найбольшай ступені гэта характэрна для горных рэк,

дзе ўзровень вады можа ўзнімацца на 9–10 м. На балтыйскім узбярэжжы ўздым вады ў рэках часта выклікаюць марскія буры, якія перашкаджаюць звычайнаму сцёку вады. Зімой рэкі замярзаюць. Працягласць ледаставу істотна вагаецца: на захадзе яна складае да аднаго месяца, у цэнтры і на ўсходзе – да трох. Шчыльнасць рачной сеткі таксама не аднолькавая. Найбольшая яна ў горнай мясцовасці, чаму спрыяе вялікая колькасць ападкаў і геалагічная структура паверхні, якая не дазваляе вадзе глыбока пранікаць у глебу. Найменшая, у чатыры разы, – на ўзвышшах, дзе, наадварот, грунтавыя воды залягаюць на вялікай глыбіні.

***Найбуйнейшыя рэкі: Вісла і Одра***

Самая вялікая рака Польшчы – Вісла. Яе працягласць складае 1047 км. Плошча басейна Віслы амаль роўная плошчы Беларусі – 194 тыс. км$^2$. Калі паглядзець на мапу, рэчышча Віслы нагадвае вялікую літару «S», якая перасякае ўсю краіну ад поўдні да поўначы. Вісла злучае найбуйнейшыя гарады краіны: Кракаў, Варшаву і Гданьск. Яна бярэ пачатак у Бяскідах, каля Бараняй Гуры, на




*Одра і Вісла.*



*Вісла каля Плоцка.*

вышыні 1107 м над узроўнем мора. Рэчышча Віслы ўмоўна падзяляюць на тры часткі: горную (ад вытоку да ўпадзення р. Сан), сярэднюю (ад р. Сан да ўпадзення р. Нараў) і ніжнюю. Шырыня ракі ў сярэдняй частцы складае ад 600 да 1000 м. Прыкладна за 50 км ад Балтыйскага мора Вісла падзяляецца на два рукавы: левы – Ляніўка і правы – Нагат, а паміж імі ўтвараецца вялікая дэльта, якая завецца *Жулавы Вісляныя*.

Хоць Вісла і самая вялікая рака ў Польшчы, яе выкарыстанне ў суднаходстве абмежаванае: толькі апошнія 104 км у ніжнім рэчышчы адносяцца да міжнароднага ўзроўню воднай трасы. У Вісле шмат водмеляў, няўстойлівае рэчышча. Але, у цэлым, суднаходства магчымае на працягу 940 км. Вісла мае спалучэнне каналамі з Одрай (канал Быдгоскі), з Нёманам (канал Аўгустоўскі) і Дняпром і Прыпяццю (канал Каралеўскі, або Дняпроўска-Бугскі).

Одра – другая паводле памераў рака Польшчы. Яе даўжыня – 854 км, з якіх 742 км – на тэрыторыі Польшчы. Вытокі Одры знаходзяцца ў Судэтах, на тэрыторыі Чэхіі, на вышыні 634 м над узроўнем мора. У ніжнім цячэнні на працягу 167 км па Одры праходзіць мяжа Польшчы з Германіяй. Бліжэй да Балтыкі Одра падзяляецца на Заходні і Усходні рукавы. Апошні ўтварае возера Домбіе, на беразе якога стаіць вялікі горад-порт Шчэцін. Яшчэ



*Одра ў Аполе.*

ніжэй рукавы яднаюцца і ўтвараюць вялізную Шчэцінскую лагуну, плошча якой дасягае 687 км². У адрозненне ад Віслы, Одра значна больш выкарыстоўваецца ў суднаходстве. Яшчэ ў XIX стагоддзі праводзілася рэгуляванне яе рэчышча, і сёння каля 650 км Одры прыдатныя для вялікіх суднаў. Але аб'ём грузаў, якія перавозяцца, увесь час скарачаецца. Раку выкарыстоўваюць збольшага для перавозкі буйных канструкцый, якія цяжка перамяшчаць з дапамогаю чыгункі ці аўтамабіляў.

***Азёры***

У Польшчы існуе вялікая колькасць азёр – каля 10 тысяч. Каля 2 200 з іх маюць плошчу большую за адзін гектар. Агульная плошча азёр складае каля 0,9 % усёй паверхні краіны. Пераважная большасць азёр знаходзіцца ў паўночнай частцы Польшчы, так званых паазер'ях, дзе яны складаюць да 10 % прасторы. самыя вялікія азёры знаходзяцца ў Мазурскім паазер'і. Гэта возера Сьнярдвы (113 км²) і возера Мамры (98 км²). Вялікія азёры знаходзяцца і каля ўзбярэжжа Балтыкі: Лебска (71 км²) і Медве (35 км²). Самае глыбокае возера ў Польшчы – Ганьча (108 м) – знаходзіцца ва ўсходняй частцы Мазурскага паазер'я, другое паводле глыбіні – Драўска



*Возера Сьнярдвы.*

(80 м) – у Паморскім. Пераважная большасць азёр Польшчы ледавіковага паходжання – марэнныя і лагчынныя (ледавікова-эразійныя). У Люблінскім Палессі ёсць некалькі карставых азёр, напрыклад Дратаў, недалёка ад мяжы з Беларуссю. Каля ўзбярэжжа Балтыкі знаходзяцца азёры, якія паходзяць ад марскіх заток (Ямна, Гардна), а таксама – дэльтавыя азёры, утвораныя з марскіх заток рачнымі наносамі Віслы (Друзна) і Одры (Домбіе). Апроч натуральных азёр, у Польшы ёсць каля 100 штучных вадасховішчаў. Большасць з іх знаходзіц-




*Найбуйнейшыя азёры ў Польшчы.*

ца ў горнай мясцовасці і пабудаваныя для таго, каб рэгуляваць сток вады і пазбягаць паводкі.

### *Балоты*

Пераважная большасць балот размешчаная на поўначы – у паазер'ях. Яны ўтварыліся ў выніку зарастання расліннасцю дробных азёр. Самае вялікае балота – Бебржаньскае, паміж Беластокам і Аўгустовам, мае даўжыню каля 100 км. Вялікія балоты ёсць таксама і ў Люблінскім Палессі (Крове), і на захадзе краіны ў Любускім ваяводстве (Ясеньске).



*Бебржаньскае балота.*

### *Падземныя воды*

Падземныя воды – параўнальна невялікая частка гідрасферы, але яны адыгрываюць надзвычай істотную ролю ў існаванні чалавека. На сённяшні дзень – гэта найлепшая крыніца пітной вады. Запасы артэзіянскай вады ў Польшчы размешчаны ў раёнах Варшавы, Познані, Любліна, рэгіёне прыкарпацкай катлавіны (Нецка Нідзяньска).

Калі вада змяшчае ў сваім складзе болей аднаго грама соляў на літр, яна лічыцца мінеральнай і звычайна выкарыстоўваецца дзеля

лячэння. Усяго ў Польшчы зарэгістравана 28 крыніц мінеральнай вады. Яны ёсць у Карпатах, Судэтах, прыкарпацкай катлавіне, а таксама на ўзбярэжжы. Частка падземных водаў мае падвышаную тэмпературу (вышэй за 20°C). Іх завуць *тэрмальнымі* і таксама выкарыстоўваюць у лекавых мэтах. Крыніцы такіх водаў ёсць у Цяпліцах (Ніжні Шлёнск), Цехацінку (ваяводства Куяўска-Паморскае), Букавіне Татржаньскай (ваяводства Малапольскае).

## Падсумаванне

- Абсалютная большасць рэк Польшчы адносіцца да басейна Балтыйскага мора.
- Рачную сетку Польшчы збольшага ўтвараюць Вісла і Одра са сваімі прытокамі.
- Басейны польскіх рэк маюць дакладна вызначаны асіметрычны характар.
- Пераважная большасць польскіх азёр сканцэнтраваная ў паўночнай частцы краіны.
- Польшча мае вялізны дэфіцыт водных рэсурсаў.

## Заданні

- Чаму большая частка азёр у Польшчы размешчаная на поўначы? Звяжыце адказ са сваімі ведамі па геалагічнай гісторыі.
- Што такое асіметрыя сцёку рэк у Польшчы? Чаму яна ўзнікла?
- Чым адрозніваецца суднаходства на Вісле і на Одры?
- Чаму ў Польшчы існуе дэфіцыт водных рэсурсаў?
- Якія каналы спалучаюць польскія і беларускія рэкі?

## 2.7. Глебавае покрыва

*Класіфікацыя ўрадлівасці глебаў у Польшчы. Тыповыя глебы. Падзолістыя глебы. Буразёмы. Жоўта-карычневыя глебы. Чарназёмы. Нетыповыя глебы. Тарфяна-балотныя глебы. Алювіяльныя глебы. Дзярнова-карбанатныя глебы. Праблемы захавання глебавага покрыва.*

***Класіфікацыя ўрадлівасці глебаў у Польшчы***

У Польшчы існуе глебазнаўчая класіфікацыя паверхні зямлі. Згодна з ёй, усе глебы падзяляюцца на 6 класаў. Найлепшыя якасці мае глеба першага класа, найгоршыя – шостага. Да першага і другога класа (вельмі добрая якасць) адносіцца 3,3 % усіх глебаў, трэцяга




*Глебавае покрыва.*

(добрая якасць) – 22,3 %, чацвёртага (сярэдняя) – 39,8 %, пятага і шостага (нізкая) – 36,6 %. Пяты і шосты клас – гэта неўрадлівыя глебы ў горнай мясцовасці, на ўзбярэжжы мора, пераўвільготненыя або перасушаныя.

### *Тыповыя глебы*

Урадлівасць глебаў залежыць ад вялікай колькасці фактараў: рэльефу, клімату, расліннага покрыва, гаспадарчай дзейнасці чалавека. Але самым істотным фактарам глебаўтварэння з'яўляецца тое, на якой мацярынскай горнай пародзе ўзнікае ўрадлівы пласт зямлі. Пераважную большасць мацярынскіх парод у Польшчы складаюць пяскі, жвіры і гліны, якія засталіся на паверхні пасля заканчэння перыяду зледзянення. На пясках і жвірах с цягам часу з'явілася хваёвая расліннасць, у выніку чаго ўтварыліся не вельмі ўрадлівыя *падзолістыя глебы* (каля 25 % усіх глебаў). На глінах была больш разнастайная расліннасць – змешаныя і шыракалістыя лясы, таму скláліся трохі больш урадлівыя *буразёмы* і *жоўта-карычневыя глебы* (адпаведна 51 % і 5 %). Разам узятыя, падзолістыя, жоўта-карычневыя глебы і буразёмы складаюць каля 80 % паверхні Польшчы.

Буразёмы, якія ўтварыліся на лёсавым падмурку, маюць большую ўрадлівасць. Яны пашыраныя на Шлёнскім, Люблінскім узвышшах, а таксама ў ваколіцах Сандаміра, Жэшува, Пшэмысля і Тарнува. Менш урадлівыя буразёмы паўсталі на глінiстым і глеевым падмурках. Яны сустракаюцца каля Уроцлава, Каліша і на поўначы краіны – у Ольштынскім паазер'і. На лёсавым падмурку ўзніклі рэдкія для Польшчы чарназёмы. Яны займаюць каля 1 % паверхні і з'яўляюцца самымі ўрадлівымі глебамі. Чарназёмы сустракаюцца на Люблінскім, Кракаўска-Чанстахоўскім і Келецкім узвышшах і ў Шлёнскай нізіне. Падзолістыя, жоўта-карычневыя глебы, буразёмы і чарназёмы адносяцца да тыповых глебаў Польшчы.

### *Нетыповыя глебы*

Сярод нетыповых глебаў найбольш пашыранымі з'яўляюцца *тарфяна-балотныя глебы* (9 %). Патэнцыяльна яны маюць вялікую ўрадлівасць, але патрабуюць правядзення меліярацыі, каб іх выкарыстоўвалі ў сельскай гаспадарцы.

*Поймавыя алювіяльныя глебы* (5 %) таксама адрозніваюцца ўрадлівасцю і патрабуюць асушэння. Яны пашыраныя ўздоўж рэчышчаў вялікіх рэк: Віслы, Одры, Варты, Сана і Буга. Самая вялікая прастора такіх глебаў знаходзіцца ў дэльце Віслы – Жулавах Вісляных.

*Чорныя глебы* таксама адносяцца да ліку нетыповых. Гэта вельмі ўрадлівыя глебы, якія ўтварыліся на падмурку глін, гліністых пяскоў і глеяў ва ўмовах высокага ўзроўню грунтавых водаў. Назапашванню гумусу спрыяла спалучэнне балотных глебаў з наяўнасцю вапны. Гэтыя глебы сапраўды маюць цёмны, часта зусім чорны колер. Яны складаюць каля 1–2 % усіх глебаў Польшчы. Часцей за ўсё сустракаюцца на Куявах і ў ваколіцах Сахачава і Цеханува.

*Дзярнова-карбанатныя глебы* таксама адрозніваюцца высокай урадлівасцю. Яны ўзніклі на мацярынскіх пародах вапны і гіпсу, што добра ўплывае на іх урадлівасць. Яны складаюць не больш за 1 % паверхні. Дзярнова-карбанатныя глебы сустракаюцца на Люблінскім узвышшы, каля Кракава, Чанстаховы, Аполя.

*Горныя глебы* адносяцца да ліку найменш урадлівых. Прыродныя ўмовы – нізкія тэмпературы, вялікая колькасць ападкаў – не спрыяюць назапашванню ўрадлівага пласта.

***Праблемы захавання глебавага покрыва***

Асаблівую групу складаюць глебы, якія падвергліся моцнаму антрапагеннаму ўздзеянню (каля 1 % усёй прасторы краіны). Гэта – тэрыторыі прамысловых прадпрыемстваў, здабычы карысных выкапняў і г. д. Такія абшары патрабуюць рэкультывацыі, якая, у сваю чаргу, вымагае немалых капіталаўкладанняў. Да ліку рэгіёнаў з высокім узроўнем забруджвання адносіцца прастора паміж Кракавам, Чанстаховай і Катавіцамі, тэрыторыя здабычы бурага вугалю, ваколіцы вялікіх гарадоў (Варшавы, Уроцлава, Гданьска і Лодзі).

Гаспадарчая дзейнасць чалавека выклікае шэраг праблем, якія закранаюць не толькі прамысловыя тэрыторыі. Галоўнай пагрозай для глебы, якая знаходзіцца ў сельскагаспадарчым абароце, з'яўляецца эрозія. Звыш 20 % паверхні Польшчы знаходзіцца пад яе пагрозай. Гэта, у першую чаргу, датычыць такіх рэгіёнаў, як Люблінскае і Малапольскае ўзвышша, пояс прыкарпацкіх катлавін.

## Падсумаванне

- Пераважную большасць у Польшчы складаюць нізка- і сярэдне-ўрадлівыя глебы: падзолістыя і жоўта-карычневыя глебы, а таксама буразёмы.
- Урадлівыя глебы – поймавыя алювіяльныя, дзярнова-карбанатныя, чарназёмы – складаюць разам каля 5 % зямельных рэсурсаў Польшчы.
- Каля 20 % глебаў Польшчы знаходзяцца пад пагрозай эрозіі.

## Заданні

- Якія глебы ў Польшчы завуць нетыповымі? З чым звязаныя іх асаблівасці?
- Дайце ацэнку зямельных рэсурсаў Польшчы. Глебы якой якасці там пераважаюць?
- Чаму глебы ў горнай мясцовасці не ўрадлівыя?
- Якім чынам дзейнасць чалавека адбіваецца на зямельных рэсурсах Польшчы?

## 2.8. Раслінны і жывёльны свет

*Асаблівасці расліннага свету Польшчы. Эндэмікі і рэліктавыя расліны. Лясы. Хваёвыя лясы. Шыракалістыя дубова-грабавыя лясы. Поймавыя лясы. Драбналістыя альховыя лясы. Экалагічныя праблемы захавання лясоў. Лугі. Асаблівасці жывёльнага свету. Жывёльны свет лясоў. Фаўна палёў і лугоў. Жывёльны свет вадаёмаў і ўзбярэжжаў*

***Асаблівасці расліннага свету***

Раслінны свет Польшчы тыповы для зоны ўмеранага клімату Еўропы. Шмат у чым ён нагадвае беларускі. Але ёсць і адрозненні. Лясоў тут меней, чым у нас, бо большым з'яўляецца антрапагенны ціск. Толькі 8,5 % прасторы мае натуральнае раслíннае покрыва. Аднак раслíннасць больш разнастайнай у сувязі з большай разнастайнасцю прыродных умоў. У Польшчы больш шыракалістых лясоў, шмат эндэмікаў (раслін, якія існуюць толькі ў пэўнай мясцовасці) і рэліктаў (расліны, якія захаваліся ад папярэдніх геалагічных



*Лажэчніца (важуха татржаньска).*

эпох). Да эндэмікаў у Польшчы адносяць каменяломнік, лінею, карлікавую бярозу, лапарскую вярбу. Прыкладам рэліктаў можа быць дэльфініум – прыгожая кветка блакітнага колеру, якая сустракаецца ў прыродным выглядзе ў Татрах, лажэчніца, лістоўніца, чорная бяроза, дэндрантэма і г. д.

***Лясы***

Тэрыторыя, занятая лясамі, складае ў Польшчы 29,4 % ўсёй прасторы. У апошнія стагоддзі ўзровень лясістасці моцна вагаўся. Напрыканцы XVIII ст. яна даходзіла да 40 %. Моцна пацярпелі лясы падчас Другой сусветнай вайны – у 1946 г. яны займалі толькі 20 % тэрыторыі краіны. Больш за палову польскіх лясоў (55,8 %) маюць узрост менш за 60 гадоў.

Найбольш пашыраны тып лесу – *хваёвыя бары*, якія складаюць да 78 %усёй лясной прасторы. Хвоя (сасна) – самае тыповае дрэва – да 70 % лясных рэсурсаў. Значная частка хваёвых бароў – гэта штучныя па-




*Структура польскіх лясоў.*

*Белавежская пушча.*



садкі пасля другой сусветнай вайны. Хвоя расце практычна па ўсёй тэрыторыі. На паўночным усходзе пераважаюць елкі (каля 5 % усіх лясных рэсурсаў), а ў гарах побач з імі растуць і піхты.

Шыракалістыя *дубова-грабавыя лясы* (па-польску – *гранды*) займаюць каля 10 % лясной прасторы. У далёкім мінулым яны займалі звыш 40 % усёй прасторы Польшчы, але, у сувязі з тым, што дубы і грабы растуць на ўрадлівай глебе, большая частка гэтых лясоў была высечана. Параўнальна вялікія абшары іх захаваліся ў Белавежскай (каля паловы яе прасторы) і Барэцкай пушчах. Апроч дубоў і грабаў, у такіх лясах сустракаюцца букі, ліпы і елкі.

*Дробналісцевыя альховыя лясы* растуць на глебах з высокім узроўнем грунтовых водаў, часта на балотах, дзе доўга стаіць вада. Сярод дрэваў тут дамінуе чорная вольха, сустракаюцца таксама бяроза, хвоя. Дрэвы растуць на невялікіх выспачках-глыбах. Такія лясы ёсць у Белавежскай пушчы, Бебржаньскім балоце.

*Поймавыя лясы* растуць на ўрадлівых алювіяльных глебах рачных далін, якія перыядычна залівае вада. Тут пераважаюць дробналістыя дрэвы. У горнай мясцовасці гэтыя лясы складаюцца з шэрай вольхі і елкі, вярбы, ясеня і платана. На раўнінах – з таполі, вербы, вяза. Самыя вялікія поймавыя лясы знаходзяцца ў далінах буйных рэк: Віслы (асабліва ў яе дэльце), Одры, Варты.

### *Экалагічныя праблемы захавання лясоў*

У Польшчы шмат робіцца дзеля захавання лясоў. Да 2050 г. плануецца давесці плошчу пад лясамі да 33 % усёй прасторы краіны. Разам з тым, для лясоў існуюць разнастайныя пагрозы. Бадай што галоўная з іх – так званыя кіслотныя дажджы, што ўтвараюцца ў выніку прамысловых выкідаў у атмасферу вокіслаў азоту, серы і іншых злучэнняў. Калі яны злучаюцца з вадой – утвараюцца кіслоты, якія знішчаюць лісце і ігліцу. Найбольш пацярпелі ад кіслотных дажджоў лясы на ўзвышшах і гарах, недалёка ад прамысловых цэнтраў: у гарах Свентакшыжскіх, Бяскідах, Судэтах (асабліва, у Кракношах).

Другая пагроза – шкодныя насякомыя. Некаторыя з іх – напрыклад, шаўкапрад-манашка, начны матылёк, які корміцца ігліцай, лісцем, пылком, пупышкамі і парасткамі, – асабліва небяспечныя для іглістых дрэваў, дуба, граба і бука. Гэты ды іншыя шкоднікі небяспечныя ва ўмовах монакультуры лясоў, калі яны складаюцца з аднаго гатунку – напрыклад, хвоі.

### *Лугі*

Лугі ў натуральным выглядзе параўнальна рэдка сустракаюцца ў Польшчы. Пераважна яны захаваліся ў дэльтах рэк і ў горнай мясцовасці. На іншых абшарах яны існуюць у паўнатуральнай форме, часцей за ўсё як пашы. Укос травы з’яўляецца неабходнай умовай іх існавання. Штучныя лугі маюць антрапагеннае паходжанне. Іх стварэнне ўключае знішчэнне прыроднага дзёрну, пасеў некалькіх відаў траў і ўнясенне ўгнаенняў.

### *Жывёльны свет*

У Польшчы зафіксавана ад 33 да 36 тыс. відаў дзікіх жывёл. Жывёльны свет шмат у чым падобны на беларускі. Разнастайнасць яго значна большая, чым расліннага. Большую частку фаўны Польшчы складаюць жывёлы, тыповыя для ўмеранай зоны Еўразіі. Найбольшую групу складаюць беспазваночныя (2700 відаў). Сярод пазваночных вылучаецца 370 відаў птушак, 87 відаў млекакормячых (сысуноў), 55 відаў рыб, 17 відаў земнаводных (амфібій) і 8 відаў паўзуноў (рэптылій).

Сярод птушак самай вялікай групай з’яўляюцца вераб’іныя, у тым ліку вераб’і, а таксама жаўрукі, ластаўкі, шпакі, пліскі, амялушкі, шчыглы, гілі, івалгі, сойкі, сініцы, дразды, салаўі, берасцянкі. Асаблівую ўвагу прыцягвае арлан-белахвост, выява якога з’яўляецца сімвалам краіны. Ён сустракаецца на поўначы краіны, пад аховай знаходзіцца не толькі сам від, але і асяроддзе, у якім ён існуе. Сярод птушак трэба таксама згадаць кармарана (чорнага баклана), які сустракаецца ў асноўным у Мазурскім паазер’і; беркута, шэрую чаплю, лебедзя-шыпуна, качку-крыжанку.



*Арлан-белахвост.*

Самыя вялікія дзікія сысуны ў Польшчы – гэта зубр і буры мядзведзь. У апошні час арэал існавання зуброў пашырыўся: апроч Бе-



*Муфлоны.*

лавежскай пушчы, яны жывуць у Бяшчадскім і Воліньскім нацыянальных парках. Мядзведзі сустракаюцца ў Татрах. Сярод іншых буйных млекакормячых трэба згадаць тыповых для змешаных лясоў аленя, казулю, зайца. Тыповыя драпежнікі – ваўкі і лісы, больш рэдкія – рысі. У горных раёнах можна сустрэць муфлона (у Судэтах), сурка (у Татрах). А ў балотах жывуць бабры і выдры.

Земнаводныя прадстаўленыя трытонамі, саламандрамі, жабамі, рапухамі; паўзуны – жвавымі яшчаркамі, гадзюкамі, мядзянкамі, змяёй Эскулапа.

Сярод прэснаводных рыб пераважаюць плотка, акунь, лінь, лешч, сом, шчупак і судак. У прыбярэжных рэках водзяцца мігруючыя віды – ласось, стронга (фарэль), вугор. А ў Балтыйскім моры часцей за ўсё сустракаюцца селядцы, траска, кілька і камбала.

## Падсумаванне

- Лясы займаюць каля 1/3 прасторы Польшчы.
- Дамінуючае дрэва ў польскіх лясах – хвоя (сасна).
- Кіслотныя дажджы і шкоднікі-насякомыя з'яўляюцца галоўнай небяспекай польскіх лясоў.
- Жывёльны свет Польшчы значна больш разнастайны ў параўнанні з раслінным.

## Заданні

- Чым адрозніваюцца лясы Польшчы і лясы Беларусі?
- Як змянялася лясное покрыва Польшчы ў апошнія стагоддзі? Якія мэты пастаўленыя па яго развіцці на будучыню?
- Якое дрэва пераважае ў польскіх лясах? З чым звязаная гэта перавага?
- Жывёльны свет Польшчы нагадвае беларускі. З чым гэта звязана? Якія ёсць адрозненні?

# 3. НАСЕЛЬНІЦТВА

## 3.1. Дынаміка насельніцтва.

*Агульная характарыстыка дэмаграфічнай сітуацыі ў Польшчы. Натуральны рух насельніцтва. Дэмаграфічная гісторыя Польшчы. Дэмаграфічны бум 1950-х гг. Дэмаграфічны крызіс 1990–2000-х гг.*

***Агульная характарыстыка дэмаграфічнай сітуацыі***

У канцы 2015 года колькасць жыхароў Польшчы склала 38 437 тыс. чалавек. Польшча займае 6-е месца па колькасці насельніцтва сярод краін Еўрасаюза, 8-е – у Еўропе і 35-е – у свеце. Шчыльнасць насельніцтва складае 123 чалавекі на 1 км$^2$. Гэта значна больш, чым у Беларусі (47 на 1 км$^2$). У гарадах жыве большасць насельніцтва – 60,7 %, але гэты паказчык меншы, чым у Беларусі (76,3 %). Польшча адносіцца да невялікай колькасці краін у свеце з вельмі высокім узроўнем гамагеннасці (аднастайнасці) насельніцтва – 95 % яго складаюць палякі. Характэрная з'ява дэмаграфічнага развіцця апошніх гадоў – скарачэнне насельніцтва, характэрнае для ўсяго рэгіёна Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

***Натуральны рух насельніцтва***

Змены ў колькасці жыхароў краіны называюцца дэмаграфічны (натуральны) рух насельніцтва. Ён вызначаецца суадносінамі народжаных і памерлых на працягу пэўнага перыяду часу. Калі народжаных больш, чым памерлых, насельніцтва павялічваецца, калі наадварот – скарачаецца. Натуральны прырост/скарачэнне насельніцтва вымяраюць у праміле з дапамогай формулы: розніца паміж народжанымі і памерлымі ў разліку на 1000 жыхароў краіны.

***Дэмаграфічная гісторыя Польшчы***

На працягу гісторыі апошняга тысячагоддзя існавалі розныя перыяды павелічэння і змяншэння насельніцтва Польшчы. Згодна

з меркаваннямі навукоўцаў, каля 1000 г. н. э. на тэрыторыі сучаснай Польшчы жыло ад 1 да 2 млн. чалавек. У сярэдзіне XVII ст. колькасць жыхароў узрасла да 11 млн. Аднак войны сярэдзіны XVII і пачатку XVIII ст. спынілі яго прырост – у сярэдзіне XIX ст. колькасць была ранейшая – 11 млн. У другой палове XIX – пачатку XX ст. адбыўся сапраўдны дэмаграфічны «бум». Колькасць насельніцтва падвоілася – да 22 млн. у 1911 годзе. А ў 1938 г. на сучаснай тэрыторыі Польшчы пражывала 34 849 тыс. чалавек. Другая сусветная вайна прывяла да катастрафічнага скарачэння насельніцтва. У 1946 г. яно складала ўсяго 23 930 тыс. чалавек. Страты склалі 10,9 млн. чалавек, або 31 % насельніцтва. Польшча – адна з найбольш пацярпелых краін у свеце ў часы апошняй вайны. У пасляваенны перыяд колькасць насельніцтва хутка павялічвалася, але спатрэбілася 35 гадоў каб дасягнуць узроўню 1938 г.

***Дэмаграфічны ўздым 1950–1970-х гг.***

У пасляваеннай Польшчы былі два перыяды дэмаграфічнага ўздыму. Першы меў месца ў сярэдзіне 1950-х гг. Паказчык натуральнага прыросту ў той час даходзіў да 19,9 ‰ (гэта самы высокі паказчык у XX ст.) . Другі наступіў у сярэдзіне 1970-х, калі пакаленне народжаных у 1950-х ужо самі сталі бацькамі. Такая з’ява завецца дэмаграфічнае рэха. Натуральны прырост ужо не быў такім вялікім як раней, але ўсё роўна, быў значным (10,7 ‰).

***Дэмаграфічны крызіс 1990–2000-х гг.***

У 1980-х тэмпы натуральнага прыросту значна скараціліся – да 4,8 ‰ у 1989. А апошнія 25 гадоў Польшча знаходзіцца ў сітуацыі дэмаграфічнага спаду. У 1997 г. індэкс натуральнага прыросту склаў 0,9 ‰ і з тых часоў ніколі не падвышаўся. А ў 2002–2005 і 2013–2015 гг. колькасць насельніцтва пастаянна змяншалася – максімальна да – 0,7 ‰ у 2015 годзе.

Чыннікаў дэмаграфічнага крызісу называюць шмат.

Па-першае, гэта наступствы сацыяльных і эканамічных трансфармацый, звязаных з пераходам ад сацыялістычнай да рынкавай эканомікі. Шмат для каго яны сталі прычынай беспрацоўя, зніжэння даходаў, няўпэўненасці ў будучыні.




*Змены ў колькасці насельніцтва Польшчы ў XX–XXI стагоддзях.*

Па-другое, гэта змены сацыяльных прыярытэтаў сярод моладзі, для якой на першае месца выходзяць праблемы атрымання якаснай адукацыі, кар'ернага росту і матэрыяльнай самастойнасці. У сувязі з гэтым, шлюбы сталі ствараецца ў больш познім узросце.

Па-трэцяе, гэта развіццё працоўнай міграцыі, асабліва пасля таго, як Польшча стала чальцом Еўрасаюза і працоўны рынак заходнееўрапейскіх краін адкрыўся для палякаў.

Па-чацвёртае, гэта ўплыў агульных тэндэнцый дэмаграфічнага развіцця, характэрных для еўрапейскіх краін у апошнія дзесяцігоддзі, з мінімальным ці адмоўным прыростам насельніцтва.

Польскі ўрад прымае розныя меры, каб палепшыць дэмаграфічную сітуацыю. Гэта тычыцца і стымулявання нараджальнасці праз сацыяльныя трансферы пры нараджэнні і гадаванні дзяцей, і стымулявання іміграцыі – прытоку насельніцтва польскага паходжання, перш за ўсё, з суседніх краін. Спосабам стымулявання іміграцыі стала так званая «карта паляка», якая стварае для асоб польскай

нацыянальнасці дадатковыя магчымасці і льготы пры пераездзе ў Польшчу.

## Падсумаванне

- Польшча адносіцца да ліку найбуйнейшых еўрапейскіх краін паводле колькасці насельніцтва.
- Шчыльнасць насельніцтва ў Польшчы адпавядае сярэднім еўрапейскім паказчыкам.
- На працягу стагоддзяў колькасць насельніцтва істотна вагалася. Негатыўны ўплыў на яе мелі войны, асабліва Другая сусветная вайна.
- У 1950–1970-я гг. насельніцтва Польшчы расло паскоранымі тэмпамі.
- У 1990–2000-я гг. дэмаграфічны рух запаволіўся, насельніцтва стала скарачацца.

## Заданні

- Параўнайце дэмаграфічныя паказчыкі Польшчы і Беларусі. Што ў іх падобнага і чым яны адрозніваюцца?
- Якім чынам разлічваюць прырост/скарачэнне насельніцтва?
- Што такое дэмаграфічнае рэха?
- Якія тэндэнцыі характэрныя для дэмаграфічнага развіцця Польшчы канца XX – пачатку XXI ст.?
- Пералічыце прычыны дэмаграфічнага спаду ў Польшчы ў апошнія дзесяцігоддзі. Якія з іх вам падаюцца найбольш істотнымі?

## 3.2. Полаўзроставая структура насельніцтва.

*Полаўзроставая піраміда. Суадносіны жаночай і мужчынскай частак насельніцтва ў розных узроставых кагортах. Старэнне насельніцтва. Сярэдняя працягласць жыцця. Працаздольнае насельніцтва. Змены ў колькасці працаздольнага насельніцтва.*

### *Полаўзроставая піраміда*

Дынаміка насельніцтва – вельмі важны паказчык дэмаграфічнага развіцця, але не менш істотным з’яўляецца полаўзроставая структура. Гэта вельмі значны паказчык, ад якога залежыць перспектывы эканамічнага развіцця. Ён дэманструе не толькі тое, колькі працаздольнага насельніцтва ёсць і колькі будзе ў будучыні ў краіне. Гэты паказчык дазваляе зрабіць прагноз адносна таго, колькі будзе патрэбна дзіцячых садкоў і школ, устаноў аховы здароўя і сацыяльнай бяспекі.

Тыповымі рысамі полаўзроставай структуры насельніцтва Польшчы з’яўляецца перавага




*Полаўзроставая структура насельніцтва Польшчы.*

жанчын ва ўзроставых кагортах сталага веку, а таксама старэнне насельніцтва. Падобныя тэндэнцыі характэрныя для Беларусі і для насельніцтва Еўропы ў цэлым.

Калі паглядзець на ўзроставыя кагорты да малодшага і сярэдняга ўзросту (да 49 гадоў), то відавочным будзе невялікая перавага колькасці мужчын у параўнанні з жанчынамі, у прапорцыі 51 да 49. Гэта натуральныя суадносіны, таму што ва ўсім свеце хлопчыкаў нараджаецца крыху болей, чым дзяўчат. Ва ўзроставых кагортах, старэйшых за 49 гадоў, сітуацыя склалася іншая: ва ўзросце ад 50 да 54 гадоў суадносіны будуць 49 да 51, ад 55 да 59 – 47 да 53, ад 60 да 64 – 46 да 54 і г. д. У цэлым па краіне на 100 мужчын прыпадае 106 жанчын (у Беларусі – на 100 мужчын – 114 жанчын). Перавага жанчын (чыннік фемінізацыі) мае акрэслена рэгіянальны характар. Ён у найбольшай ступені выяўлены ў буйных гарадах: у Кракаве на 100 мужчын прыпадае 114 жанчын, у Варшаве – 117, у Лодзі – 119. Перавага колькасці жанчын у пажылым узросце тлумачыцца шэрагам прычын. Мужчыны звычайна занятыя ў прафесіях, звязаных з рызыкай, падвышаным траўматызмам. Сярод мужчын у большай ступені пашыраныя шкодныя звычкі. Пэўную ролю адыгрывае і дэмаграфічнае рэха другой сусветнай вайны.

***Старэнне насельніцтва***

Полаўзроставая структура насельніцтва Польшчы сведчыць аб тэндэнцыі старэння яе жыхароў. Яно выяўляецца ў скарачэнні долі дзяцей і моладзі і павелічэння долі асоб пажылога ўзросту. У 1990 г. асобы ва ўзросце да 17 гадоў складалі 29 % насельніцтва краіны, у 2000 г. – 24,4 %, у 2011 – 18,5 %. З другога боку, колькасць насельніцтва пенсійнага ўзросту (65 гадоў для мужчын і 60 – для жанчын) увесь час павялічвалася: з 13 % у 1990 г. да 16,5 % ў 2010 г.

Старэнне насельніцтва выклікана двума чыннікамі – скарачэннем нараджальнасці і павелічэннем працягласці жыцця. Працягласць жыцця значна павялічылася ў параўнанні з 1990 г. яна стала большай на 4,8 года ў жанчын і 5 гадоў у мужчын, а калі параўноўваць з 1950-мі гг., то, адпаведна, на 18 і 15 гадоў. Працягласць жыцця, якая прагназуецца на сённяшні дзень у Польшчы, складае 71,8 года ў мужчын і 75,8 года ў жанчын.

***Працаздольнае насельніцтва***

Працоўныя рэсурсы з'яўляюцца эканамічна самай важнай часткай насельніцтва. Гэтая частка насельніцтва знаходзіцца ў т. зв. працаздольным узросце, які ў Польшчы вызначаецца для мужчын ад 18 да 64 гадоў, а для жанчын – ад 18 да 59. У гэтых адносінах сітуацыя ў краіне выглядае дастаткова добра: колькасць працоўных рэсурсаў складае 24 739 тыс. чалавек (2011 г.), або 64,5 % насельніцтва. Гэта вельмі добры паказчык, паводле якога Польшча займае адно з першых месцаў у Еўропе. Больш за тое, колькасць асоб у працаздольным узросце ў параўнанні з пачаткам 1990-х гг. павялічылася больш чым на 6 %. Разам з тым, у апошнія гады гэты прырост запаволіўся. Калі ў 2001 г. колькасць тых, хто дасягнуў 18 гадоў, а значыць мог выйсці на рынак працы, склала 694 тыс. чалавек, то ў 2008 г. – 554 тыс. Адначасова павялічылася колькасць т. зв. «не мабільных» асоб працаздольнага ўзросту (пасля 44 гадоў), якія, як лічыцца, ужо не маюць жадання пераязджаць з месца на месца ў пошуках лепшай працы: у 2000 г. яны складалі 21 % працоўных рэсурсаў, а ў 2011 г. – 24,2 %. Таму ў адносна недалёкай перспектыве гэтыя тэндэнцыі могуць прывесці да негатыўных наступстваў. Меры, якія прымае польскі ўрад у галіне дэмаграфічнай палітыкі, павінны змяніць сітуацыю да лепшага.

## Падсумаванне

- Полава-ўзроставая структура насельніцтва Польшчы сведчыць аб перавазе жанчын ва ўзроставых кагортах сталага веку.
- Для дэмаграфічнай сітуацыі Польшчы характэрна старэнне насельніцтва ў выніку павелічэння працягласці жыцця і скарачэння колькасць моладзі і дзяцей.
- Польшча валодае вялікімі працоўнымі рэсурсамі, але негатыўныя тэндэнцыі дэмаграфічнага развіцця могуць змяніць гэтую сітуацыю.

## Заданні

- Чаму звесткі пра полаўзроставую структуру насельніцтва маюць значэнне для развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы?
- Чаму жанчын у Польшчы ў сярэднім больш, чым мужчын?

- Што выклікае дэмаграфічнае старэнне насельніцтва?
- Які змены адбываюцца з працоўнымі рэсурсамі Польшчы ў апошнія дзесяцігоддзі?

## 3.3. Рассяленне насельніцтва і міграцыі

*Шчыльнасць насельніцтва. Польшчы ў еўрапейскім вымярэнні шчыльнасці насельніцтва. Рэгіянальныя асаблівасці шчыльнасці насельніцтва ў Польшчы. Урбанізацыя. Тыпы гарадскіх паселішчаў. Агламерацыі. Тэндэнцыі развіцця гарадоў у Польшчы. Тыпы міграцыі. Кірункі ўнутранай міграцыі. Знешняя міграцыя. Эміграцыя і іміграцыя.*

***Шчыльнасць насельніцтва***

У кожнай краіне насельніцтва размяшчаецца нераўнамерна. Польшча – не выключэнне ў гэтых адносінах. Нераўнамернасць выклікана рознымі прычынамі. Сярод іх – рэльеф мясцовасці, клімат, аддаленасць ад марскога ўзбярэжжа, наяўнасць шляхоў зносін, урадлівасць глебы, і, у сённяшніх умовах, – магчымасці працаўладкавання.

Паказчыкам нераўнамернасці з'яўляецца шчыльнасць насельніцтва, гэта значыць, колькасць жыхароў на 1 км$^2$. У Польшчы гэты паказчык складае 122 чалавека на 1 км$^2$. Гэта дастаткова высокі паказчык – значна большы, чым у Беларусі (45,8 чалавек на 1 км$^2$). Ён блізкі да паказчыкаў Францыі (117 чалавек на 1 км$^2$), Партугаліі (112), меншы чым у Германіі (224), Вялікабрытаніі (254), Бельгіі (333) ці Нідэрландаў (400).

У межах Польшчы шчыльнасць насельніцтва вельмі моцна адрозніваецца. Самы высокі паказчык – у Шлёнскім ваяводстве (377 чалавек на 1 км$^2$), а на Падляшшы і ў Вармінска-Мазурскім ваяводстве ён блізкі да беларускага (59). У цэлым па краіне найбольш шчыльна заселены паўднёвыя (ніжні і верхні Шлёнск) і цэнтральныя (Мазавецкае ваяводства), а найменш – паўночна-ўсходнія і паўночна-заходнія (Любускае і Заходне-Паморскае ваяводствы) рэгіёны. Адрозненні ў шчыльнасці тлумачацца рознымі прычынамі. Высокая шчыльнасць насельніцтва ў Шлёнскім і Мазавецкім ва-




*Шчыльнасць насельніцтва Польшчы.*

яводствах звязана з высокім узроўнем развіцця прамысловасці і сферы паслуг – і таму вялікай колькасці працоўных месцаў. Нізкая шчыльнасць насельніцтва можа быць звязаная з адноснай неўрадлівасцю глебы (на Падляшшы) ці наступствамі міграцыйных працэсаў у канцы Другой сусветнай вайны – калі з сённяшняй тэрыторыі Польшчы было выселена да 4 млн. этнічных немцаў.

### *Гарадскія паселішчы*

Працэс павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва і развіцця гарадоў завецца *ўрбанізацыяй*. Адсотак гараджан у структуры насельніцтва з’яўляецца паказчыкам узроўню ўрбанізацыі




*Узровень урбанізацыі ў Польшчы*
*(працэнт гарадскога насельніцтва па паветах).*

і, у пэўнай ступені, развіцця краіны. Пасля заканчэння Другой Сусветнай вайны доля гарадскога насельніцтва ў Польшчы складала каля 34 %. З 1946 па 1967 г. яно падвоілася, і ў 1967 г. гарадскога насельніцтва ўпершыню стала болей, чым вясковага (50,6 %). Урбанізацыя дасягнула свайго піку ў 1994 г., калі доля гараджан склала 61,9 %. Пасля гэтага рост спыніўся, а з 2001 г. пачалося скарачэнне гарадскога насельніцтва. У 2014 г. у Польшчы было 919 гарадскіх паселішчаў у якіх жыло 60,3 % насельніцтва (23 216 тыс. чал). Паказчык урбанізацыі ў Польшчы значна ніжэйшы ў параўнанні

з многімі еўрапейскімі краінамі: Бельгіяй (98 %), Даніяй (88 %), Фінляндыяй (84 %), Францыяй (80 %) і г. д.

У Польшчы няма буйных мегалаполісаў, характэрных для развіцця сусветнай урбанізацыі. У самым вялікім горадзе Варшаве – 1744 тыс. жыхароў, гэта значыць менш, чым у Мінску (1938 тыс.). Буйнымі гарадамі з'яўляюцца Кракаў (761 тыс.), Лодзь (700 тыс.), Уроцлаў (635 тыс.) і Познань (542 тыс.). У 16 гарадах з насельніцтвам больш за 200 тыс. чалавек жыве 19 % усіх гараджан. Больш за ¾ польскіх гарадоў (697) – невялікія мястэчкі з насельніцтвам менш за 20 тыс. чалавек.

Узровень урбанізацыі моцна адрозніваецца ў паасобных рэгіёнах. Найвышэйшыя паказчыкі (больш за 70 %) – у Шлёнскім і Ніжняшлёнскім ваяводствах, найменшыя – на паўднёвым усходзе (Малапольскім, Свентакшыжскім, Люблінскім і Падкарпацкім ваяводствах), дзе ў гарадах жыве менш за 50 %.

***Агламерацыі***

Характэрная з'ява для Польшчы – утварэнне гарадскіх агламерацый поліцэнтрычнага тыпу: калі ў адзіную прастору зліваецца некалькі, параўнальна невялікіх, гарадоў з прыкладна падобнай




*Поліцэнтрычная канурбацыя Катавіцы.*




*Монацэнтрычная канурбацыя Варшавы.*

колькасцю насельніцтва. Такія ўрбаністычныя ўтварэнні яшчэ называюць *канурбацыямі*. Самы тыповы прыклад – катавіцкая (шлёнская) агламерацыя, колькасць жыхароў якой складае прыкладна 2,7 млн. чалавек. Гэта – найбуйнейшая ўрбанізаваная прастора ў Польшчы. Яе ўтвараюць 19 гарадоў, самыя вялікія з якіх фактычна зліліся ў адзінае цэлае. Гэта – Катавіцы (301 тыс.), Сасновец (209 тыс.), Глівіцы (184 тыс.), Забжэ (177 тыс.), Бытам (172 тыс.). Другі прыклад – гэта т. зв. Труймясто, агламерацыя, якая складаецца з Гданьска (460 тыс. жыхароў), Гдыні (247 тыс.) і Сопата (37 тыс.).

Другі варыянт – монацэнтрычныя агламерацыі, у якіх дамінуе адзін вялікі горад. Самыя вялікія агламерацыі такога тыпу – гэта Варшаўская, якая налічвае каля 2,66 млн. жыхароў, Кракаўская – 1,26 млн. чалавек і Лодзінская – 1,06 млн. чалавек.

***Тэндэнцыі развіцця гарадоў у Польшчы***

У развіцці гарадоў існуюць розныя тэндэнцыі. Шмат якія «старыя» прамысловыя цэнтры губляюць свае эканамічнае значэнне і, разам з ім, насельніцтва. Да ліку такіх гарадоў адносіцца Лодзь, у мінулым – цэнтр тэкстыльнай прамысловасці Польшчы: у 1988 г. там жыло 854 тыс. чалавек, сёння – толькі 700 тыс. Падобныя тэндэнцыі характэрныя і для асобных гарадоў катавіцкай агламерацыі: Сасновец і Бытом з 2002 па 2014 г. страцілі каля 10 % свайго насельніцтва, Глівіцы – 9 %, Катавіцы – 7 %. Скарачэнне насельніцтва ў гарадах звязана не толькі з заняпадам пэўных галін вытворчасці. Шмат дзе яно выклікана перасяленнем гараджан у субурбанізаваныя зоны. У Познані, напрыклад, якая адносіцца да ліку найбольш паспяховых гарадоў, колькасць насельніцтва з 1990 па 2012 г. скарацілася на 6,5 %. Адначасова колькасць жыхароў у прыгарадзе павялічылася больш чым на 45 %.

Да гарадоў, якія развіваюцца хутка, належаць Варшава, у якой з 2000 па 2014 г. насельніцтва павялічылася на 3,5 %, а таксама гарады на ўсходзе Польшчы: Беласток (прырост на 3,5 %) і Жэшуў (14 %).

***Тыпы міграцый***

Міграцыі адыгрываюць істотную ролю ў дэмаграфічным развіцці краін і рэгіёнаў. Пад міграцыяй разумеюць перамяшчэнне за аднаго месца ў другое, з мэтай змяніць месца жыхарства на працяглы перыяд часу. Міграцыі падзяляюць на ўнутраныя (у межах адной краіны) і знешнія (перасяленне за мяжу). У залежнасці ад напрамку, у межах знешніх міграцый вылучаюць эміграцыю (выезд грамадзян краіны за мяжу) і іміграцыю (прыбыццё замежнікаў у краіну). Людзей, якія змянілі сталае месца жыхарства, яшчэ завуць мігрантамі. Характар знешніх міграцыйных працэсаў адлюстроўвае *сальда міграцыі*. Калі імігрантаў больш, чым эмігрантаў, сальда дадатнае, калі наадварот – адмоўнае.

***Знешнія міграцыі. Эміграцыя і іміграцыя***

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны найбольшае значэнне для Польскай дзяржавы мелі не ўнутраныя, а знешнія міграцыі.




У першую чаргу гэта было звязана з рашэннямі Ялцінскай канферэнцыі 1945 г., калі межы польскай дзяржавы істотна змяніліся. У склад яе ўвайшлі тэрыторыі на захадзе і на поўначы, на якіх раней пражывала шматлікае нямецкае насельніцтва. Частка немцаў уцякла адтуль да заканчэння вайны, большая – была дэпартаваная ў наступныя пяць гадоў. Дакладных звестак пра памеры гэтай міграцыі няма. Прыкладна з заходніх і паўночных тэрыторый было

выселена ад 3,5 да 3,9 млн. чалавек. З іншага боку, з прасторы, якая яшчэ ў 1939 г. была далучана да СССР, пасля заканчэння вайны ў Польшчу была перасялена вялікая колькасць палякаў і, нярэдка, католікаў, якіх палічылі палякамі, з Літвы, Беларусі і Украіны. Гэтая хваля мігрантаў трапляла менавіта на тыя тэрыторыі, дзе раней жыло нямецкае насельніцтва. Агульная колькасць іх складала прыкладна 1,8 млн. чалавек, у тым ліку перасяленцаў з Беларусі – каля 273 тыс. чалавек. Была і адваротная плынь з украінцаў (да 480 тыс.), беларусаў (37 тыс.) і літоўцаў, якіх з Польшчы перасялялі ў СССР. Абмен насельніцтвам быў працягнуты ў 1955 – 1959 гг., калі ў Польшчу прыехала яшчэ больш за 255 тыс. чалавек.

У 1950–1980-х гг. значная паводле колькасці эміграцыя была ў асноўным выкліканая палітычнымі і эканамічнымі чыннікамі: шмат якія палякі былі не задаволеныя камуністычным рэжымам і ўмовамі жыцця. Пасля 1956 г., калі магчымасцяў выехаць з краіны стала болей, толькі за два гады Польшчу пакінула каля 272 тыс. чалавек. Практычна за ўвесь перыяд з 1946 па 2014 г. сальда знешняй міграцыі было адмоўнае, а ў перыяд з 1956 па 2014 г. з Польшчы ўсяго з’ехала больш за 1,6 млн. чалавек.

Новая хваля працоўнай эміграцыі ўзнікла ў 1990–2000 гг. Яна была выклікана эканамічнымі прычынамі: у часы сацыяльнай трансфармацыі людзі шукалі лепшай долі ў краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Колькасць эмігрантаў істотна павысілася пасля ўступлення Польшчы ў Еўрапейскі Саюз: з краіны выехала каля 290 тыс. чалавек. Адначасова за гэтыя 10 гадоў істотна павялічылася і колькасць імігрантаў – да 147 тыс. чалавек, сярод якіх былі палякі-рэпатрыянты з рэспублік былога СССР. Стала павялічваецца і колькасць часовых імігрантаў, якія прыязджаюць у Польшчу на працу. Толькі ў адным 2013 г. іх было 121 тыс. чалавек, галоўным чынам з Украіны, Беларусі, а таксама Кітая і В’етнама.

***Унутраныя міграцыі***

Найбольш маштабная ўнутраная міграцыя ў другой палове XX ст. была выклікана працэсамі ўрбанізацыі ў 1950–1960-х гг. Як і ў іншых краінах, адбылося хуткае павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва за кошт мігрантаў з вёскі. У пачатку XXI ст. прыток

вясковага насельніцтва ў гарады зрабіўся колькасна меншым за адток з гарадоў у вёску. У другім выпадку гаворка ідзе пра перасяленні ў прыгарады, якія фармальна з адміністрацыйнага пункту гледжання лічацца вёскамі. Апроч гэтага, адбываецца абмен насельніцтвам паміж гарадамі: часцей за ўсё жыхары невялікіх гарадоў і мястэчак перамяшчаюцца ў вялікія гарадскія агламерацыі, які даюць больш магчымасцяў добрага працаўладкавання.

## Падсумаванне

- Шчыльнасць насельніцтва ў Польшчы адпавядае сярэднім паказчыкам у Еўропе.
- Найбольшая шчыльнасць насельніцтва на тэрыторыі Польшчы зафіксавана ў Ніжняшлёнскім, Шлёнскім і Мазавецкім ваяводствах, найменшая – у Любускім і Заходне-Паморскім ваяводствах.
- Адсотак гарадскога насельніцтва ў Польшчы меншы, чым у большасці еўрапейскіх краін.
- Сярод гарадскіх паселішчаў у Польшчы пераважаюць невялікія гарады з насельніцтвам менш за 20 тыс. чалавек.
- Найбольшае значэнне для найноўшай гісторыі Польшчы мелі знешнія міграцыі, звязаныя з заканчэннем Другой сусветнай вайны, і эміграцыя ў 1950–2000 гг.
- Найбольшае значэнне ў развіцці ўнутранай міграцыі мелі працэсы ўрбанізацыі ў 1950–1960-х гг.

## Заданні

- З дапамогаю даведачнай літаратуры ці інтэрнэту знайдзіце еўрапейскія краіны, у якіх шчыльнасць насельніцтва падобная на польскую.
- Чым выклікана нераўнамернасць рассялення насельніцтва ў Польшчы?
- Знайдзіце 20 найбуйнейшых гарадоў Польшчы на мапе. Зрабіце выснову аб іх рэгіянальным размеркаванні.
- Прывядзіце прыклады полі- і монацэнтрычных агламерацый у Польшчы. Якім чынам яны ўтварыліся?
- Якія міграцыі мелі найбольшае значэнне для для найноўшай гісторыі Польшчы?

## 3.4. Структура працаўладкавання і беспрацоўе

*Змены ў структуры працаўладкавання ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Асаблівасці структуры працаўладкавання Польшчы ў еўрапейскім кантэксце. Рэгіянальныя асаблівасці структуры працаўладкавання. Беспрацоўе. Рэгіянальныя асаблівасці беспрацоўя. Чыннікі беспрацоўя.*

***Структура працаўладкавання***

Структура працаўладкавання дэманструе, якім чынам працоўныя рэсурсы размеркаваныя па сектарах эканомікі. Умоўна вылучаюць тры асноўныя сектары: прамысловасць, сферу паслуг і сельскую гаспадарку. Перавага таго ці іншага сектара складвалася гістарычна. У даіндустрыяльную эпоху ад 70–80 % да 90–95 % працаздольнага насельніцтва было занята сельскагаспадарчай вытворчасцю. Калі гэты адсотак становіцца меншым за 50 %, можна казаць пра тое, што грамадства дасягнула індустрыяльнай ступені развіцця. А ў апошняй трэці XX ст., у сувязі з постіндустрыяльнай трансфармацыяй, галоўным сектарам становіцца сфера паслуг. Сёння ў эканамічна развітых краінах у ёй занята да 60–70 % насельніцтва. Структура працаўладкавання адлюстроўвае як узровень развіцця яе, так і спецыфічныя асаблівасці.

***Асаблівасці структуры працаўладкавання ў Польшчы***

Асаблівасцю структуры працаўладкавання ў Польшчы ёсць надзвычай вялікая колькасць занятых у сельскай гаспадарцы. Шмат у чым гэта абумоўлена гістарычна. Напярэдадні Другой сусветнай вайны Польшча, як і большасць краін у рэгіёне Цэнтральна-Усходняй Еўропы, была яшчэ аграрнай краінай: занятыя ў сельскай гаспадарцы складалі тут 59 % усёй працоўнай сілы. У пасляваенны перыяд індустрыяльнае развіццё значна паскорылася, аднак яно не здолела цалкам змяніць структуру працаўладкавання: напрыканцы сацыялістычнай эпохі, у 1990 г., у сельскай гаспадарцы было ўсё яшчэ занята 29 % усіх працоўных рэсурсаў.

У часы сацыяльных трансфармацый 1990–2000-х гг. структура занятасці істотна змянілася – яна стала больш адпавядаць сучасным тэндэнцыям. Значна павялічылася доля сферы паслуг – да 57 %;




*Змены ў структуры занятасці і ўзроўні беспрацоўя.*

больш чым удвая, да 12 %, скараціўся адсотак занятых у сельскай гаспадарцы. Аднак нават і пры гэтым доля працоўных у аграрным сектары ўсё яшчэ непараўнальна большая, чым у краінах Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Дзеля параўнання, у Аўстрыі яна складае 1,4 %, у Бельгіі і Германіі – па 0,7 %, у Даніі – 1,3 %, у Чэхіі – 2,7 %, у Літве – 3,5 %, у Славакіі – 3,4 %.

***Рэгіянальныя асаблівасці структуры працаўладкавання***

Структура працаўладкавання ў Польшчы мае выразныя рэгіянальныя асаблівасці. Ва ўсходніх і паўднёва-ўсходніх ваяводствах заўважная надзвычай вялікая доля занятых у сельскай гаспадар-

цы: у Люблінскім ваяводстве – 27,5 %, у Свентакшыжскім – 24,2 %, у Падляшскім – 23,5 %, у Падкарпацкім – 21,4 % (стан на 2011 г.). Найвышэйшая колькасць занятых у прамысловасці – у Шлёнскім (39,3 %), Апольскім (36,3 %) і Ніжняшлёнскім (34,5 %) ваяводствах. А найбольшая колькасць занятых у сферы паслуг – у Мазавецкім (65,7 %), Паморскім (62,6 %) і Заходне-Паморскім (61,9 %) ваяводствах. Трэба падкрэсліць, што адрозненні ў колькасці занятых у прамысловасці і сферы паслуг не такія значныя, як у сельскай гаспадарцы. Сітуацыя з структурай працаўладкавання ва ўсходніх і паўднёва-ўсходніх ваяводствах унікальная і не мае аналагаў у рэгіёне.

***Беспрацоўе***

Да пачатку 1990-х гг. у Польшчы існавала эканамічная сістэма планавага сацыялістычнага тыпу, якой была ўласцівая амаль што стапрацэнтная занятасць. Беспрацоўе практычна адсутнічала: у студзені 1990 г. беспрацоўныя складалі 0,3 % эканамічна актыўнага насельніцтва. Пераход да рынкавай эканомікі непазбежна суправаджаўся ўзнікненнем беспрацоўя як сацыяльнай з’явы і значнага павелічэння яго памераў. Толькі на працягу аднаго 1990 г. доля беспрацоўных вырасла больш чым у 20 разоў, а ў 2003 г. рост колькасці беспрацоўных дасягнуў свайго піку – 20,7 %. У апошнія 10 гадоў узровень беспрацоўя пастаянна зніжаецца: у жніўні 2016 г. ён склаў 8,5 %. Гэта дэманструе вельмі добры прагрэс, але ўзровень беспрацоўя ў Польшчы ўсё яшчэ вышэйшы ў параўнанні з Літвой (8,2 %), Венгрыяй (6,8 %), Чэхіяй (6,5 %), Германіяй (4,8 %), Даніяй (4,7 %).

У рэгіянальным аспекце ўзровень беспрацоўя вельмі істотна адрозніваецца. Найбольш высокі ўзровень захоўваецца на поўначы краіны ў Варміньска-Мазурскім ваяводстве – 13,9 %. У некаторых паветах ён нават вышэйшы – да 22–24 %. Найменш вострай праблема працаўладкавання ёсць у Вялікапольскім ваяводстве – 5,2 %, у тым ліку ў Познані – толькі 2,5 % (гэта найлепшы паказчык за 2016 г.). Увогуле, статыстыка сведчыць, што лепшыя шансы знайсці працу маюць жыхары вялікіх гарадоў: у Варшаве ўзровень беспрацоўя складае 3,1 %, Уроцлаве – 3,2 %, Гданьску – 3,8 %, Кракаве – 4 %.




*Беспрацоўе ў Польшчы па паветах (2010 г.).*

***Чыннікі беспрацоўя***

Беспрацоўе ў Польшчы было выклікана шэрагам разнастайных чыннікаў. Шмат якія прадпрыемствы і цэлыя галіны вытворчасці ва ўмовах рынкавай эканомікі аказаліся нежыццяздольнымі. Гэта тычыцца тэкстыльнай прамысловасці, суднабудавання, чорнай металургіі, вуглездабычы, шматлікіх прадпрыемстваў машынабудавання і г. д.

Спецыфічнай праблемай Польшчы стала ліквідацыя польскіх

«саўгасаў», так званых ПГРаў (скарачэнне ад *Państwowe gospodarstwo rolne*). У сярэдзіне 1980-х гг. у ПГРах былі сканцэнтраваныя вялікія працоўныя рэсурсы – да 490 тыс. чалавек. Цягам трох гадоў, з 1991 па 1993, яны былі ліквідаваныя, і значная колькасць людзей засталася без працы. У сувязі з тым, што ПГРы былі створаныя збольшага на тэрыторыях, далучаных да Польшчы пасля Другой сусветнай вайны, іх ліквідацыя шмат у чым абумовіла рэгіянальныя асаблівасці сучаснага беспрацоўя.

Пэўны ўплыў на павелічэнне беспрацоўя мелі і дэмаграфічныя чыннікі: у 1990–2000-х гг. на рынак працы выйшлі генерацыі, народжаныя падчас дэмаграфічнага ўздыму 1970–1980-х гг.

Сярод іншых чыннікаў называюцца: неадпаведнасць сістэмы адукацыі патрэбам рынкавай эканомікі, нежаданне часткі эканамічна актыўнага насельніцтва засвойваць новыя прафесіі ці кваліфікацыі, мяняць месца жыхарства ў пошуках працы (нізкі ўзровень мабільнасці), а таксама ўплыў пашырэння новых тэхналогій аўтаматызаванай вытворчасці, што скарачаюць колькасць працоўных месцаў.

## Падсумаванне

- Структура працаўладкавання адлюстроўвае ўзровень развіцця грамадства і яго асаблівасці.
- Асаблівасцю структуры працаўладкавання ў Польшчы з'яўляецца вялікая колькасць занятых у сельскай гаспадарцы.
- У рэгіянальным вымярэнні найбольшая колькасць занятых у аграрным секатары застаецца ва ўсходніх і паўднёва-ўсходніх ваяводствах.
- Масавае беспрацоўе стала значнай сацыяльнай з'явай у 1990–2000-х гг.
- Чыннікамі беспрацоўя сталі трансфармацыя сацыялістычнай эканомікі, дэмаграфічныя і іншыя фактары.

## Заданні

- Як мянялася структура працаўладкавання ў да-індустрыяльную, індустрыяльную і пост-індустрыяльную эпохі?
- У чым выяўляецца асаблівасць структуры працаўладкавання ў Польшчы ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі краінамі?

- Назавіце рэгіянальныя асаблівасці структуры працаўладкавання ў Польшчы.
- Чаму масавае беспрацоўе з'яўляецца ў Польшчы ў пачатку 1990-х гг.? Чаму яго не было раней?
- Што ў найбольшай ступені паўплывала на ўзнікненне масавага беспрацоўя?

## 3.5. Склад насельніцтва. Палякі. Этнаграфічныя групы палякаў

*Этнічны склад і канфесійны склад насельніцтва Польшчы. Палякі. Палонія. Этнаграфічныя групы палякаў. Шлянзакі, кашубы.*

***Этнічны і канфесійны склад насельніцтва***

Польшча адносіцца да невялікай колькасці краін у свеце з вельмі высокім узроўнем гамагеннасці (аднастайнасці) насельніцтва: 95 % яго складаюць палякі. З падобнай сітуацыяй можна сутыкнуцца хіба што ў Японіі (98,5 % японцаў) ці Партугаліі (96,3 % партугальцаў). На пытанне аб колькасці нацыянальных меншасцяў адназначны адказ даць цяжэй: у апошнія гады ў Польшчы можна дэклараваць не адну, а дзве нацыянальныя ці этнічныя прыналежнасці. Апроч гэтага, няма адзінай думкі наконт таго, каго лічыць меншасцю, а каго – этнаграфічнай групай, а значыць, часткай «польскага народа». Сярод дакладна акрэсленых этнаграфічных і нацыянальных груп самымі шматлікімі з'яўляюцца шлянзакі, кашубы, немцы, украінцы, беларусы, цыганы.

Менш дакладнымі з'яўляюцца звесткі пра канфесійную (рэлігійную) прыналежнасць. Падчас перапісу 2011 г. на гэтае пытанне можна было адказваць паводле жадання. Рэлігійнымі сябе палічылі 91 % жыхароў Польшчы, астатнія ці не адказалі на пытанне ўвогуле, ці палічылі сябе безрэлігійнымі, ці не здолелі вызначыць сваю рэлігійную прыналежнасць. Самую вялікую групу вернікаў склалі каталікі – 87,6 % усяго насельніцтва, сярод іншых – праваслаўныя (0,41 %), прыхільнікі розных напрамкаў пратэстантызму (0,65 %), грэка-каталікі (0,09 %).

### *Палякі*

Нацыянальную большасць складаюць палякі, другі ці трэці паводле колькасці славянскі народ пасля рускіх. Другі ці трэці – таму, што колькасць палякаў амаль што роўная колькасці ўкраінцаў. Польская мова, разам з чэшскай, славацкай і серба-лужыцкай, адносіцца да заходнеславянскай падгрупы славянскіх моў індаеўрапейскай моўнай сям'і. Нягледзячы на тое, што польская і беларуская мова адносяцца да розных падгруп, у іх шмат агульнага як у слоўнікавым, так і ў фанетычным складзе. Палякі і беларусы падобныя і ў плане фізічнай антрапалогіі.

Продкі сучасных палякаў стварылі адну з самых старажытных дзяржаў сярод славян і народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, гісторыя якой пачынаецца сама меней ад сярэдзіны X ст. Да XIII ст. адносяцца самыя старажытныя прыклады пісьменнасці на польскай мове, а ў XVII – XIX стст. яна становіцца мовай сацыяльнай і інтэлектуальнай эліты Польшчы, Літвы, Беларусі і заходняй часткі Украіны. Польскамоўная літаратура – адна з самых багатых сярод славянскіх народаў. У стварэнні яе прымалі ўдзел і шматлікія ўраджэнцы нашай краіны. У XX ст. шасцёра палякаў сталі лаўрэатамі Нобелеўскай прэміі. Сярод іх – сусветна вядомыя літаратары Генрых Сянкевіч і Чэслаў Мілаш. А Марыя Кюры-Складоўская – адзіная ў свеце асоба, узнагароджаная Нобелеўскай прэміяй двойчы.

### *Палонія*

Асаблівасцю палякаў з'яўляецца вялікая дыяспара. Дыяспара – гэта частка народа, якая жыве за межамі сваёй нацыянальнай дзяржавы. Па розных звестках, за межамі Польшчы жыве ад 13 да 21 млн. чалавек, якія лічаць сабе палякамі ці з'яўляюцца іхнімі нашчадкамі. Іх падзяляюць на эмігрантаў ды іх нашчадкаў, якіх называюць словам *Палонія*, і тых, якіх лічаць аўтахтоннымі (значыць – карэннымі) палякамі на землях, якія раней былі часткай польскай дзяржавы. Да другой групы адносяць палякаў так званага Усходняга Памежжа (Kresy Wschodnie) – усходніх Латвіі і Літвы, заходніх Беларусі і Украіны, а таксама раёнаў Заользье ў Чэхіі і Спіш у Славакіі.

Утварэнне Палоніі звязваюць з некалькімі хвалямі эміграцыі. Спачатку гэта была палітычная эміграцыя XIX ст., якую склалі ўцекачы-ўдзельнікі паўстанняў 1831 і 1863 гг., што апынуліся ў Францыі, Вялікабрытаніі, Швейцарыі, Злучаных Штатах Амерыкі. Надзвычай шматлікай была працоўная эміграцыя ў другой палове XIX – першай палове XX ст., у выніку якой вялікія групы палякаў з'явіліся ў ЗША, Канадзе, Аргенціне, Бразіліі. У выніку падзей Другой сусветнай вайны шмат палякаў засталося ў краінах Заходняй Еўропы, а таксама ўзніклі польскія супольнасці ў Паўднёвай Афрыцы і Аўстраліі. Працоўная міграцыя канца XX – пачатку XXI ст. прывяла да ўтварэння польскіх грамадаў у Ірландыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі і Аўстрыі.

На сённяшні дзень найвялікшая група палякаў за межамі Польшчы пражывае ў ЗША. Яе колькасць складае 9–10 млн. чалавек. Шмат палякаў жыве ў гарадах на паўночным усходзе – Чыкага, Дэнверы, Дэтройце. У Чыкага, паводле некаторых падлікаў, жыве ад 1,3 да 1,8 млн. асобаў польскага паходжання. Лічыцца, што гэта другая, пасля Варшавы, найбуйнейшая група гарадскога польскага насельніцтва. Другая па колькасці група палякаў эмігрантаў знаходзіцца ў Германіі – каля 2 млн. чалавек. Да 700 тыс. з іх жыве ў Рурскай агламерацыі. Да 1,8 млн. палякаў жыве ў Бразіліі, больш за 1 млн. – у Францыі, 0,9 млн. – у Канадзе, 0,85 млн. – у Вялікабрытаніі, 0,25 млн. – у Аргенціне. Палякі за межамі Польшчы стварылі шматлікія грамадскія і культурныя аб'яднанні. Польская дзяржава надае шмат увагі падтрымцы суайчыннікаў за мяжой. З тэрыторыі Польшчы вяшчае некалькі спецыяльных тэлевізійных каналаў, старэйшы з іх, «ТВ-Палонія», быў заснаваны ў 1992 годзе.

### *Этнаграфічныя групы*

Палякі, як кожны вялікі народ, маюць лакальныя асаблівасці мовы, культуры, свядомасці. Тэрыторыя Польшчы падзяляецца на некалькі гістарычных рэгіёнаў, межы якіх прыкладна супадаюць з дыялекталагічным падзелам польскай мовы. А ў межах рэгіёнаў вылучаюцца больш дробныя этнаграфічныя і этнічныя групы. Этнаграфічныя групы, часцей за ўсё, маюць лакальную спецыфіку маўлення і традыцыйнай культуры; этнічныя, апроч гэ-




*Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны, этнаграфічныя групы, нацыянальныя і этнічныя меншасці.*

тага, – яшчэ і больш-менш акрэсленую самасвядомасць. Падзел на этнаграфічныя і этнічныя групы вельмі ўмоўны. Бывае і так, што погляды дзяржавы і саміх прадстаўнікоў лакальнай групы не супадаюць: апошнія могуць лічыць сябе не часткай нацыянальнай супольнасці, а асобным народам.

Звычайна ў Польшчы вылучаюць пяць буйных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Мазоўша, Вялікапольшчу, Малапольшчу, Шлёнск і Памор’е, а таксама да 20 больш дробных (Падляшша, Мазуры, Куявы і г. д.), а ў іх каля 70 этнаграфічных і этнічных груп.

***Мазоўша***

Мазоўша – адзін з самых старажытных рэгіёнаў Польшчы. На яго тэрыторыі ў XII–XVI ст. існавала асобнае Мазавецкае княства. Мазавецкі дыялект польскай мовы ўключае ў сябе не толькі тэрыторыю ўласна Мазоўша, але таксама і Сувалшчыну, Мазуры, Вармію і Падляшша. Мазавецкі дыялект польскай мовы лічыцца адным з самых своеасаблівых. Для яго характэрнае так званае *мазужэнне* – спецыфічнае вымаўленне шэрагу гукаў. Лічыцца, што менавіта з Мазоўша паходзяць славутыя танцы «мазурка», або «мазурак», мелодыя якіх выкарыстана дзеля стварэння цяперашняга гімна Польшчы.

На тэрыторыі Мазоўшча асобна вылучаюць этнаграфічную групу *курпаў*. Курпы – жыхары ляснога краю – Курпаўскай, Зялёнай і Белай пушчаў, недалёка ад горада Астраленка. У адрозненне ад суседзяў, курпы менш займаліся земляробствам, а больш – рыбалоўствам, пчалярствам, паляваннем, нарыхтоўкай лесу. Назва «курпы» паходзіць ад назвы лапцяў з ліпавага лыка. Самі курпы сябе называлі *пушчакамі* (жыхарамі пушчы). Яны на пра-



*Курлы ў народных строях.*



*Ксянжакі-лавічане.*

цягу стагоддзяў захоўвалі не толькі самабытны лад жыцця, але і асабістую волю: прыгону ў лясным краі ніколі не было. У апошнія гады назіраецца відавочнае імкненне курпаў да захавання сваёй ідэнтычнасці і культуры. З 1996 г. дзейнічае Звяз курпаў. Створаныя падручнік і правілы правапісу курпскай мовы, якія ўключаюць у сябе адмысловыя літары для перадачы асаблівасцяў маўлення.

На мяжы Мазоўша і Вялікапольшчы жывуць ксянжакі-лавіцы, або *лавічане* – этнграфічная група, якая адрозніваюцца гаворкай, лакальнай свядомасцю і вельмі багатымі народнымі строямі. Асаблівасці культуры лавічан збольшага сталі вынікам больш ранняга скасавання прыгону на іх тэрыторыі.

На поўначы Польшчы размешчаны азёрны рэгіён Мазуры. *Мазурамі* называлі і мясцовых жыхароў. Мазурскі дыялект з'яўляецца часткай мазавецкіх гаворак. У адрозненне ад большасці палякаў, мазуры былі не каталікамі, а пратэстантамі – лютэранамі. На працягу доўгага часу яны жылі ў межах нямецкай дзяржавы, аднак, нягледзячы на германізацыю, захавалі сваю культуру і мову. Пры гэтым часта яны не лічылі сябе ні палякамі, ні немцамі,



*Вармякі.*

а менавіта мазурамі. Пасля Другой сусветнай вайны, значная частка мазураў была выселеная ў Германію. Яшчэ больш эміґравала ў 1950–1970-х гг. Сёння на Мазурах іх засталося ўсяго каля 5 тыс. чалавек. Разам з тым, слова «мазур» вельмі пашырана ў Польшчы як прозвішча. Яго мае больш за 65 тыс. чалавек. Даўно вядомыя мазуры і ў Беларусі. Яны перасяляліся ў нашу краіну яшчэ ў XVIII–XIX стст. Вобраз мазура як чалавека адважнага нават зафіксаваны ў беларускім фальклоры: «Мазур калі і смерць убачыць, то не ўтоіцца».

Побач з мазурамі на поўначы Польшчы існавала яшчэ адна невялікая група – *вармякі*, гэта значыць – жыхары Вармii. Яны, гэтаксама як і мазуры, доўгі час жылі пад ціскам германізацыі. У адрозненне ад мазураў, вармякі былі каталікамі. Гаворка вармякаў адносілася да мазавецкіх дыялектаў. Пасля Другой сусветнай вайны значная частка іх таксама эміґравала ў Германію.

Ва ўсходняй частцы тэрыторыі мазавецкага дыялекту знаходзіцца тэрыторыя культурнага памежжа – Падляшша. Тут жывуць *польскія беларусы*, а таксама носьбіты ўкраінскіх гаворак.

***Вялікапольшча***

На захад ад Мазоўша размешчаны другі вялікі гістарычны рэгіён – Вялікапольшча. Вялікапольскія гаворкі ляглі ў падмурак



*Куяўская скрыня.*



*Кацэвякі.*

сучаснай літаратурнай мовы. У межах Вялікапольшчы існавала да 30 розных этнаграфічных груп.

Сярод іх вылучаліся жыхары гістарычнай вобласці Куявы – *куяўляне*. Куявяне адрозніваюцца сваёй гаворкай і традыцыйнай культурай. Ад іх паходзіць і вядомы танец – куявяк. На поўнач ад іх размешчаны *кацэвякі*. Гаворка іх блізкая да куявякаў. Кацэвякі шануюць сваю ідэнтычнасць. Гэта адна з нешматлікіх этнаграфічных груп, зафіксаваных перапісам 2011 г. Больш за 3 тыс. чалавек пазначыла сваю прыналежнасць да кацэвякаў паралельна з польскай ідэнтычнасцю.

Адна з найбольш цікавых этнаграфічных груп Вялікапольшчы – *бамбры* (бамбржы). Гэта нашчадкі нямецкіх перасяленцаў з баварскага горада Бамберг, якія ў першай палове XVIII ст. з'явіліся ў ваколіцах Познані. З цягам часу яны засвоілі польскую мову. Гэтаму паспрыяла іх каталіцкае веравызнанне. Бамбры захоўваюць непаў-



*Бамбры.*

торны жаночы строй, у якім асаблівую ўвагу прыцягвае незвычайны галаўны ўбор з кветак. Дзейнічае Таварыства познаньскіх бамбраў, у 2003 г. адчынены музей бамбраў, а 1 жніўня ў Познані штогод адзначаецца свята бамбраў, прысвечанае прыбыццю першых мігрантаў.

У паўднёвай частцы Вялікапольскага рэгіёну жывуць *біскупяне*, якія атрымалі такую назву, бо ў мінулым жылі ва ўладаннях Познаньскага архібіскупа. Асаблівасці гэтай групы звязаны са спрыяльнымі прыродным умовам, перадусім – з урадлівай глебай, а таксама з адносна ранняй адменай прыгону. У сярэдзіне XIX ст. біскупяне сталі самымі заможнымі і эканамічна незалежнымі жыхарамі Вялікапольшчы. Ад суседзяў біскупян адрозніваюць: своеасаблівы жаночы строй, унікальны музычны фальклор (спалучэнне дуды і скрыпкі), устойлівая ідэнтычнасць.



*Біскупяне.*

На поўначы Вялікапольшчы ёсць яшчэ дзве этнаграфічныя групы – *крайнякі і палучане*. Гаворка крайнякаў спалучае рысы вялікапольскага і кашубскага дыялектаў, іх традыцыйныя строі пазнавальныя дзякую-

*Крайнякі.*



чы сваёй строгай бела-блакітнай гаме. Палучане вядомыя тым, што лічаць сваім продкам сярэдневечнага рыцара Палуку, і гэта складае падмурак усведамлення імі сваёй асаблівасці. Характэрнай часткай традыцыйнай культуры палучан сталі ўнікальныя «пальмы веліканочныя» (у нечым падобныя да віленскіх), а таксама своеасаблівыя па форме выцінанкі.



*Сялянская хата ў Вялікапольшчы.*

*Малапольшча*

Трэцім вялікім гістарычным рэгіёнам з’яўляецца Малапольшча, што знаходзіцца ў паўднёва-ўсходняй частцы краіны. Малапольскія дыялекты разам з вялікапольскімі адыгралі вялікую ролю ў станаўленні польскай літаратурнай мовы.

Найбуйнейшай этнаграфічнай групай Малапольшчы з’яўляюцца *кракавякі*. Шмат у чым яны прадстаўляюць тыповы прыклад польскай народнай культуры, які можа быць увасабленнем польскасці. З іх рэгіёну паходзіць славуты танец кракавяк. На поўначы рэгіёну жывуць *ласавякі*, гаворка якіх спалучае рысы малапольскага і мазавецкага дыялектаў. Характэрная рыса традыцыйнага адзення – перавага белага колеру ў жаночых строях.



*Ласавякі.*

Бадай што самай адметнай у культурным плане не толькі ў Малапольшчы, але і ва ўсёй краіне з’яўляецца група этнаграфічных супольнасцяў пад агульнай назвай *гуралі* («горцы»). Гуралі ёсць не толькі ў Малапольшчы, але і ў Шлёнску. Гуралі Карпатаў размаўляюць на дыялектах польскай мовы, а гаворка жыхароў Судэтаў блізкая да мовы шлянзакаў. У Карпатах гуралі падзеленыя на адносна нешматлікія групы *бабігорцаў*, *падгалянцаў*, *пянінцаў*, *загужанцаў*, *жыўчакаў*, *сандэцкіх гураляў*. Нягледзячы на пэўныя адрозненні, у культуры гураляў было шмат агульнага. Іх традыцыйны лад жыцця істотна адрозніваўся ад астатняга польскага насельніцтва. Суро-



*Гуралі.*

выя прыродныя ўмовы горнай мясцовасці абмяжоўвалі магчымасці развіцця земляробства. Разам з тым, была добра развітая адгонная жывёлагадоўля і асабліва – гадоўля авечак, лепш прыстасаваных для жыцця ў гарах. Менавіта з авечага малака вырабляцца славуты вэнджаны сыр «*асцыпэк*» – своеасаблівы сімвал традыцыйнай кулінарыі гураляў. Арыгінальнасцю вылучалася і традыцыйнае адзенне гураляў. Адметнасцю мужчынскага гуральскага строю было спалучэнне белай кашулі, камізэлькі і характэрных вузкіх штаноў з вышыўкай, а таксама скуранога абутку – «керпцаў». Гуралі захавалі багаты музычны фальклор, непаўторныя танцы. Матывы традыцыйнага драўлянага будаўніцтва, у тым ліку культавага, былі выкарыстаныя ў канцы XIX ст. для стварэння так званага *закапанскага архітэктурнага стылю*, які распаўсюдзіўся далёка за межы горнага рэгіёна. Помнікі архітэктуры ў закапанскім стылі можна сустрэць і на захадзе Беларусі.



*Будынак у закапанскім стылі.*

***Шлёнск***

Бадай што самым спецыфічным гісторыка-культурным рэгіёнам з’яўляецца Шлёнск. Гэта выяўляецца і моўных асаблівасцях, і ва ўстойлівай лакальнай ідэнтычнасці, пашыранай на масавым узроўні. Згодна з перапісам 2011 г., да *шлянзакаў* сябе аднесла каля 850 тыс. чалавек. Пры гэтым частка з іх мае падвойную, польска-шлёнскую ці шлёнска-польскую, ідэнтычнасць, а каля 375 тыс. палічыла сябе толькі шлянзакамі. Колькасць шлянзакаў з 2002 па 2011 г. павялічылася амаль у 5 разоў. Мова шлянзакаў шмат у чым падобная на польскую, таму польская філалогія традыцыйна разглядае яе як дыялект. Яна не мае афіцыйнага статусу. Разам з тым, існуюць літаратура на ёй, грамадскія арганізацыі, якія маюць на мэце прызнанне яе асобнай мовай. Існуе і палітычны рух, які змагаецца за прадстаўленне Шлёнску больш шырокай аўтаноміі. Па-за межамі Польшчы шлянзакі жывуць таксама ў Чэхіі, аднак і там іх мова не мае афіцыйнага статусу. У склад шлянзакаў уваходзіць некалькі больш дробных этнаграфічных груп, у тым ліку *бытамякі*, *гужане*, *кравакі*, *шлёнскія ляхі*, *апаляне*, *рацібажане*, групы *ябланкоўскіх* і іншых гураляў – *брэнякаў* ды *віслянаў*.




*Дэманстрацыя шлянзакаў з патрабаваннем афіцыйнага статусу этнічнай меншасці.*

***Кашубы***

Асобнае месца сярод этнічных груп палякаў займаюць *кашубы*. Гэта – аўтахтонны народ на поўначы Польшчы, у Паморскім ваяводстве, які паходзіць ад старажытнага славянскага племені памаран. Колькасць людзей, якія лічаць сябе кашубамі, у апошнія гады значна павялічылася: з 5 тыс. у 2002 да 228 тыс. у 2011 г.

У адрозненне ад шлянзакаў, большасць кашубаў мае падвойную, польска-кашубскую свядомасць: толькі 16 тыс. з 228 тыс. падчас перапісу 2011 г. пазначылі кашубскую нацыянальнасць як сваю адзіную. Кашубская мова лічыцца дыялектам польскай, аднак яна мае афіцыйны статус рэгіянальнай мовы. Гэта азначае, што на лакальным узроўні яна можа выкарыстоўвацца ў афіцыйным ліставанні. Чыноўнікі павінны даваць адказ на кашубскай мове, калі яны атрымаюць запыт на ёй. Колькасць тых, хто размаўляе па-кашубску, стала павялічваецца: у 2002 г. – 52 тыс. чалавек, у 2011 г. – 108 тыс. У раёнах кампактнага пражывання кашубаў ужываюцца двухмоўныя ўказальнікі, шыльды і г. д. З 2014 г. у Гданьскім універсітэце з’явілася праграма навучання кашубскай этнафілалогіі. Кашубская мова вывучаецца ў школах, на ёй можна здаваць выпускныя іспыты. У 2012/2013 гг. кашубскую мову вывучала каля 15 тыс. чалвек. Кашубская культура мае даўнюю гісторыю. Пачатак кашубскага кнігадрукавання адносіцца да XVI ст. З XIX ст. існуе літаратурны рух. З кашубаў паходзіў



*Кашубы.*

знакаміты фалькларыст і этнограф *Міхал Федароўскі* (1853–1923), аўтар шматтомнай працы «Люд беларускі на Літоўскай Русі». У сваю чаргу, у 1980 г. у Мінску была выдадзеная анталогія кашубскай паэзіі ў перакладзе на беларускую мову пад назвай «За даляглядам край Сталемаў». Сёння кашубскую мову можна сустрэць у інтэрнэце, на ёй праводзяць набажэнствы, тэле- і радыёперадачы. Есць асобная кашубская радыёстанцыя. Кашубы ўтварылі вялікую колькасць грамадскіх арганізацый, у тым ліку Кашубскі Інстытут, сваю фундацыю, Кашубскі народны ўніверсітэт. Штогод праводзяцца кашубскія з'езды, летнія школы кашубскай мовы, разнастайныя конкурсы дзеля яе падтрымкі.

***Новыя змяшаныя дыялекты***

Па-за межамі традыцыйнага гісторыка-этнаграфічнага падзелу знаходзіцца прастора так званых *новых змяшаных дыялектаў*. Гаворка ідзе пра тэрыторыі на захадзе і поўначы Польшчы, якія былі далучаныя да яе пасля 1945 г. Тут сапраўды ўтварылася змяшанае насельніцтва, якое часткова складалася з карэнных палякаў, часткова – з мігрантаў з усходу, тых тэрыторый, што былі ўключаныя ў склад СССР, у тым ліку Беларусі, часткова – з мігрантаў з цэнтральнай часткі Польшчы, часткова – з украінцаў, якіх прымусова высялялі з усходняй часткі краіны (так званая акцыя «Вісла» ў 1947 г.). Мігранты прынеслі з сабою не толькі гаворку, але і элементы традыцыйнай культуры, перадусім – уласны фальклор.

## Падсумаванне

- Польшча вылучаецца высокім узроўнем этнічнай і канфесіянальнай гамагеннасці.
- Палякі разам з украінцамі знаходзяцца на другім месцы паводле сваёй колькасці сярод славянскіх народаў.
- Польская дыяспара – адна з самых вялікіх у свеце.
- Польскі народ складаецца з вялікай колькасці этнаграфічных і этнічных груп.

## Заданні

- Якім чынам склалася гамагеннасць насельніцтва Польшчы?
- Чым было выклікана ўтварэнне польскай дыяспары?

- Якім чынам польская дзяржава падтрымлівае сваіх суайчыннікаў за мяжой?
- Якія найбуйнейшыя гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны ёсць у Польшчы?
- Якім чынам утварыліся новыя змяшаныя дыялекты?

## 3.6. Нацыянальныя меншасці і этнічныя меншасці.

*Нацыянальныя і этнічныя меншасці. Немцы, украінцы, лемкі, славакі, чэхі, армяне, татары, караімы, літоўцы, цыганы, габрэі. Беларусы ў Польшчы.*

***Нацыянальныя і этнічныя меншасці***

Згодна з афіцыйнымі звесткамі, у Польшчы вылучаецца 9 нацыянальных (групы якія маюць сваю нацыянальную дзяржаву) і 4 этнічных (у якіх нацыянальнай дзяржавы няма) меншасцяў.

Найбуйнейшай нацыянальнай меншасцю з'яўляюцца *немцы*. Іх колькасць, згодна з перапісам 2011 г., складае 147 тыс. чалавек. Больш за палову з іх жыве ў Апольскім ваяводстве, значныя групы ёсць таксама ў Ніжняшлёнскім і Варміньска-Мазурскім ваяводствах. Вядома, што пераважная большасць немцаў была выселеная з Польшчы пасля 1945 г. Аднак частка немцаў нейкім чынам пазбегла дэпартацыі, прыхавала сваю нацыянальную прыналежнасць. Сёння немцы ў Польшчы маюць разгалінаваную грамадскую арганізацыю: 9 таварыстваў і каля 600 мясцовых аддзелаў. Дэпутаты ад нямецкай нацыянальнай меншасці маюць пастаяннае прадстаўніцтва ў польскім Сейме. У 2012/2013 гг. нямецкую мову вывучала больш за 37 тыс. чалавек, ёсць перыядычныя выданні, радыёстанцыі. Штогод праводзяцца агульнапольскія і мясцовыя фестывалі нямецкай культуры. Нямецкая меншасць падтрымлівае сувязі з Германіяй, шмат немцаў мае падвойнае грамадзянства.

Колькасць *украінцаў у* Польшчы складае каля 39 тыс. чалавек. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны большая частка ўкраінцаў, якія жылі на паўднёвым усходзе Польшчы, была пераселеная ў СССР. Астатнія былі прымусова выселеныя на поўнач падчас акцыі «Вісла» ў 1947 г. Менавіта таму сёння пераважная

большасць украінцаў жыве ў Вармінська-Мазурскім, Паморскім і Заходне-Паморскім ваяводствах, а толькі адносна невялікія групы – у Падляшскім і Люблінскім. Украінцы ў Польшчы ўтварылі шэраг грамадскіх арганізацый, у тым ліку Звяз украінцаў у Польшчы. Украінскую мову ў 2012/2013 гг. вывучала каля 2,7 тыс. чалавек, ёсць перыядычныя выданні і радыёперадачы.

Лёс *лемкаў*, этнічнай групы, што жыла ў Карпатах, шмат у чым нагадвае лёс украінцаў. Лемкі – усходнеславянская група, часткова праваслаўнага веравызнання, часткова – грэка-каталіцкага. Мова лемкаў блізкая да ўкраінскай, таму частка лемкаў мае падвойную, лемкаўска-ўкраінскую, ідэнтычнасць. Разам з тым, большасць лічыць сябе самастойным народам, блізкім да карпатарусінаў. Пасля Другой сусветнай вайны польскія камуністычныя ўлады палічылі лемкаў укріанцамі, таму большасць лемкаў была выселеная ў СССР, а тыя, хто засталіся, у 1947 г. былі дэпартаваныя на захад Польшчы. У 2011 г. каля 9,6 тыс. чалавек вызначылі сваю ідэнтычнасць як лемкаў. Большая частка з іх цяпер жыве



*Лемкі.*

ў Ніжняшлёнскім і Любускім ваяводствах, каля чвэрці – у так званай Лемкаўшчыне, у Малапольскім ваяводстве. Сёння лемкаўскую мову вывучае каля 300 чалавек, актыўна дзейнічаюць лемкаўскія згуртаванні, створаны правапіс, вядзецца праца над падручнікамі лемкаўскай мовы.

Колькасць *рускай нацыянальнай меншасці* ў Польшчы складае каля 9 тыс. чалавек. Большасць з іх складаюць мігранты нядаўняга часу: пасля 2002 г. колькасць рускіх павялічылася ў тры разы. На Сувалшчыне і ў Мазурах жыве нешматлікая група рускіх-старавераў, нашчадкаў перасяленцаў XVIII ст., якія, як і веткаўскія старaверы Беларусі, уцякалі ад жорсткага рэлігійнага ўціску ў Расійскай імперыі.

Колькасць *чэхаў* і *славакаў* у Польшчы складае, адпаведна, 2,8 тыс. і 2,7 тыс. чалавек. Перасяленні чэхаў у Польшчу пачаліся яшчэ ў XVI ст., калі яны шукалі прытулку ад рэлігійнага ўціску. У пачатку XX ст. мела месца працоўная міграцыя ў ваколіцы Лодзі. Славакі пераважна жывуць на тэрыторыі польска-славацкага памежжа.

На тэрыторыі Сувалшчыны жыве кампактная група *літоўцаў*. Усяго іх у Польшчы налічваецца 7,3 тыс. чалавек. У гміне Пуньск літоўцы складаюць 75 % насельніцтва. Асаблівасцю літоўцаў стала тое, што ў мясцовых школах выкладанне вядзецца выключна па-літоўску. Гэта адзіны такі прыклад ва ўсёй сучаснай Польшчы.

Нешматлікімі, аднак характэрнымі этнічнымі групамі з'яўляюцца *армяне* (1,6 тыс. чалавек) і *караімы* (0,3 тыс.). Армяне пасяліліся на тэрыторыі заходняй Украіны, у Камянец-Падольску і Львове яшчэ ў XIV ст. Караімы – народ цюркскага паходжання, які жыў у Крыме. Веравызнанне караімаў блізкае, але не тоеснае іўдаізму. У часы вялікага князя Вітаўта частка караімаў перасялілася ў ваколіцы Луцка і Трокаў. Пасля 1945 г. частка армян і караімаў была перaселеная ў Польшчу.

З XIV ст. на тэрыторыі Польшчы жывуць *татары*. Сёння іх колькасць складае 1,8 тыс. чалавек. Значная частка іх жыве ў Падляшскім ваяводстве. У Баханяках і Крушынянах дзейнічаюць мячэці; выдаюцца часопісы, праводзяцца дні татарскай культуры на Падляшшы. У гданьскай Аруні ўсталяваны помнік «ваяру-татарыну».

Дастаткова вялікую колькасць мае этнічная група *цыганоў* (ромаў) – 16,7 тыс. чалавек. Цыганы з’яўляюцца ў Польшчы з пачатку XV ст. У канцы 1930-х гг. у Польшчы жыло да 30 тыс. цыганоў. Значная частка іх была знішчаная падчас нямецка-фашысцкай акупацыі. У 1960-х гг. польскія камуністычныя ўлады праводзілі палітыку прымусу цыганоў да аселага ладу жыцця. Таму сёння цыганы жывуць пераважна ў буйных гарадах Польшчы. Дзейнічае больш за 80 грамадскіх аб’яднанняў цыганоў.

Вельмі трагічна склаўся лёс польскіх *габрэяў*. На працягу стагоддзяў яны былі найбуйнейшай нацыянальнай меншасцю Польшчы. Пачатак іх перасялення адносіцца да XIII ст. У пачатку XX ст. габрэі ў Польшчы, падобна як і ў Беларусі, складалі каля 10 %, а ў гарадах – да 50 % ад агульнай колькасці насельніцтва. Напярэдадні Другой сусветнай вайны ў Польшчы жыло да 3,5 млн. габрэяў. Больш за 90 % з іх было знішчана нацыстамі. Дзеля гэтага былі пабудаваныя спецыяльныя лагеры смерці, самым буйным сярод якіх быў Асвенцім (па-нямецку *Аўшвіц*), недалёка ад Кракава.



*Музей гісторыі польскіх яўрэеў у Варшаве.*

Пасля Другой сусветнай вайны ў Польшчы засталося каля 300 тыс. габрэяў. У 1950–1960-х гг. значная колькасць габрэяў эміґравала ў Ізраіль. Шмат у чым гэта было звязана з афіцыйнай палітыкай барацьбы супроць сіянізму, якая ў сапраўднасці мела антысеміцкі характар. Згодна з перапісам 2002 г., у Польшчы было ўсяго 1055 габрэяў. Апошні перапіс зафіксаваў значнае павелічэнне іх колькасці – да 7,3 тыс. чалавек. Пасля 1989 г. значна актывізавалася культурнае і грамадскае жыццё. Сімвалічнай падзеяй стала стварэнне Музея гісторыі польскіх габрэяў у Варшаве, адкрытага ў 2013 г.

***Беларусы ў Польшчы***

Беларусы складаюць колькасна другую, пасля немцаў, нацыянальную меншасць у Польшчы. Згодна з перапісам 2011 г., да беларусаў сябе аднесла 43 880 чалавек. Пераважная большасць беларусаў (88,5 %) жыве на тэрыторыі Падляшскага ваяводства. Пры гэтым у 12 гмінах беларусы складаюць больш за 20 % насельніцтва, а ў чатырох з іх (Гайнаўскай, Арлянскай, Дубіцкай і Чыжоўскай) – абсалютную большасць.

Беларусы з'яўляюцца карэнным, аўтахтонным насельніцтвам усходняга Падляшша, якое на працягу стагоддзяў было польска-беларускім культурным памежжам. На гэтай тэрыторыі нарадзіліся пачынальнікі беларускага нацыянальнага адраджэння пачатку XIX ст. *Міхаіл Баброўскі* і *Ігнат Даніловіч*.

Лёс беларусаў у Польшчы пасля Другой сусветнай вайны не быў простым. Толькі пасля 1956 г. склаліся ўмовы для актывізацыі грамадскага жыцця. У гэты час былі створаныя Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), кафедра беларускай філалогіі ў Варшаўскім універсітэце, беларускія ліцэі ў Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы; пачалі выдавацца газета «Ніва» і «Беларускі каляндар», распачало сваю дзейнасць літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Белавежа». Чарговая актывізацыя стала магчымая на мяжы 1980–1990-х гг., калі былі актывізаваныя Рада беларускіх арганізацый у Польшчы, Беларускае грамадска-культурнае таварыства (сёння – самае масавае грамадскае аб'яднанне) , Беларускае згуртаванне студэнтаў, Асацыяцыя беларускіх журналістаў, Беларускае гіста-



*Гайнаўскі музей помнікаў беларускай культуры.*

рычнае таварыства і шэраг іншых. Значнымі падзеямі стала заснаванне штогадовага Свята беларускай культуры ў Беластоку (1985), беларускага штогадовага фэсту рок-музыкі «Басовішча» (1990), адкрыццё Гайнаўскага музея помнікаў беларускай культуры (1990).




*Фэст рок-музыкі «Басовішча».*

*Сабор св. Тройцы ў Гайнаўцы.*



Сёння беларуская мова выкладаецца ў трох ліцэях (у Беластоку, Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы), 17 гімназіях і 25 пачатковых школах. Цэнтры беларусістыкі ёсць у Люблінскім Універсітэце імя М. Кюры-Складоўскай і ў Беластоцкім універсітэтце. У 2007–2010 гг. гарадская Рада Гайнаўкі, рады гмін Орля, Чыжы, Нараўка і Гайнаўка прынялі рашэнне аб увядзенні беларускай мовы ў якасці дапаможнай у справаводстве. Трэба падкрэсліць, што такім правам у Польшчы, апроч беларусаў, карыстаюцца толькі кашубы, немцы і літоўцы.



*Будынак Беларускага грамадска-культурнага цэнтра ў Беластоку..*

Беларусы ў Польшчы маюць шэраг перыядычных выданняў: штотыднёвік «Ніва», штомесячнае выданне «Часопіс», навуковы часопіс «Беларускія гістарычныя сшыткі», альманах «Annus Albaruthenicus», літаратурны часопіс «Тэрмапілы» і інш. Беларускае электронныя медыя

прадстаўленая Беларускай рэдакцыяй Польскага радыё, радыё «Рацыя», беларускай рэдакцыяй «Радыё Беласток», спадарожнікавым каналам «Белсат», беларускім аддзелам «Телебачання Беластоку», разнастайнымі інтэрнэт-старонкамі.

Адметнай з’явай апошніх дзесяцігоддзяў стаў выхад беларускай грамадскай актыўнасці за межы Падляшскага рэгіёну: беларускія згуртаванні з’явіліся ў Ольштыне, Гданьску і Лодзі.

## Падсумаванне

- У Польшчы афіцыйны статус маюць 13 нацыянальных меншасцяў і этнічных груп.
- Нацыянальныя меншасці і этнічныя групы карыстаюцца правамі культурнай аўтаноміі.
- Найбольш правоў маюць нацыянальныя меншасці немцаў, літоўцаў і беларусаў.
- Культурнае і грамадскае жыццё беларусаў у Польшчы значна актывізавалася ў канцы 1980–1990-х гг.

## Заданні

- Як склаўся лёс украінцаў і лемкаў у пасляваеннай Польшчы?
- Чым падобны лёс польскіх габрэяў і цыганоў?
- Чаму беларусы ў Польшчы атрымалі права на ўвядзенне беларускай мовы ў якасці дапаможнай у афіцыйнай сферы?
- Якія навучальныя ўстановы і сродкі масавай інфармацыі маюць беларусы Польшчы?

# 4. ГАСПАДАРКА

## Агульная характарыстыка гаспадаркі Польшчы

*Месца Польшчы ў сучаснай сусветнай гаспадарцы. Асноўныя паказчыкі гаспадарчага развіцця.*

Эканоміка Польшчы – адна з самых паспяховых сярод былых сацыялістычных краін. Не сённяшні дзень яна займае 6-е месца ў Еўрасаюзе (пасля Іспаніі) і 25-е – у свеце. Абсалютны аб’ём валавога ўнутранага прадукту (ВУП) склаў тут у 2015 г. 1077 млрд. дол. ЗША (паводле парытэту пакупніцкай здольнасці). Гэта прыкладна ў 6,4 раза болей за ВУП нашай краіны. Большую частку ВУП дае сфера паслуг – 55,6%, прамысловасць – 41,1%, сельская гаспадарка – 3,3%.

З 1992 г. эканоміка Польшчы дэманструе бесперапынны прырост валавога ўнутранага прадукту. У часы сусветнага эканамічнага крызісу 2008–2009 гг. Польшча была адзінай краінай Еўрасаюза, якая пазбегла спаду вытворчасці.

Разам з тым, у эканамічным жыцці яшчэ шмат складаных праблем. Паводле ВУП на душу насельніцтва Польшча займае 68 месца ў свеце. Гэта прыкладна адпавядае ўзроўню Партугаліі і Грэцыі. Захоўваецца адносна высокі ўзровень беспрацоўя, празмерна вялікая колькасць занятых у сельскай гаспадарцы; не адпавядае сучасным патрабаванням транспартная інфраструктура. Ёсць сур’ёзныя экалагічныя праблемы.

## 4.1. Здабыча мінеральных рэсурсаў

*Паліўныя карысныя выкапні. Каменны і буры вугаль. Здабыча нафты і газу. Рудныя карысныя выкапні. Здабыча медзі, волава, цынку, каштоўных металаў. Мінеральныя рэсурсы хімічнай прамысловасці. Мінеральныя рэсурсы будаўнічай сферы.*

Здабыча мінеральных рэсурсаў адыгрывае істотную ролю

ў эканамічным развіцці Польшчы. Гэтая роля не можа быць трактаваная адназначна. Польшча мае разнастайны набор карысных выкапняў, але частку мінеральных рэсурсаў яна завозіць з-за мяжы. Не ўсе карысныя выкапні выкарыстоўваюцца ў роўнай ступені. Эканамічныя рэформы, уступленне краіны ў Еўрасаюз, развіццё новых тэхналогій моцна ўплывае на гэтую галіну эканомікі.

***Паліўныя карысныя выкапні***

Польшча мае вялізныя запасы каменнага вугалю ў памеры 56 млрд. т. Гэта прыкладна каля 5 % усіх запасаў яго ў свеце. Пачатак прамысловай здабычы адносіцца да сярэдзіны XVIII ст.: у 1740 г. у Шлёнску была створаная першая шахта «Макуцкі». З 1870-х гг. здабыча вугалю павялічвалася ўдвая кожныя 10 гадоў. У 1980-х гг. здабыча вугалю дасягнула піку – 190–200 млн. т у год. У гэты перыяд Польшча займала 4 месца ў свеце па аб’ёмах здабычы пасля Кітая, ЗША і СССР. Вугальная індустрыя перажыла драматычная змены ў апошнія дзесяцігоддзі: у 2015 г. было здабыта толькі 73 млн. т. У 1990-х гг. былі адмененыя дзяржаўныя датацыі, рэнтабельнасць здабычы значна знізілася, што прывяло да закрыцця прыкладна паловы шахтаў. Каменнаму вугалю было цяжка вытрымліваць канкурэнцыю з больш танным газам; скарачэнню здабычы садзейнічала і энергетычная палітыка Еўрасаюза, а таксама – ска-



*Здабыча каменнага вугалю ў Пшэцішуве (Шлёнскае ваяводства).*

рачэнне вытворчасці ў металургічнай прамысловасці. Сёння здабыча каменнага вугалю вядзецца пераважна ў Верхняшлёнскім каменнавугальным басейне, у Ніжняшлёнскім яна цалкам спыненая, у Люблінскім – працуе толькі адна шахта. Большая частка каменнага вугалю выкарыстоўваецца ў энергетычнай сферы, рэшта – на вытворчасць коксу.

У адрозненне ад каменнага вугалю, здабыча бурага вугалю (лігніту) стабільна знаходзіцца на прыкладна аднолькавым узроўні на працягу апошніх 25 гадоў. У 2014 г. аб’ём здабычы склаў 63,9 млн. т. Галоўнае радовішча яго знаходзіцца каля Бэлхатава ў Лодзінскім ваяводстве. Тут здабываецца 67 % лігніту ў Польшчы. Энергетычная якасць бурага вугалю значна меншая ў параўнанні з каменным. Аднак ён залягае на невялікай глыбіні – да 350 м. Распрацоўка вядзецца адкрытым спосабам. Таму сабекошт энергетычнай адзінкі лігніту ў два разы меншы за вугаль каменны. Запасы бурага вугалю складаюць больш за 23 млрд. т. Пры сённяшнім узроўні здабычы гэтых запасаў павінна хапіць сама меней на 300 гадоў. Апроч Бэлхатава, здабыча вядзецца ў Туруве (Ніжняшлёнскае ваяводства), Адамуве і Коніне (Вялікапольскае ваяводства). Лігніт выкарыстоўваецца выключна ў якасці энергетычнай сыравіны.



*Здабыча бурага вугалю ў Бэлхатаве.*

*Здабыча нафты на радовішчы Жарновец.*



Здабыча нафты мае ў Польшчы даўнюю традыцыю. Лічыцца, што эксплуатацыя першай у свеце нафтавай свідравіны пачалася ў 1854 г. каля вёскі Бубрка на тэрыторыі сучаснага Падкарпацкага ваяводства. Гэта была ініцыятыва Ігната Луксевіча, фармацэўта, прадпрымальніка, вынаходніка газавай лямпы. Асноўнымі цэнтрамі нафтаздабычы з'яўляюцца: рэгіёны Падкарпацця, заходняй часткі поясу нізін, а таксама – шэльф Балтыйскага мора. Найбуйнейшым лічыцца радовішча Барануўка-Мостна-Бушэва, якое знаходзіцца на мяжы Заходне-Паморскага і Любускага ваяводстваў. Агульны аб'ём здабычы ў Польшчы параўнальна невялікі і складае ўсяго каля 0,9 млн. т у год. Гэта забяспечвае меней за 4% патрэб польскай гаспадаркі.

У адрозненне ад нафты, радовішчы газу маюць значна большыя запасы. У 2014 г. у Польшчы было здабыта 5,6 млрд. м$^3$ газу, што складае больш за 38 % унутранага яго спажывання. Радовішчы газу сустракаюцца прыкладна ў тых самых месцах дзе ёсць нафта. У заходняй часткі польскіх нізін здабываецца 68,5 % усяго газу, у Падкарпацці – 26,5%, на шэльфе Балтыйскага мора – 1 %. Апроч падземнага газу, у Польшчы вядзецца здабыча метану, які назапашваецца ў адпрацаваных вугальных шахтах. Аб'ёмы здабычы параўнальна невялікія – каля 0,32 млрд. м$^3$.

### *Здабыча металічных руд*

Польшча ў неаднолькавай ступені забяспечана металічнымі рудамі. Сапраўдным скарбам Польшчы з'яўляюцца багатыя радовішчы медзі. Большая частка іх знаходзіцца ў Легніцка-Глогуўскім рудным басейне ў Ніжняшлёнскім ваяводстве. Здабыццём медзі займаецца дзяржаўнае прадпрыемства «Польская медзь», якое адносіцца да ліку стратэгічных. Апроч гэтага, здабыча медзі вядзецца на адгор'ях Судэтаў, у раёне Баляслаўца і Златапрыя і ў Свентакшыжскіх гарах. У 2015 г. у Польшчы было здабыта 32,6 млн. т меднай руды. Узровень здабычы стабільны і на працягу 10 год практычна не мяняецца. Польшча займае другое месца ў Еўропе і восьмае ў свеце паводле аб'ёмаў здабычы меднай руды. Звычайна ў рудах медзі знаходзяцца дамешкі іншых металаў, у тым ліку ванадыю, селену, нікелю і срэбра. Іх здабычай таксама займаецца прадпрыемства «Польская медзь». У 2012 г. Польшча выйшла на шостае месца ў свеце, пасля Чылі, па ўзроўні здабычы срэбра, якая склала 1156 т.

Самае вялікае радовішча алавяных і цынкавых руд знаходзіцца ў Малапольскім ваяводстве каля Олькуша. Здабыча руды тут пачалася яшчэ ў XIX ст. Значная частка радовішчаў ужо вычарпана. З пяці шахтаў чатыры ўжо зачынены. Цяпер здабыча вядзецца на шахце Памажаны ў аб'ёме звыш 2 млн. т руды ў год. Руды знаходзяцца на параўнальна невялікай глыбіні, што робіць іх здабычу эканамічна мэтазгоднай.

Здабыча жалезных руд мае даўнюю традыцыю. Яна пачалася не пазней як у XIII ст. Цэнтры здабычы жалезных руд знаходзіліся каля Чанстаховы, Клобуцка, Ленчыцы, Старахавіцаў і Коньске. Большая частка гэтых радовішчаў ужо вычарпаная, а здабыча спыненая. Разведанае радовішча металічных (жалеза, тытану і ванадыю) руд на Сувалшчыне (так заваная Сувалкаўская магнітная анамалія). Аднак яны знаходзяцца на вялікай глыбіні, што на сённяшні дзень робіць здабычу эканамічна немэтазгоднай. Патрэбы металургічных камбінатаў задавальняюцца за кошт імпарту жалезнай руды са Швецыі і Украіны.

Разведанае радовішча руд каляровых металаў каля Мышкава

ў Шлёнскім ваяводстве. Радовішча змяшчае каля 550 млн. т руды малібдэну, вальфраму і медзі. Распрацоўка яго яшчэ не пачыналася.

### *Здабыча мінеральных рэсурсаў для хімічнай прамысловасці*

У другой палове XX ст. Польшча займала вядучае месца ў свеце паводле здабычы серы. Сера патрэбная для вытворчасці паперы, сінтэтычнага каўчуку, штучных угнаенняў, тканін, пластмасаў, выбуховых рэчаваў. Унікальнае яе радовішча ў самародным (натуральным) стане знаходзіцца каля Тарнабжэга ў Падкарпацкім ваяводстве. У пачатку 1990-х гг. яно штогод давала каля 4,6 млн. т серы, гэта значыць – каля 45 % сусветнай здабычы. Аднак вынаходніцтва новых тэхналогій атрымання серы ў працэсе ачысткі нафты ад прымесяў у 1990-х зрабіла яе здабычу ў Тарнабжэгу нерэнтабельнай. Сёння яе здабыццё ў Польшчы вядзецца толькі ў радовішчы Асіек у Свентакшыжскім ваяводстве. Гэта адзінае радовішча ў свеце, у якім здабыча вядзецца метадам падземнага плаўлення. Гадавы аб'ём здабычы складае 0,6 млн. т.

Здабыча каменнай солі ў Польшчы сёння вядзецца каля Кладавы ў Вялікапольскім ваяводстве і паблізу Інаўроцлава – у Куяўска-Паморскім. Каменная соль неабходная для збалансаванага харчавання, але большая частка яе выкарыстоўваецца ў хімічнай прамысловасці для вырабу соды, хлору, салянай кіслаты. Яна таксама патрэбная ў якасці рэагенту для чысткі дарог ад снегу і льду зімою. Усяго распрацоўваецца 6 радовішчаў. Агульны аб'ём здабычы складае 3,5 млн. т у год (2015).



*Здабыча каменнай солі ў Кладаве.*

### *Мінеральныя рэсурсы будаўнічай прамысловасці*

Сярод карысных выкапняў, неабходных для будаўнічай прамысловасці, найбольшае значэнне мае распрацоўка даламітаў, гіпсу, вапны, гліны, пяску і жвіроў.

Даламіты выкарыстоўваюцца ў вытворчасці вогнеўпораў, металаў, шкла, а таксама ў сельскай гаспадарцы – для зніжэння ўзроўню кіслотнасці глебы. Радовішчы даламітаў у Польшчы знаходзяцца ў Замбкавіцах і Брудзавіцах у Шлёнскім ваяводстве. Агульны аб'ём здабычы складае 2,9 млн. т у год.

Гіпс шырока выкарыстоўваецца ў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Ён з'яўляецца неабходным кампанентам вытворчасці цэменту. Здабываецца каля Радлаўкі ў Ніжняшлёнскім ваяводстве. Гадавыя аб'ёмы здабычы складаюць каля 1 млн. т.

Вапна з'яўляецца галоўным рэсурсам для вытворчасці цэменту. Здабыча яе вядзецца ў Свентакшыжскім (каля ½ усёй здабычы), Апольскім (да 20 %) і Куяўска-Паморскім (14 %) ваяводствах. Усяго штогод здабываецца каля 43 млн. т вапны. Найбуйнейшыя радовішчы глін знаходзяцца ў Будзе-Мшчаноўскай у Мазавецкім, Гневе і Букове ў Паморскім ваяводствах.



*Здабыча вапны.*

Гліна выкарыстоўвацца перадусім для вытворчасці цэглы і ў якасці кампанента цэменту. Гадавы аб'ём яе здабычы складае каля 3,3 млн. т. Пяскі і жвіры шырока ўжываюцца пры ўзвядзенні будынкаў і ў будаўніцтве дарог. Радовішчы іх шырока распаўсюджаныя ў Польшчы. Найбольшыя знаходзяцца

ў Падляшскім ваяводстве: у Брудзе Новым, і Кукаве-Фальварку. Штогод здабываецца звыш 167 млн. т пяску і жвіроў.

## Падсумаванне

- Найбольш каштоўнымі карыснымі выкапнямі Польшчы з'яўляюцца радовішчы руд каляровых металаў, каменнага і бурага вугалю, каменнай солі, мінеральных рэсурсаў будаўнічага комплексу.
- У Польшчы не хапае жалезных руд, нафты і газу, якія імпартуюцца з-за мяжы.
- Роля здабычы шэрагу мінеральных рэсурсаў істотным чынам змянілася ў XX – пачатку XXI ст.
- Польшча цалкам забяспечаная мінеральнымі рэсурсамі, неабходнымі для будаўнічай сферы.

## Заданні

- Параўнайце забяспечанасць мінеральнымі рэсурсамі Польшчы і Беларусі. Што ў гэтым дачыненні ёсць падобнага і ў чым палягаюць адрозненні?
- Якім чынам змянялася роля здабычы каменнага вугалю ў Польшчы ў XX – пачатку XXI ст. Чаму гэта адбылося?
- Якімі мінеральнымі рэсурсамі Польшча забяспечана ў поўнай ступені?
- Якія мінеральныя рэсурсы Польшча павінна завозіць з іншых краін?

## 4.2. Прамысловасць

*Энергетыка. Металургічная прамысловасць. Змены ў развіцці чорнай металургіі. Каляровая металургія. Апрацоўчая прамысловасць. Машынабудаванне. Транспартнае машынабудаванне. Аўтамабільная прамысловасць. Электратэхнічная прамысловасць. Вытворчасць электронікі. Хімічная прамысловасць. Лёгкая прамысловасць і дрэваапрацоўка.*

### *Энергетыка*

Агульны аб'ём вытворчасці электраэнергіі ў Польшчы складае каля 160 млрд. кВт×г у год (2014). Аб'ёмы вытворчасці энергіі значна павялічыліся ў пачатку 1990–2006 гг.: з 136 да 160 млрд. кВт×г у год. Пасля гэтага вытворчасць застаецца прыкладна на адным і тым самым узроўні: 158–164 млрд. кВт×г у год. Частка электраэнергіі пастаўляецца на экспарт у Германію, Швецыю, Чэхію і Славакію.

Звыш 90 % электраэнергіі выпрацоўваецца на *цеплавых электрастанцыях*. Большая частка электраэнергіі ствараецца за кошт спальвання каменнага вугалю (46,5 %) і лігніту (32,2 %). За кошт газу – толькі 3 %. Астатняе (13,7 %) – за кошт узнаўляльных крыніц энергіі: на гідра- і ветравых электрастанцыях.



*Электрастанцыя ў Бэлхатаве – найбуйнейшая цеплавая электрастанцыя ў Еўропе.*

Пераважная большасць энергетычных прадпрыемстваў максімальна набліжаная да крыніц сыравіны. Найбольш вядомы прыклад – найбуйнейшая ў Еўропе цеплавая і найбуйнейшая ў свеце электрастанцыя на бурым вугалі ў Бэлхатаве, размешчаная непасрэдна каля месца здабычы. Магутнасць Бэлхатаўскай электрастанцыі складае 5420 МВт. На бурым выгалі працуюць таксама цеплавыя электрастанцыі ў Адамаве і Коніне, сумарнай магутнасцю 2512 МВт, і ў Туруве – 1498 МВт.

Самая магутная электрастанцыя на каменным вугалі размешчаная ў Казеніцы ў Мазавецкім ваяводстве (2820 МВт). Але найбольшая канцэнтрацыя такіх электрастанцый – у Шлёнскім і Малапольскім ваяводствах, у тым ліку ў Рыбніку (1775 МВт), Явожне (1345 МВт), Лазіску (1155 МВт).

Самая магутная *гідраэлектрастанцыя* знаходзіцца каля Жарноўца (800 МВт) у Паморскім ваяводстве. Частка гідраэлектрастанцый пабудаваная на горных рэках у Падкарпацкім рэгіёне, частка на раўнінных: напрыклад, ва Улацлаўку на Вісле. Агулам 26 гідраэлектрастанцый у Польшчы выпрацавалі 2,4 млрд. кілават-гадзін у 2014 г. *Ветравыя* электрастанцыі размешчаны на



*Ветравая электрастанцыя ў Паўлове.*

ўзбярэжжы і ў поясе нізін, там, дзе дзьмуць вятры адносна моцныя і пастаянныя. У 2016 г. у Польшчы дзейнічала каля 170 ветравых электрастанцый. Самыя моцныя маюць магутнасць да 120 МВт – напрыклад у Маргоніне ў Вялікапольскім ваяводстве. У 2013 г. ветравыя электрастанцыі выпрацавалі 3,6 % усёй электраэнергіі ў Польшчы. *Сонечныя* электрастанцыі размешчаны на ўсёй тэрыторыі краіны. У 2016 г. разам былі 874 сонечных электрастанцый і 70 сонечных калектараў. Пераважная большасць іх мае невялікую магутнасць па некалькі кілават. Самая вялікая знаходзіцца ў Падляскім «Сонечным парку»: плануецца, што яе сумарная магутнасць павінна неўзабаве дасягнуць 5 МВт.

***Металургія***

*Чорная металургія* мае даўнія традыцыі ў Польшчы. Пачатак яе развіцця адносіцца да XVIII ст. у Старапольскім прамысловым рэгіёне, на тэрыторыі сучаснага Свентакшыжскага ваяводства. У XIX ст. цэнтр чорнай металургіі змясціўся ў Верхняшлёнскі прамысловы рэгіён. Найвышэйшага ўзроўню развіцця чорная металургія дасягнула ў 1960–1980-х гг. У гэтыя часы былі пабудаваныя тры найбуйнейшыя на сённяшні дзень металургічныя камбінаты ў Польшчы: у Дамброве Гурнічай (найбуйнейшы камбінат «Катавіцы»), Кракаве і Варшаве. Піку развіцця чорная металургія дасягнула ў 1980-х гг., калі аб'ёмы вытворчасці складалі 19,5 млн. т сталі ў год. Пасля 1992 г. адбылося значнае скарачэнне вытворчасці – да 8,8 млн. т у 2014 г. Яно было выклікана нізкай канкурэнтаздольнасцю польскай чорнай металургіі, абумоўленай высокімі выдаткамі на атрыманне энергіі, нізкай якасцю ў параўнанні з заходнееўрапейскай прадукцыяй, а таксама агульным скарачэннем попыту на сталь на польскім рынку ў выніку рэструктурызацыі прамысловасці.

З прадпрыемстваў *каляровай металургіі* ў найлепшым становішчы сёння знаходзіцца вытворчасць медзі і каштоўных металаў, сканцэнтраваная ў Легніцка-Глогуўскім рудным басейне. Штогод тут выплаўляецца да 500 тыс. т медзі, 1000–1200 т срэбра, да 0,9 т золата і 0,09 т – паладыю і плаціны. Каля паловы медзі экспартуецца. Аб'ёмы вытворчасці застаюцца прыкладна



*Выплаўка медзі на металургічным камбінаце ў Легніцы.*

аднолькавымі на працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў. Разам з тым аб’ёмы вытворчасці цынку і волава значна скараціліся – з 217 тыс. т у 1980 г. да 123 тыс. т у 2014 г. , што было звязана са скарачэннем попыту на яго на знешнім рынку. У 1950 – 1960-х гг. у Польшчы была запачаткаваная выплаўка алюмінію. Радовішчаў баксітаў у Польшчы няма, таму іх увозілі з Венгрыі. Вытворчасць алюмінію патрабуе вялікай колькасці электраэнергіі, таму яно было размешчанае паблізу буйных электрастанцый – напрыклад, у Коніне. Вытворчасць алюмінію скарацілася больш як у 10 разоў на працягу 1980 – 2014 гг.: з 95 да 9,4 тыс. т.

***Апрацоўчая прамысловасць***

Машынабудаванне застаецца адной з вядучых галін польскай прамысловасці і, наогул, эканомікі. За апошнія 25 гадоў яно прайшло праз драматычныя змены.

Да машынабудавання ў Польшчы адносіцца вытворчасць абсталявання для горназдабыўной, металургічнай, уласна машынабудаўнічай, тэкстыльнай і інш. прамысловасці. Яно размешчанае пераважна ў Верхняшлёнскім прамысловым рэгіёне, а таксама ў буйных гарадах – Варшаве, Познані, Бельска-Бялай, Быдгашчы, Эльблянгу. Да ліку найбуйнейшых у гэтай галіне адносіцца прадпрыемства канцэрна СіЭнЭйч (CNH) у Плоцку (будаўнічая і сельскагаспадарчая тэхніка), канцэрна «Альстом» у Варшаве, Уроцлаве і Эльблянгу (турбіны для цеплавых электра-

станцый), «Копэкс» у Катавіцах (абсталяванне для горназдабыўной прамысловасці), Група «Фамур» у Катавіцах (камбайны для вуглездабычы, абсталяванне для здабычы нафты і газу). Машынабудаванне адносіцца да дынамічнай часткі польскай прамысловасці. Прырост вытворчасці ў апошнія гады складае 9–10 % штогод.

Таксама вельмі хутка развіваецца ў апошнія дзесяцігоддзі *аўтамабільная прамысловасць*. Вытворчасць легкавых аўтамабіляў ажыццяўляецца на прадпрыемствах «Фольксваген» у Познані і Ужэсні (Вялікапольскае ваяводства), «Джэнерал Мотарс» у Тыхы, Бельска-Бялай («Фіат») і Глівіцах («Опель») у Шлёнскім ваяводстве. Самае вялікае з іх – прадпрыемства ў Тыхы, на якім у 2015 г. 302 тыс. аўтамабіляў, большасць якіх (253 тыс.) былі пастаўленыя на экспарт. Пік вытворчасці легкавікоў быў дасягнуты ў 2008 г., калі аб'ём вытворчасці дасягнуў 842 тыс. такіх аўтамабіляў.

На прадпрыемствах карпарацыі МАН у Познані і Старахавіцах (Свентакшыжскае ваяводства) вырабляюць аўтобусы, у Непаламіцах пад Кракавам – грузавыя аўтамабілі. Зборка



*Аўтамабільны канвеер на заводзе «Опель» у Глівіцах.*

аўтобусаў ажыццяўляецца на заводзе канцэрна «Вольва» ва Уроцлаве, «Сканія» – у Слупску (Паморскае ваяводства) і «Саларыс» – у Балехаве каля Познані (Вялікапольскае ваяводства). Грузавыя фургоны Крафтар вырабляюць на заводах «Фольксваген» у Познані і Ужэсні. Усяго ў 2014 г. у Польшчы было выраблена 5 тыс. аўтобусаў і 116 тыс. грузавых аўтамабіляў.

Польшча мае даўнія традыцыі вытворчасці *цягнікоў і чыгуначных вагонаў*. Яна пачалася яшчэ ў першай палове XIX ст. Буйныя прадпрыемствы гэтай галіны працавалі ў 1940–1980-х гг. Падчас правядзення рынкавых рэформаў шмат якія з іх атрымалі інвестыцыі вядучых карпарацый свету. Сёння вытворчасць цягнікоў і вагонаў вядзецца на прадпрыемствах канцэрну «Бамбард'ер» ва Уроцлаве (лакаматыў «Тракс», двухпавярховыя вагоны, вагоны метро, трамваі), «Альстом» у Хожуве ў Шлёнскім ваяводстве (вагоны метро, трамваі), ПЭСА ў Быдгашчы (цягнікі), «Нэваг» у Глівіцах (цягнікі) і г. д. Значная частка прадукцыі экспартуецца.

Традыцыйна значнай галіной машынабудавання Польшчы было *суднабудаванне*, размешчанае ў партовых гарадах Гданьску, Гдыні, Шчэціне і Свінауйсьці. Да сярэдзіны 2000-х гг. Польшча была сярод найбуйнейшых вытворцаў марскіх судоў у Еўропе



*Суднаверф у Гданьску.*

(на другім месцы) і свеце ( на пятым). Агульны аб'ём вытворчасці ў 2005 г. склаў 55 суднаў водазмяшчэннем 722 тыс. т. Аднак у пачатку 2010-х гг. галіна перажыла сапраўдную катастрофу: аб'ём вытворчасці ў 2013 г. скараціўся ў 77 разоў. Цяпер робяцца захады па выратаванні прадпрыемстваў, вытворчасць аднаўляецца, але яе аб'ёмы ўсё яшчэ далёкія ад ранейшых.

Асноўныя напрамкі развіцця *электратэхнічнай і электроннай галіны* – вытворчасць абсталявання, у першую чаргу электрычных кабеляў і бытавой тэхнікі. Вытворчасцю кабеляў займаецца шэраг буйных прадпрыемстваў, у тым ліку «Тэле-Фоніка Кабле» ў Кракаве, якое займае чацвёртае месца ў Еўропе паводле аб'ёму продажаў. Сетка прадпрыемстваў карпарацыі «Філіпс» вырабляе прыборы і абсталяванне для мантажу асвятлення (сядзіба ў Піле, Вялікапольскае ваяводства). У другой палове 2000-х гг. Польшча стала адным з найбуйнейшых вытворцаў тэлевізараў у Еўропе. Пік вытворчасці быў дасягнуты ў 2010 г., калі было зроблена 26,3 млн. тэлевізараў. Гэтая галіна ўключае ў сябе прадпрыемствы карпарацыі LG ва Уроцлаве і Млаве (Мазавецкае ваяводства), «Шарп» у Торуні, «Філіпс» у Гожуве Вялікапольскім. Падобным чынам у Польшчы хуткімі тэмпамі развіваецца вытворчасць бытавой тэхнікі. У 2015 г. было зроблена каля 3,5 млн. халадзільнікаў, 6,5 млн. пральных і 4,3 млн. посудамыйных машын. Большая частка прадукцыі ідзе на экспарт. Вытворчасць ажыццяўляецца на прадпрыемствах канцэрнаў «Самсунг», «Бош-Сіменс», «Электралюкс».

***Хімічная прамысловасць***

Хімічная вытворчасць дае 10 % кошту штогадовай прамысловай прадукцыі Польшчы. У ёй занята больш за 200 тыс. чалавек. Найбуйнейшыя цэнтры *нафтаперапрацоўкі* размешчаныя ў Гданьску (6,2 млн. т нафты ў год) і Плоцку (14,2 млн. т). Усяго ў Польшчы штогод перапрацоўваецца 25–26 млн. т нафты. *Азотныя ўгнаенні* вырабляюць на прадпрыемствах у Пулавах (Мазавецкае ваяводства), Паліцах (Заходне-Паморскае ваяводства), Кендзежыне-Козьле (Апольскае ваяводства) і Тарнуве (Малапольскае ваяводства). Агульны аб'ём вытворчасці азотных угнаенняў складае 1,9 млн. т (2014). За апошнія 15 гадоў вытворчасць вырасла больш

*Нафта-перапрацоўчы камбінат канцэрна «Лотас» у Гданьску.*



чым на 23 %. У Тарнабжэгу побач з радовішчамі серы існуе вытворчасць *сернай кіслаты*. Аб'ёмы вытворчасці скарачаюцца, у 2014 г. яны склалі 1,7 тыс. т. Цэнтры *гумавай вытворчасці* размешчаныя ў Познані, Дэмбіцы (Падкарпацкае ваяводства) і Ольштыне (Варміньска-Мазурскае ваяводства). Агульны аб'ём вытворчасці складае 46,7 млн. аўтамабільных шын у год. *Хімічныя валокны* выpабляюць у Лодзі і Торуні. У 2014 г. было выраблена 46 тыс. т валокнаў. У параўнанні з 1980 г. аб'ём вытворчасці скараціўся больш чым у 5 разоў.

Цэнтры *фармацэўтычнай прамысловасці* размешчаны ў буйных гарадах: у Варшаве, Кракаве, Познані і Гданьску. Прадпрыемствы збольшага з'яўляюцца ўласнасцю буйных фармацэўтычных карпарацый – «Санафі-Груп», «Сандоз», «Пфайзер» і інш. Хутка павялічваецца вытворчасць вітамінаў: за апошнія 5 гадоў – больш чым у 20 разоў. Экспарт лекаў з Польшчы ў апошнія гады складае аб'ём агульным коштам каля 1,5 млрд. еўра.

### *Лёгкая прамысловасць і дрэваапрацоўка*

*Лёгкая прамысловасць* Польшчы адносіцца да тых галін прамысловасці, якія ці не ў найбольшай ступені пацярпелі ў апошнія 20–25 гадоў. У першую чаргу гэта датычыцца *тэкстыльнай прамысловасці* і яе галоўнага цэнтра – Лодзі. Пачына-

ючы з 2000 г., аб'ём вытворчасці сінтэтычных тканін скараціўся ў 2 разы, баваўняных – у 14, ільняных – у 10 разоў. У лепшым стане знаходзіцца вытворчасць *адзення і абутку*, якая збольшага захавала ранейшыя аб'ёмы. Нягледзячы на вельмі жорсткія ўмовы канкурэнцыі з таннай прадукцыяй з Кітая, Турцыі і іншых краін, польскія вытворцы здолелі стварыць уласныя брэнды адзення і выйсці на замежны рынак. Вытворчасць адзення і абутку размешчана пераважна ў буйных гарадах – Кракаве, Уроцлаве, Лодзі, Познані і Варшаве.

*Дрэваапрацоўка* ў Польшчы і сёння адносіцца да ліку галін прамысловасці, якія знаходзяцца на ўздыме. Асноўнай прадукцыяй дрэваапрацоўкі з'яўляецца мэбля і будаўнічыя матэрыялы: падлогі, вокны, дзверы і г. д. У апошнія 15 гадоў выпуск асобных відаў прадукцыі павялічыўся ў 3–6 разоў.

## Падсумаванне

- Аснову энергетыкі Польшчы складаюць цеплавыя электрастанцыі, якія працуюць на каменным і бурым вугалі.
- Аб'ёмы вытворчасці ў чорнай металургіі значна скараціліся ў апошнія гады.
- Аўтамабілебудаванне ў Польшчы адносіцца да ліку найбольш развітых галін прамысловасці і эканомікі.
- Польшча знаходзіцца сярод найбуйнейшых вытворцаў тэлевізараў у Еўропе.
- Суднабудаванне і тэкстыльная прамысловасць у найбольшай ступені пацярпелі ў перыяд 2000–2015 гг.

## Заданні

- Якія тыпы электрастанцый пераважаюць у Польшчы?
- З чым звязанае скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці ў чорнай металургіі?
- Якую прадукцыю стварае каляровая металургія Польшчы?
- Дзе знаходзяцца цэнтры транспартнага машынабудавання Польшчы?
- Пералічыце асноўныя напрамкі развіцця хімічнай прамысловасці Польшчы.

## 4.3. Сфера паслуг

*Агульная характарыстыка развіцця сферы паслуг у Польшчы. Транспартная сістэма. Чыгуначны і аўтамабільны транспарт. Рачны і марскі транспарт. Авіяцыйны транспарт. Трубаправодны транспарт. Турызм. Галоўныя турыстычныя дэстынацыі. Аб'екты сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў Польшчы. Сістэма адукацыі ў Польшчы. Сярэдняя і вышэйшая адукацыя.*

***Агульная характарыстыка развіцця сферы паслуг у Польшчы***

Сфера паслуг у Польшчы – найбольшы сектар эканомікі паводле колькасці занятых (64 %) і паводле долі ў ВУП краіны (55,6 %). Існуюць розныя падыходы да вызначэння сферы паслуг. Самы просты спосаб: сфера паслуг – гэта тое што не адносіцца да прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Але нават пры такім гранічна шырокім падыходзе не заўсёды проста вызначыць тыя ці іншыя межы, бо вельмі часта прадпрымальнік можа адначасова займацца і прамысловай вытворчасцю, і сферай паслуг. Напрыклад, найбуйнейшы ў Польшчы канцэрн «Орлен» займаецца нафтаперапрацоўкай і адначасова мае сетку аўтазаправак.

Еўрапейская класіфікацыя формаў эканамічнай актыўнасці, прынятая сёння ў Польшчы, заснаваная на ўліку адрозненняў паміж адрасатамі паслуг. У сувязі з гэтым вылучаюць паслугі агульнасацыяльныя, арыентаваныя на спажыўцоў і арыентаваныя на вытворцаў тавараў і паслуг.

Да *агульнасацыяльных паслуг* адносяцца дзейнасць дзяржаўнай адміністрацыі, органаў аховы парадку і знешняй абароны, недзяржаўных некамерцыйных арганізацый (так званы «Трэці сектар»).

*Паслугі, арыентаваныя на спажыўцоў*, уключаюць умоўна «матэрыяльныя»: сферу гандлю і рамонту, пасажырскі транспарт, сувязь, камунальныя паслугі, турыстычныя і гастранамічныя паслугі, а таксама ўмоўна «нематэрыяльныя»: адукацыйныя, медыцынскія, рэкрэацыйныя.

Да *паслуг, арыентаваных на вытворцаў*, адносяць фінансавую (банкаўскую) сферу, транспарт і лагістыку, навуковыя даследаванні, развіццё новых тэхналогій і г. д.

### *Транспарт*

Адной з найбуйнейшых частак сферы паслуг з’яўляецца транспарт, які абслугоўвае і вытворцаў, і спажыўцоў. Ён уключае чыгуначны, аўтамабільны, водны, паветраны і трубаправодны транспарт. Складовымі часткамі транспартнай сістэмы з’яўляюцца шляхі зносін, транспартныя сродкі, сістэма абслугоўвання.

*Чыгунка.* Стварэнне чыгуначнага транспарту адносіцца да першай паловы XIX ст. У 1842 г. пачала дзейнічаць чыгунка з Уроцлава да Алавы. Большая частка сённяшняй сеткі чыгункі была пабудаваная да 1918 г. Найбольш шчыльная сетка склалася ў паўднёва-заходняй і цэнтральнай частках Польшчы, найменшая – на паўночным усходзе. Сярэдняя шчыльнасць сеткі чыгункі ў Польшчы складае 6,3 км/100 км$^2$, у Шлёнскім ваяводстве – 17,7 км/100 км$^2$, у Падляшскім – 3,9 км/100 км$^2$. Агульная працягласць чыгункі складае 20,1 тыс. км., у тым ліку электрыфікаванай – 11,9 тыс. км. Агульная працягласць скарацілася ў апошнія гады прыкладна на 2 тыс. км, у сувязі з ліквідацыяй нерэнтабельнай, у першую чаргу вузкакалейнай, чыгункі. Сёння ў Польшчы ствараецца лінія высокахуткаснай чыгункі для злучэння Варшавы, Лодзі, Познані і Уроцлава, на якой цягнікі змогуць развіваць хуткасць да 350 км/г.




*Хуткасны цягнік у Ніжнім Шлёнску.*

*Аўтамабільны транспарт.* Пераважная большасць грузаў, да 85 %, у Польшчы перавозіцца аўтамабільным транспартам. Польшча мае дастаткова вялікую сетку аўтадарог з цвёрдым пакрыццём – усяго каля 290 тыс. км. Шчыльнасць аўтадарог складае 82,8 км/100 км$^2$. У апошнія дзесяцігоддзі будуюцца хуткасныя магістралі, якія злучаюць Варшаву з Берлінам, Гданьск з Лоддзю, Уроцлаў, Катавіцы, Кракаў і Жэшуў. Аднак сетка хуткасных магістраляў далёка не адпавядае патрэбам транспартнай сферы. Яны складаюць менш за 1 % усіх дарог. Пераважная большасць аўтадарог мае невялікую прапускную здольнасць, яны пракладзеныя праз вёскі і цэнтры невялікіх гарадоў, таму сярэдняя хуткасць перамяшчэння не перавышае 30–40 км/г. Ездзіць па іх нярэдка азначае сапраўдныя пакуты для кіроўцаў і пасажыраў. У 2013 г. парк грузавых аўтамабіляў складаў каля 3 млн., легкавых – 19 млн., аўтобусаў – 100 тыс.

*Рачны і марскі транспарт.* Агульная працягласць *рачных транспартных шляхоў* у Польшчы складае 3660 км. Найбольшае транспартнае значэнне мае рака Одра, якая з дапамагаю Гліўіцкага канала мае злучэнне з Верхняшлёнскім вугальным басейнам. Гэты шлях выкарыстоўваецца для дастаўкі вугалю ў марскія парты.




*Марскі порт у Шчэціне.*

Меншае значэнне маюць Вісла і Варта. Навігацыя па Вісле паміж Варшавай і Кракавам мае збольшага турыстычны характар. Па рачных шляхах перавозіцца менш за 1 % усіх грузаў. Гэта абумоўлена параўнальна нізкай хуткасцю транспартавання, недастатковай разгалінаванасцю рачной транспартнай сеткі.

*Марскі транспарт* забяспечвае значную частку замежных перавозак. У Польшчы ёсць чатыры вялікія гандлёвыя парты: Гданьск, Гдыня, Шчэцін і Свінауйсьце. Апроч грузавых перавозак, яны ажыццяўляюць паромнае злучэнне з партамі ў Даніі і Швецыі. Самы вялікі з польскіх партоў – Гданьскі. Праз яго вядзецца перавалка нафты, вугалю, серы і збожжа. Порт у Гдыні мае абсталяванне для прыёму кантэйнераў. Парты ў Шчэціне і Свінауйсьці забяспечваюць перавалку жалезнай руды, вугалю, прадукцыі хімічнай прамысловасці. Польскі гандлёвы флот складаецца з 2 танкераў, 53 сухагрузаў і 4 марскіх паромаў. Амаль усе судны гандлёвага флоту выкарыстоўваюць так званыя «танныя сцягі» Кіпра, Мальты, Ліберыі, Вануату і г. д., каб паменшыць падатковыя выдаткі. Агульны аб'ём грузавых перавозак складае звыш 21 млн. т штогод.

*Авіяцыйны транспарт*. Гэты від транспарту выкарыстоўваецца галоўным чынам для міжнародных пасажырскіх перавозак. Польшча мае больш за 10 міжнародных аэрапортаў, найбуйнейшыя



*Аэрапорт імя Фрэдэрыка Шапена ў Акенці (Варшава).*

з якіх знаходзяцца ў Кракаве (4,2 млн. пасажыраў у год), Гданьску (3,7 млн.), Катавіцах (3 млн.). Галоўны авіяцыйны порт краіны імя Фрэдэрыка Шапена ў Акеньці (Варшава) абслугоўвае 11 млн. пасажыраў у год. Гэта – каля 45 % усіх пасажыраў міжнародных авіяліній. Авіяцыйны транспарт звязвае Польшчу з 34 краінамі. Самыя доўгія пералёты звязваюць Варшаву з Чыкага (7600 км), Нью Йоркам і Таронта (6900 км). Аб'ёмы авіяцыйных перавозак пастаянна павялічваюцца ў тым ліку і з дапамогай нізкатарыфных авіяцыйных кампаній – так званых «лаўкостэраў».

*Трубаправодны транспарт.* Аснову трубаправоднага транспарту Польшчы складаюць транзітныя сістэмы. Гэта – магістральныя газаправод «Ямал – Еўропа» і нафтаправод «Пшыязьнь», якія пастаўляюць сыравіну з Расіі ў Польшчу ды іншыя еўрапейскія краіны. Апроч гэтага, пабудаваны нафтаправод паміж Гданьскам і Плоцкам. Сетка газаправодаў для ўнутранага карыстання мае агульную працягласць 15 тыс. км. У Верхнім Шлёнску працуе лакальная сетка трубаправодаў для падачы коксавага газу.

***Турызм***

Турызм адносіцца да адной з найбольш прыбытковых галін сферы паслуг і эканомікі ў цэлым. Турыстычная індустрыя стварае вялікую колькасць працоўных месцаў, спрыяе развіццю гатэльнага сэрвісу, гастранамічнай індустрыі, забяспечвае працай транспартныя сеткі. Паводле ступені прыбытковасці турызм нярэдка параўноўваюць з аўтамабільнай вытворчасцю. Разам з тым, турыстычная сфера мае і шэраг недахопаў. Ці не на першым месцы сярод іх – сезоннасць, абмежаваная некалькімі месяцамі ў годзе.

*Галоўныя турыстычныя дэстынацыі.* Польшча валодае вялікімі турыстычнымі рэсурсамі: прыроднымі ландшафтамі, помнікамі гісторыі і культуры, лячэбна-рэкрэацыйнымі цэнтрамі. Прасторы, якія маюць прыцягальнасць для турыстаў і забяспечаныя неабходнай інфраструктурай (экскурсійныя маршруты, гатэлі, аб'екты харчавання, транспарт), называюць турыстычнымі дэстынацыямі.

Звычайна інтарэс турыстаў выклікаюць незвычайныя прыродныя ландшафты, з адносна невялікім узроўнем урбанізацыі і забруджвання асяроддзя. Сярод такога роду дэстынацый най-

*Пляж у Сопаце на балтыйскім узбярэжжы.*



большай папулярнасцю ў Польшчы карыстаюцца ўзбярэжжа Балтыйскага мора, Мазурскае паазер'е, рэгіён узвышшаў, Карпаты, Татры і Судэты.

Узбярэжжа Балтыйскага мора – адна з найбольш папулярных турыстычных дэстынацый Польшчы. Гэтаму спрыяе наяўнасць вялікай колькасці пясчаных пляжаў, дастаткова развітая інфраструктура. Разам з тым, развіццё турызму тут сутыкаецца з шэрагам праблем. Турыстычны сезон вельмі кароткі: 1,5–2 летнія месяцы. Але падчас яго далёка не заўсёды надвор'е спрыяе пляжнаму адпачынку. Марская вада рэдка праграецца да камфортнай тэмпературы. Стварае праблемы і яе забруджванне. Тут яшчэ не шмат пляжаў, якія адпавядаюць міжнародным стандартам чысціні.

Мазурскае паазер'е прыцягвае турыстаў прыгажосцю краявідаў, экалагічнай чысцінёй, магчымасцямі актыўнага адпачынку. Дадатковую цікавасць маюць сярэднявечныя крыжацкія замкі. Турыстычнымі цэнтрамі з'яўляюцца Мікалайкі, Аўгустоў, Мрангова, Аструда. Падобна як і на ўзбярэжжы, турыстычны сезон вельмі кароткі.

У рэгіёне ўзвышшаў турыстычнымі дэстынацыямі з'яўляюцца Любельшчына (Люблінскі край) з Расточам і Свентакшыжскія горы. Расточа вядомае сваімі ляснымі рэчкамі з невялікім вадаспадамі, якія называюць *шумамі,* ці *шэпотамі*, а Любельшчы-

Набярэжная ў Мікалайках у Мазурскім паазер'і.



на – адной з самых шчыльных сетак маляўнічых цяснін і краявідамі Віслы. Свентакшыжскія горы прыцягваюць незвычайным ландшафтам, пячорамі, яловымі лясамі, унікальнымі дубамі (дуб Бартэк мае акружнасць 985 см) помнікамі архітэктуры, напрыклад, замкам у Хэнцінах, і помнікамі індустрыі пачатку XIX ст. (рэшткі металургічнага завода ў Самсонаве). Асаблівасцю рэгіёна з'яўляецца тое, што ў якасці турыстычнай дэстынацыі ён можа працаваць круглы год. Аднак турыстычная інфраструктура тут яшчэ не вельмі добра развітая.



У Татрах паблізу Закапанэ.

Карпаты і іх найвышэйшая частка Татры – бадай што, самы папулярны турыстычны рэгіён у Польшчы. Ён цікавы для аматараў актыўнага адпачынку, у першую чаргу для тых, каго прывабліваюць зімовыя віды спорту. Невыпадкова турыстычны цэнтр Татраў, Закапанэ, называюць «зімовай сталіцай

Польшчы». Турыстычны сезон тут доўжыцца круглы год. Інфраструктура добра развітая, але ў перыяды пікавых нагрузак, напрыклад, падчас Калядных вакацый, яе магутнасці не хапае, каб цалкам задаволіць попыт.

***Аб'екты сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў Польшчы***

Апроч прыродных ландшафтаў, цікавасць турыстаў у Польшчы прыцягваюць шматлікія помнікі гісторыі і архітэктуры. Некаторыя з іх уключаныя ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта – архітэктурныя комплексы забудовы цэнтраў Кракава, Варшавы, Торуні і Замасці; помнікі культавай архітэктуры эпохі барока ў Кальварыі Зэбржыдоўскай (Малапольскае ваяводства), унікальныя касцёлы, пабудаваныя ў тэхналогіі фахверку, вядомага ў Беларусі як «прускі мур» ў Яваражы і Сьвідніцы (Ніжняшлёнскае ваяводства), драўляная культавая архітэктуры карпацкага рэгіёна. У Спіс ЮНЕСКА таксама ўнесеныя такія асобныя ўнікальныя пабудовы, як замак крыжакоў у Мальбарку, зала стагоддзя ва Уроцлаве. Сярод гістарычных помнікаў спісу – канцэнтрацыйны лагер Асвенцім, саляная шахта ў Вялічцы пад Кракавам. Большая частка помнікаў, унесеных у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, знаходзіцца на тэрыторыі паўднёвай Польшчы. Трэба падкрэсліць,



*Былы замак крыжакоў у Мальбарку.*



*Яснагурскі кляштар у Чанстахове.*

што ў яго ўнесена яшчэ далёка не ўсё. Не меншую каштоўнасць маюць гістарычныя цэнтры Гданьска і Уроцлава, архітэктурны комплекс Казімежа Дольнага, археалагічныя помнікі Біскупіна і Кшэмёнкі Апатоўскай, касцёлы Гнезна, Фромбарка, Чанстаховы.

Значным турыстычным рэсурсам з'яўляюцца шматлікія курорты, звязаныя з крыніцамі лячэбных мінеральных водаў. Пераважная іх большасць знаходзіцца ў паўднёвай Польшчы, у адгор'ях Кар-



*Стары горад у Гданьску.*

пат (Мушына, Рыманаў, Крыніца-Здруй) і Судэтаў (Цяпліцы-Здруй, Душнікі-Здруй, Паляніца-Здруй).

***Адукацыя***

Да сферы паслуг у сучасным разуменні належыць і адукацыя. У пачатковай і сярэдняй школе працуе каля 497 тыс. настаўнікаў. Сістэма школьнай адукацыі адрозніваецца ад беларускай. У Польшчы дашкольная адукацыя з'яўляецца абавязковай, яна ахоплівае дзетак 5-ці і 6-гадовага ўзросту. Пачатковая школа разлічаная на 6 гадоў навучання. Звычайна ў яе трапляюць дзеці 7-гадовага ўзросту. Пачатковая школа падзяляецца на дзве роўныя ступені. На першай няма падзелу на асобныя прадметы, заняткі вядзе адзін настаўнік. На другой ступені кожны прадмет выкладае асобны спецыяліст. Наступны ўзровень агульнай адукацыі – гімназічны, разлічаны на 3 гады. Па заканчэнні яго вучні здаюць гімназічныя іспыты. Пасля гэтага ёсць магчымасць выбару формы завяршэння сярэдняй адукацыі. Сярод іх – трохгадовыя агульнаадукацыйныя і профільныя ліцэі, прафесійна-тэхнічныя вучэльні, тэхнікумы і г. д. Сярэдняя адукацыя завяршаецца здачай выніковых іспытаў, так званай «матуры». Польшча адрозніваецца высокім узроўнем школьнай адукацыі: у гэтай сферы яна знаходзіцца на 5-м месцы ў Еўропе і 10-м – у свеце.

Сістэма вышэйшай адукацыі ўключае ў сябе каля 100 каледжаў і 460 вышэйшых навучальных устаноў, большая частка з якіх з'яўляюцца прыватнымі (71 %).

Навучанне ў каледжах цягнецца тры гады. Большасць з іх рыхтуе настаўнікаў пачатковых школ, настаўнікаў замежных моў і сацыяльных працаўнікоў. Практычна ўсе каледжы з'яўляюцца дзяржаўнымі. У 2013 г. у Польшчы вучылася каля 1,9 млн. студэнтаў. Сістэма вышэйшай адукацыі, згодна з прынцыпамі Балонскага працэсу, мае тры ўзроўні. Першы ўзровень, адпаведны бакалаўрыяту, прадугледжвае навучанне на працягу трох гадоў. Выпускнікі атрымліваюць дыплом ліцэнцыята ці інжынера. На другім узроўні, у магістратуры, навучанне разлічанае на два гады. Шмат якія ВНУ прапаноўваюць адразу інтэграваныя пяцігадовыя праграмы, якія дазваляюць атрымаць дыплом магістра. Трэці ўзровень – дакта-



*Гістарычны корпус Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве.*

рантура, разлічаны на 3–5 гадоў, дае магчымасць атрымаць вышэйшую ступень доктара навук. Да ліку лепшых у Польшчы адносіцца Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве, універсітэты ў Варшаве, Познані, Уроцлаве, тэхналагічныя ўніверсітэты Варшавы і Уроцлава, медыцынскія ўніверсітэты Гданьска і Варшавы.

## Падсумаванне

- Сфера паслуг у Польшчы мае найбольшую колькасць занятых і стварае большую частку ВУП краіны.
- Сфера паслуг мае складаную структуру і ўключае ў сябе формы эканамічнай актыўнасці, якія не маюць непасрэднага дачынення да прамысловасці і сельскай гаспадаркі.
- Галоўную ролю ў транспартнай сістэме Польшчы адыгрывае аўтамабільны транспарт.
- Польшча валодае значнымі турыстычнымі рэсурсамі, сярод якіх найбольшае значэнне маюць прыродныя ландшафты і культурная спадчына.
- Сістэма польскай вышэйшай адукацыі адпавядае прынцыпам Балонскага працэсу.

## Заданні

- Зрабіце табліцу структуры сферы паслуг у Польшчы.
- Чаму галоўную ролю ў транспартнай сістэме Польшчы адыгрывае аўтамабільны транспарт?
- Знайдзіце на мапе галоўныя марскія парты Польшчы. Чым вызначаецца іх спецыялізацыя?
- Якія дэстынацыі Польшчы прыцягваюць большасць турыстаў? З чым гэта звязана?
- Зрабіце табліцу ўзроўняў сістэмы адукацыі ў Польшчы, ад дашкольнай да дактарантуры.

## 4.4.Сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць

*Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі. Прыродныя і пазапрыродныя фактары развіцця сельская гаспадаркі. Раслінаводства. Вырошчванне збожжавых, бульбы, цукровых буракоў, садавіны і гародніны. Жывёлагадоўля. Мяса-малочная жывёлагадоўля. Свінагадоўля. Птушкагадоўля. Гадоўля авечак і коней. Харчовая прамысловасць.*

### *Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі*

Сельская гаспадарка Польшчы стварае 9 % экспарту і 3,4 % валавога ўнутранага прадукту. У ёй занята 12 % эканамічна актыўнага насельніцтва. Польшча займае вядучыя месцы ў сусветнай вытворчасці мяса, малака, яблыкаў. У сельскагападарчай вытворчасці знаходзіцца больш як палова (51,7 %) паверхні краіны, або 16,2 млн. га. Паводле іх агульнай плошчы Польшча займае 3-е месца ў Еўрасаюзе пасля Францыі і Іспаніі. Гэта прыкладна каля 20 % усёй сельскагаспадарчай зямлі ў Еўрапейскім Саюзе.

На развіццё сельскай гаспадаркі ўплываюць прыродныя і сацыяльныя чыннікі.

З пункту погляду *прыродных фактараў* Польшча мае добрыя ўмовы для вядзення сельскай гаспадаркі. Сярод іх ці не найбольшае значэнне мае працяглы вегетатыўны перыяд (180–230 дзён) і дастатковая сярэдняя колькасць ападкаў (600 мм на год). До-

брыя ўмовы стварае і тыповы для Польшчы раўнінны рэльеф. Да негатыўных фактараў трэба аднесці, перш за ўсё, параўнальна нізкую ўрадлівасць большасці глебаў, высокі ўзровень паверхневых водаў у Падляшшы, Люблінскім Палессі і недахоп вільгаці ў цэнтральнай частцы ў летні перыяд.

*Сацыяльныя фактары* маюць большае значэнне, чым прыродныя. Сярод іх галоўную ролю адыгрывае структура землеўладання. Характэрная асаблівасць Польшчы – малы сярэдні памер сялянскіх гаспадарак, які складае 8,44 га. У краінах Еўрасаюза ён значна большы – каля 18 га. Гаспадаркі памерам больш за 15 га складаюць у Польшчы толькі 32 %. Малыя памеры сялянскіх гаспадарак абмяжоўваюць выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі: у сярэднім на 10 га прыходзіцца адзін трактар, камбайны ёсць у гаспадарках, у якіх больш за 50 га зямлі. У сувязі з гэтым, таварны характар мае толькі палова сялянскіх гаспадарак, астатнія – натуральны, гэта значыць, арыентаваныя толькі на свае ўласныя патрэбы. Значным сацыяльным фактарам апошніх гадоў стала аграрная палітыка Еўрасаюза, да якога Польшча далучылася ў 2004 г. Палітыка ЕС прадугледжвае фінансавую падтрымку з мэтай паляпшэння эфектыўнасці і якасці сельскай гаспадаркі. Адначасова з 2004 г. для Польшчы адкрыліся рынкі краін Заходняй Еўропы, што істотна паскорыла развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці.

***Раслінаводства***

Раслінаводства – вядучая галіна сельскай гаспадаркі Польшчы. Найбольшая частка зямлі (74 %) прызначаная для вырошчвання збожжавых: *пшаніцы*, *жыта*, *ячменю*, *кукурузы*. Пшаніца – самая пашыраная збожжавая культура. Яна займае 26,5 % усіх земляў. Яна патрабуе добрых глебавых умоў. Таму яе вырошчваюць пераважна на Шлёнскай нізіне, Малапольскім і Люблінскім узвышшах, Заходнім Памор'і, у даліне Віслы і Жулавах Вісляных. Штогадовы збор ураджаю пшаніцы складае каля 16 млн. т. На другім месцы знаходзіцца жыта (16,2 % зямлі). Гэта культура менш патрабавальная да глебавых і кліматычных умоў. Яе вырошчваюць у цэнтральнай і ўсходняй частцы краіны. Штогод збіраюць каля 2 млн. т жыта. Гэта – каля 20 % яго сусветнага ўраджаю. Прыкладна падобныя

*Поле пшаніцы.*



плошчы (15,5 %) займае *трыцікале* – гібрыд пшаніцы і жыта. Сярод іншых збожжавых найбольшае значэнне мае ячмень (14 %) і авёс (6 %).

Асаблівае месца ў структуры раслінаводства займае *бульба*. Яна не вельмі патрабавальная да якасці глебы. Пасевы бульбы складаюць да 5 % усёй сельскагаспадарчай зямлі. Бульбу вырошчваюць на ўсёй тэрыторыі, але больш за ўсё ў цэнтральнай, усходняй і паўднёва-ўсходняй Польшчы. Агульны збор ураджаю складае каля 6 млн. т штогод.

Сярод тэхнічных культур найбольшае значэнне маюць *цукровыя буракі*. Яны патрабуюць урадлівых глебаў, высокага ўзроўню агратэхнікі, вялікай колькасці ўгнаенняў. Асноўнымі рэгіёнамі вырошчвання з’яўляюцца Шлёнская нізіна, Люблінскае ўзвышша, Жулавы Вісляныя, Шчэцінскае ўзбярэжжа. Штогод у Польшчы збіраюць каля 7 млн. т цукровых буракоў. Гэта – каля 5 % сусветнага ўраджаю.

Істотнае месца ў раслінаводстве займае вырошчванне *садавіны і ягад*. Сярод садавіны пераважаюць яблыкі (68 %), вішні (15 %) і слівы (9 %). Для яе вырошчвання неабходныя добрыя кліматычныя ўмовы і ўрадлівыя глебы. Асноўнымі рэгіёнамі садоўніцтва з’яўляюцца Новы Сонч і Сандамір.

*Жывёлагадоўля*

Асноўнымі галінамі жывёлагадоўлі Польшчы з’яўляецца гадоўля буйной рагатай жывёлы, свінагадоўля і птушкагадоўля.

Развядзенне *буйной рагатай жывёлы* мае два напрамкі: малочны і малочна-мясны. Малочны пераважае ў паўночна-усходняй частцы краіны. У Падляшскім ваяводстве зафіксаваны найвышэйшы паказчык канцэнтрацыі буйной рагатай жывёлы – 71 галава на 100 га (пры сярэднім 35). У цэнтральнай і паўночнай частках пераважае малочна-мясная спецыялізацыя. Паказчык канцэнтрацыі тут таксама вышэйшы за сярэдні. Агульнае пагалоўе буйной рагатай складае каля 5,7 млн. галоваў. Гэты паказчык стабільны і апошнія гады практычна не мяняецца.

Не меншае значэнне мае *свінагадоўля*. Найбольш развітая яна ў Куяўска-Паморскім і Вялікапольскім ваяводствах. У сярэднім у Польшчы на 100 га прыпадае 112 галоў свіней, у Вялікапольскім ваяводстве – 289. Усяго ў Польшчы налічваецца 18 млн. галоў свіней. Памеры статку таксама ў апошнія гады не мяняюцца.



*Свінагадоўля*

*Птушкагадоўля* ў Польшчы ўключае гадоўлю курэй, качак, індыкоў, гусей. Найбольшае значэнне мае гадоўля курэй. Іх пагалоўе складае каля 46 млн. Паводле аб’ёму прадукцыі птушкагадоўлі Польшча займае 9 месца ў Еўрапейскім Саюзе.

*Гадоўля авечак* мае рэгіянальны характар – пераважна ў Карпацкім рэгіёне. Іх пагалоўе складае каля 500 тыс. галоў і паступова скарачаецца. *Гадоўля коней* захоўвае свае значэнне ў сувязі з вялікай колькасцю малых гаспадарак. Больш за ўсё іх у Падляшшы, Падкарпацці, Малапольшчы і Мазоўшы.

*Харчовая прамысловасць*

Харчовая прамысловасць цесна звязаная з сельскай гаспадаркай і адыгрывае істотную ролю ў эканамічным жыцці Польшчы. У ёй працуе каля 290 тыс. чалавек, экспарт прадуктаў харчавання складае да 12 млрд. еўра ў год. Найбуйнейшымі пакупнікамі польскай прадукцыі з'яўляюцца Германія, Вялікабрытанія, Чэхія і Францыя. Галоўныя напрамнкі харчовай прамысловасці – мясаперапрацоўка, малочная вытворчасць, вытворчасць цукру, вытворчасць сокаў з садавіны і замарожанай гародніны. Аб'ем вытворчасці ўвесь час павялічваецца. У 2015 г. у Польшчы было выраблена 1,2 млн. т свініны, 0,2 млн. т ялавічыны, 2,8 млн. кураціны, 0,6 млн. т замарожанай гародніны, 1,0 млн. т сокаў, 190 тыс. т масла.

## Падсумаванне

- Сельская гаспадарка адыгрывае істотную ролю ў эканоміцы Польшчы.
- Галоўнай праблемай польскай сельскай гаспадаркі з'яўляецца невялікі сярэдні памер сялянскіх надзелаў.
- Асноўнымі культурамі раслінаводства з'яўляецца пшаніца, бульба і цукровыя буракі.
- Жывёлагадоўля спецыялізуецца на гадоўлі буйной рагатай жывёлы, свіна- і птушкагадоўлі.
- Прадукцыя харчовай прамысловасці займае істотнае месца ў польскім экспарце.

## Заданні

- Пералічыце прыродныя і сацыяльныя фактары развіцця сельскай гаспадаркі ў Польшчы. • Якія з іх маюць найбольшае значэнне?
- Вызначце асноўныя рэгіёны вырошчвання пшаніцы ў Польшчы. Якія фактары садзейнічаюць гэтай рэгіянальнай асаблівасці?
- З чым звязаная спецыялізацыя Падляшша на малочнай жывёлагадоўлі?
- Якія тэндэнцыі характэрныя для развіцця польскай харчовай прамысловасці?

## 4.5. Экалагічныя праблемы і ахова асяроддзя

*Агульная характарыстыка становішча прыроднага асяроддзя. Забруджванне паветра. Кіслотныя дажджы і іх наступствы. Забруджванне водаў. Праблема дэградацыі глебы. Формы аховы асяроддзя. Сістэма нацыянальных паркаў. Прыродныя рэзерваты. Ландшафтныя паркі. Відавыя і індывідуальныя формы аховы.*

***Агульная характарыстыка становішча прыроднага асяроддзя***

Польшча, як кожная сучасная краіна, непазбежна сутыкаецца з экалагічнымі праблемамі. Характэрнай асаблівасцю яе з'яўляецца тое, што негатыўны ўплыў гаспадарчай дзейнасці на прыроднае асяроддзе мае дакладна выяўлены рэгіянальны характар. Сярод галоўных экалагічных праблем на першым месцы – забруджванне паветра і вады выкідамі прамысловых прадпрыемстваў і транспарту, утылізацыя смецця.

Найбольшую пагрозу асяроддзю нясуць энергетыка, вуглездабыча, хімічная вытворчасць. Пры гэтым галоўнай прычынай забруджвання паветра лічыцца характар энергетыкі Польшчы, заснаванай на спальванні каменнага і бурага вугалю. Бэлхатаўская цеплавая электрастанцыя не толькі самая вялікая ў Еўропе, але лічыцца забруджвальнікам паветра нумар 1 сярод еўрапейскіх энергетычных прадпрыемстваў. Штогод яна выкідае ў паветра 30,6 млн. т вуглякіслага газу. Вядома, што менавіта выкіды гэтага газу з'яўляюцца асноўнай прычынай глабальнага пацяплення. Апроч гэтага, прамысловыя выкіды ў атмасферу змяшчаюць вокіслы азоту і серы, якія надзвычай небяспечныя, бо пры спалучэнні з парамі вады яны ўтвараюць кіслотныя дажджы. Яны ў першую чаргу ўплываюць на вадаёмы: азёры, вадасховішчы, затокі, у якіх, у сувязі з падвышэннем узроўню кіслотнасці, гіне спачатку мікрафлора, а потым і фаўна. Падвышэнне кіслотнасці спрыяе таксама канцэнтрацыі ў вадзе таксічных металаў кшталту свінцу, кадмію, ртуці. Кіслотныя дажджы надзвычай негатыўна ўплываюць на лясы, змяншаюць здольнасць раслін да фотасінтэзу, прыводзяць да вымірання асобных відаў раслін. Гэтыя з'явы ў найбольшай ступені характэрныя для прамысловых рэгіёнаў Польшчы – Шлёнска, Малапольшчы. Негатыўны ўплыў маюць таксама

выкіды прамысловасці суседніх краін, найперш Чэхіі і Германіі. Цеплавыя электрастанцыі, металургічныя камбінаты, аўтамабільны транспарт з'яўляюцца крыніцай выкідаў пылу, якія заўважныя і вакол прадпрыемстваў, і ўздоўж буйных транспартных калідораў.



*Лес у выніку ўплыву кіслотнага дажджу.*

Забруджванне вады выклікана яе маштабным выкарыстаннем у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Больш за ўсё яе патрабуе хімічная, папярова-цэлюлозная, паліўна-энергетычная прамысловасць, а таксама – камунальная гаспадарка. У ваду трапляюць фенолы, цяжкія металы, пестыцыды. Для Польшчы найбольшае значэнне мае забруджванне вялікіх рэк і Балтыйскага мора, вада ў якім лічыцца адной з самых пашкоджаных у свеце. Пад пагрозай знаходзяцца і падземныя воды, на якія дрэнна ўплывае нафтаперапрацоўка і сельская гаспадарка. Апроч гэтага, у рэгіёнах здабычы карысных выкапняў назіраецца зніжэнне ўзроўню грунтавых водаў, што прыводзіць да недахопу водных рэсурсаў.

Найбольшую шкоду глебаваму покрыву наносяць эрозія, прамысловыя прадпрыемствы і аўтамабільны транспарт. Лічыцца, што каля 2,7 % паверхні адносіцца да дэградаваных глебаў, у тым ліку 0,5 % – моцна дэградаваных. Пры гэтым частка з іх, асабліва тэрыторыі былых шкодных прамысловых прадпрыемстваў, не падлягае рэкультывацыі ў сённяшніх умовах.

### *Формы аховы асяроддзя*

Існуе некалькі спосабаў аховы асяроддзя. З аднаго боку, неабходна абмяжоўваць шкодны ўплыў на прыроду за кошт выкарыстан-

ня альтэрнатыўных крыніц энергіі, пераходу да экалагічна чыстага транспарту, абмежавання выкідаў прамысловай вытворчасці, пераходу да так званай арганічнай сельскагаспадарчай вытворчасці. З другога боку, эфектыўнымі захадамі з'яўляецца стварэнне спецыяльных ахоўных тэрыторый, на якіх гаспадарчая дзейнасць моцна абмяжоўваецца.

Ахова асяроддзя ў Польшчы мае даўнія традыцыі. Яшчэ ў XI ст. Баляслаў Харобры загадаў стварыць умовы для аховы баброў. У 1423 г. Уладзіслаў Ягайла ўсталяваў абмежаванні на паляванне на тураў, зуброў і ласёў.

На сённяшні дзень розныя формы аховы прыроднага асяроддзя ахопліваюць звыш 29 % тэрыторыі Польшчы. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у Еўрасаюзе.

***Нацыянальныя паркі***

Найбольшае значэнне сярод формаў аховы асяроддзя маюць нацыянальныя паркі, у якіх забараняецца гаспадарчая дзейнасць, што можа прывесці да змен біялагічнай разнастайнасці. Плошча нацыянальнага парку павінна складаць не менш як 1000 га. Усяго ў Польшчы сёння дзейнічаюць 23 нацыянальныя паркі. Пры гэтым *Нацыянальны парк Белавежская пушча* ўключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта – найстарэйшы нацыянальны парк у Польшчы, які быў створаны ў 1932 г. Агульная плошча нацыя-



*Нацыянальны парк Тухольскія Бары*

нальных паркаў складае больш як 317 тыс. га. У іх межах вылучаюцца зоны (каля 20 % паверхні), якія маюць найвышэйшую ступень аховы.

***Прыродныя рэзерваты***

Прыродныя рэзерваты (запаведнікі) звычайна маюць меншую плошчу – у сярэднім каля 120 га – і прызначаныя дзеля аховы некалькіх ці нават аднаго прыроднага кампанента. Усяго ў Польшчы 1441 прыродны рэзерват, якія займаюць да 0,5 % усёй тэрыторыі краіны. Сярод іх вылучаюцца *біясферныя,* якія ахопліваюць пэўныя фрагменты прыроды цалкам, і *спецыялізаваныя*, арыентаваныя на ахову пэўных відаў раслін, жывёл, а таксама ландшафтаў. Не больш за 10 % рэзерватаў прадугледжваюць поўную ахову асяроддзя. Большасць з іх мае адкрыты доступ для турыстаў. Самы вялікі прыродны рэзерват – *Надгапланскі Парк Тысячагоддзя*, які мае плошчу 12 тыс. га.



*Прыродны рэзерват Пшондкі.*

***Ландшафтныя паркі і зоны аховы ландшафту***

Значную прастору маюць ландшафтныя паркі (8 % тэрыторыі) і зоны аховы ландшафту (22 %). На гэтай прасторы гаспадарчая дзейнасць не забараняецца, але яна не павінна прыводзіць да

*Ландшафтны парк на Сувалшчыне.*



істотных змен і дэградацыі асяроддзя. Усяго ў Польшчы 120 ландшафтных паркаў і 445 зон аховы ландшафту. Самы вялікі ландшафтны парк у Польшчы – *Даліна Барычы* на мяжы Ніжняшлёнскага і Вялікапольскага ваяводстваў – мае плошчу 70 тыс. га. У яго склад уваходзіць некалькі прыродных рэзерватаў.

***Відавая і індывідуальная ахова прыродных аб'ектаў***

Апроч вышэйзгаданага, існуе відавая і індывідуальная ахова прыродных аб'ектаў. Да першай адносіцца ахова асобных відаў раслін і жывёл. Пад такой аховай знаходзіцца каля 3 тыс. відаў раслін і 418 – жывёл, у тым ліку пад строгай аховай – 448 і 140, адпаведна. Ахова раслін азначае забарону збору, жывёл – забарону палявання на іх і выціскання з прыродных арэалаў існавання.

Індывідуальная ахова арыентаваная на такія помнікі прыроды, як асобныя дрэвы ці групы дрэў, валуны, пячоры, вадаспады, цясніны. Існуе некалькі варыянтаў індывідуальнай аховы. Сярод іх – статус *зафіксаванага аб'екту*, які даецца мясцінам, каштоўным з пункту гледжання навуковага ці адукацыйнага. Гэта могуць быць пячоры, геалагічныя разрэзы, былыя месцы здабычы карысных выкапняў і г. д. Другі варыянт – *прыродна-ландшафтныя групы*. Звычайна гэта – фрагменты прыроды, якія маюць асаблівыя эстэтычныя якасці. Трэці, самы масавы, складаюць экалагічныя



*Цясніна Кажэнёвы Дул у Люблінскім ваяводстве.*

аб’екты – фрагменты асяроддзя, такія як вадаёмы, групы дрэў і кустоў, балоты, тарфянікі, выдмы, прыродныя аб’екты, месцы пражывання рэдкіх відаў жывёл і г. д.

## Падсумаванне

- Асноўнымі крыніцамі забруджвання асяроддзя ў Польшчы з’яўляюцца прамысловыя прадпрыемствы, аўтамабільны транспарт, сельская і камунальная гаспадарка.
- Найбольшую шкоду асяроддзю прычыняюць выкіды газаў і пылу, кіслотныя дажджы.
- У Польшчы існуе разгалінаваная структура ахоўных тэрыторый, якая ўздзейнічае на ⅓ частку тэрыторыі краіны.

## Заданні

- Што з’яўляецца найбольш сур’ёзнай прычынай забруджвання прыроднага асяроддзя ў Польшчы?
- Якія тэрыторыі ў найбольшай ступені адчуваюць негатыўны антрапагенны ўплыў?
- Чым адрозніваюцца нацыянальныя і ландшафтныя паркі?
- Якім чынам ажыццяўляецца відавая і індывідуальная ахова прыроды ў Польшчы?

# Замест пасляслоўя

Паважаны чытач!

Гэтая кніжка –толькі кароткія ўводзіны ў кантэкст геаграфічнай праблематыкі Польшчы. Геаграфія – навука энцыклапедычная ў сваёй аснове. Вывучаць яе можна бясконца. Крыніцы ў інтэрнэце дазволяць кожнаму пашырыць свае веды пра Польшчу па любым раздзеле геаграфіі.

Я ж дазволю сабе тут зрабіць пару апошніх падсумаванняў.

Польшча – не толькі суседняя, блізкая нам краіна, але і шмат у чым падобная на Беларусь. Ёсць падабенства ў лёсе краіны, лагодных краявідах, помніках старажытнасці, народных строях, дый шмат у чым яшчэ.

Разам з тым, Польшча іншая. Уражвае маштаб таго, што было зроблена ў эканамічным развіцці за апошнюю чвэрць стагоддзя. Перамены былі не простыя, часам балючыя. Шмат праблем яшчэ не вырашана. Але яны вырашальныя. Гэта добры прыклад для ўсіх нас.

*Павел Церашковіч*

# Выкарыстаная і рэкамендаваная літаратура


1. *Беларуская энцыклапедыя. Т. 12. Мн.: БелЭн, 2001.*
2. *Геаграфія ў тэрмінах і паняццях*: Энцыкл. даведнік / Рэдкал.: М. М. Курловіч і інш. – Мн.: Беларус. Энцыкл., 2003. (Энцыкл. бібліятэчка школьніка).
3. *Польска-беларускі тэматычны слоўнік для школьнікаў і студэнтаў = Polsko-białoruski słownik tematyczny dla uczniów i studentów*: больш за 17,5 тысяч слоўнікавых артыкулаў. / Укладальнік Л. Баршчэўскі. – Мн.: Зміцер Колас, 2012.
4. Пацыкайлік Д. А., Сасноўскі В. М. *Методыка геаграфічных даследаванняў*. – Мн.: БДПУ, 2008.
5. Степанюга Н. А., Андриевская З. Я. *Социально-экономическая география зарубежных стран*. – Мн.: Вышэйшая школа, 2008.
6. Bański, J. *Geografia rolnictwa Polski*. – Warszawa: PWE, 2007.
7. Baraniecki, L., Skrzypczak, W. *Geografia fizyczna* (*ogólna i Polski*). Podręcznik dla liceów ogólnokształcących, liceów profilowanych i techników. Zakres podstawowy i rozszerzony. – Warszawa: Efekt, 2003.
8. Chrabelski, M., Dudaczyk, M. *Geografia dla gimnazjum*. – Gdynia: Operon, 2010.
9. Figa, M. *Repetytorium gimnazjalisty. Geografia*. – Krakow: GREG, 2016.
10. Flis, J. *Słownik szkolny. Terminy geograficzne*. Warszawa: Wydaw. Szk. i Pedag., 1991.
11 Jackowski, A., Liszewski, S., Richling, A. (red. nauk.). *Historia geografii polskiej*. –Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2008.
12. Knaflewska, J. *Księga przyrodniczo-krajoznawcza Polski. Przyroda, geografia. Ilustrowana encyklopedia tematyczna*. – Poznań: Publicat, 2008.
13. Kondracki, J. *Geografia regionalna Polski*. – Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2000.
14. Kucharska, M. J. *Zdasz maturę z geografii. Geografia Polski*. – Łódź: Piątek Trzynastego, 2004.
15. Lijewski, T., Mikułowski, B., Wyrzykowski, J. *Geografia turystyki Polski*. – Warszawa: PWE, 2008.

16. Makos-Makarska, E. *Geografia Polski*. Zbiór zadań maturalnych. Dla liceum ogólnokształcącego, liceum profilowanego i technikum. – Toruń: SOP Oświatowiec, 2008.
17. Mordawski, J., Wiecki, W. Geografia 3. *Geografia Polski*. Przewodnik dla nauczyciela liceum ogólnokształcącego, liceum profilowanego i technikum. Zakres podstawowy. – Gdynia: Operon, 2003.
18. Richling, A., Ostaszewska K. (red. nauk.). *Geografia fizyczna Polski*. Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2005.
19. , H. (red. nauk.). *Geografia społeczno-gospodarcza Polski*. – Warszawa: Wydaw. Nauk. PWN, 2007.
20. Szlajfer, F. *Geografia Polski*. Podręcznik dla gimnazjum. – Warszawa: Nowa Era, 2004.
21. Świtalski, E., Preisner, Z. *Geografia Polski dla liceów ogólnokształcących, liceów profilowanych i techników*. – Toruń: Oficyna Wydaw. Turpress, 2004.
22. Zając, S. *Geografia Polski*. Podręcznik dla gimnazjum. – Warszawa: Wydaw. Szk. i Pedag., 2000.

# ЗМЕСТ

Уступ.................................................................5

1. Уводзіны.................................................................6
    1.1. Геаграфічнае становішча, велічыня тэрыторыі, межы і суседзі.................................................................6
        Падсумаванне.................................................................9
        Заданні.................................................................9
    1.2. Дзяржаўны лад і адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел.................................................................10
        Падсумаванне.................................................................15
        Заданні.................................................................15

2. Прыродныя ўмовы і рэсурсы.................................................................16
    2.1. Рэльеф.................................................................16
        Падсумаванне.................................................................20
        Заданні.................................................................20
    2.2. Старажытная геалагічная гісторыя Польшчы.................................................................21
        Падсумаванне.................................................................24
        Заданні.................................................................24
    2.3. Эпоха зледзянення ў Польшчы і яе вынікі. .................................................................25
        Падсумаванне.................................................................28
        Заданні.................................................................29
    2.4. Горныя пароды і карысныя выкапні.................................................................29
        Падсумаванне.................................................................33
        Заданні.................................................................33
    2.5. Клімат.................................................................34
        Падсумаванне.................................................................38
        Заданні.................................................................38
    2.6. Паверхневыя і падземныя воды.................................................................39
        Падсумаванне.................................................................45
        Заданні.................................................................45
    2.7. Глебавае покрыва.................................................................46
        Падсумаванне.................................................................49
        Заданні.................................................................49

2.8. Раслінны і жывёльны свет ........................................................49
Падсумаванне ........................................................54
Заданні ........................................................54

3. Насельніцтва ........................................................55
3.1. Дынаміка насельніцтва. ........................................................55
Падсумаванне ........................................................58
Заданні ........................................................58
3.2. Полаўзроставая структура насельніцтва. ........................................................59
Падсумаванне ........................................................61
Заданні ........................................................61
3.3. Рассяленне насельніцтва і міграцыі ........................................................62
Падсумаванне ........................................................70
Заданні ........................................................70
3.4. Структура працаўладкавання і беспрацоўе ........................................................71
Падсумаванне ........................................................75
Заданні ........................................................75
3.5. Склад насельніцтва. Палякі. Этнаграфічныя групы палякаў...76
Падсумаванне ........................................................90
Заданні ........................................................90
3.6. Нацыянальныя меншасці і этнічныя меншасці. ........................................................91
Падсумаванне ........................................................98
Заданні ........................................................98

4. Гаспадарка ........................................................99
Агульная характарыстыка гаспадаркі Польшчы ........................................................99
4.1. Здабыча мінеральных рэсурсаў ........................................................99
Падсумаванне ........................................................106
Заданні ........................................................106
4.2. Прамысловасць ........................................................107
Падсумаванне ........................................................115
Заданні ........................................................115
4.3. Сфера паслуг ........................................................116
Падсумаванне ........................................................126
Заданні ........................................................127
4.4.Сельская гаспадарка і харчовая прамысловасць ........................................................127
Падсумаванне ........................................................131
Заданні ........................................................131

4.5. Экалагічныя праблемы і ахова асяроддзя ........ 132
Падсумаванне ........ 137
Заданні ........ 137

Замест пасляслоўя ........ 138
Выкарыстаная і рэкамендаваная літаратура ........ 139